ПАСЛЯСІНАДАЛЬНАЯ АПОСТАЛЬСКАЯ АДГАРТАЦЫЯ

# SACRAMENTUM CARITATIS

СВЯТОГА АЙЦА БЭНЭДЫКТА XVI
ДА БІСКУПАЎ, ДУХАВЕНСТВА,
КАНСЭКРАВАНЫХ АСОБАЎ І СВЕЦКІХ ВЕРНІКАЎ
АБ ЭЎХАРЫСТЫІ,
КРЫНІЦЫ І ВЯРШЫНІ ЖЫЦЦЯ
І МІСІІ КАСЦЁЛА

## ЗМЕСТ

**Уводзіны** [1]
Спажытак праўды [2]
Развіццё эўхарыстычнага абраду [3]
Сінод Біскупаў і Год Эўхарыстыі [4]
Мэта дадзенай адгартацыі [5]

ЧАСТКА ПЕРШАЯ
**ЭЎХАРЫСТЫЯ, ТАЯМНІЦА ВЕРЫ**

Эўхарыстычная вера Касцёла [6]

**Найсвяцейшая Тройца і Эўхарыстыя**
Хлеб, які сышоў з неба [7]
Бескарыслівы дар Найсвяцейшай Тройцы [8]

**Эўхарыстыя: Езус – сапраўднае ахвярнае Ягнё**
Новы і вечны запавет у крыві Ягняці [9]
Устанаўленне Эўхарыстыі [10]
*Figura transit in veritatem* [11]

**Дух Святы і Эўхарыстыя**
Езус і Дух Святы [12]
Дух Святы і эўхарыстычная цэлебрацыя [13]

**Эўхарыстыя і Касцёл**
Эўхарыстыя –першапрычына Касцёла [14]
Эўхарыстыя і эклезіяльная камунія [15]

**Эўхарыстыя і сакрамэнты**
Сакрамэнтальнасць Касцёла [16]

I. Эўхарыстыя і хрысціянскае ўтаямнічанне
Эўхарыстыя – паўната хрысціянскага ўтаямнічання [17]
Парадак сакрамэнтаў утаямнічання [18]
Утаямнічанне, эклезіяльная і сямейная супольнасць [19]

II. Эўхарыстыя і сакрамэнт паяднання
Іх унутраная сувязь [20]
Некаторыя пастырскія заўвагі [21]

III. Эўхарыстыя і намашчэнне хворых [22]

IV. Эўхарыстыя і сакрамэнт пасвячэння [23]
*In persona Christi capitis* [23]
Эўхарыстыя і святарскі цэлібат [24]
Недахоп духавенства і пастырства пакліканняў [25]
Удзячнасць і надзея [26]

V. Эўхарыстыя і сужэнства
Эўхарыстыя, шлюбны сакрамэнт [27]
Эўхарыстыя і адзінства сужэнства [28]
Эўхарыстыя і непарыўнасць сужэнства [29]

**Эўхарыстыя і эсхаталогія**
Эўхарыстыя: дар чалавеку на шляху [30]
Эсхаталагічная гасціна [31]

Малітва за памерлых [32]

**Эўхарыстыя і Дзева Марыя** [33]

ЧАСТКА ДРУГАЯ

**ЭЎХАРЫСТЫЯ, ЦЭЛЕБРАВАНАЯ ТАЯМНІЦА**

*Lex orandi e lex credendi* [34]
Прыгажосць і літургія [35]

**Эўхарыстычная цэлебрацыя – справа «Christus totus»**
*Christus totus in capite et in corpore* [36]
Эўхарыстыя і ўваскрослы Хрыстус [37]

**Ars celebrandi** [38]
Біскуп – найвышэйшы літург [39]
Павага да літургічных кніг і багацце знакаў [40]
Мастацтва ў служэнні цэлебрацыі [41]
Літургічны спеў [42]

**Структура эўхарыстычнай цэлебрацыі** [43]
Унутранае адзінства літургічных дзеянняў [44]
Літургія слова [45]
Гамілія [46]
Прыгатаванне дароў [47]
Эўхарыстычная малітва [48]
Знак супакою [49]
Удзяленне і прыняцце Эўхарыстыі [50]
Разасланне: «Ite, missa est» [51]

**Actuosa participatio**
Сапраўдны ўдзел [52]
Удзел і святарская паслуга [53]
Эўхарыстычная цэлебрацыя і інкультурацыя [54]
Асабістыя ўмовы для «Actuosa participatio» [55]
Удзел хрысціянаў некатолікаў [56]
Удзел праз сродкі камунікацыі [57]
«Actuosa participatio» хворых [58]

Клопат пра вязняў [59]
Эмігранты і ўдзел у Эўхарыстыі [60]
Вялікія канцэлебры [61]
Лацінская мова [62]
Эўхарыстычныя цэлебрацыі ў малых групах [63]

**Глыбокі ўдзел у цэлебрацыі**
Містагагічная катэхеза [64]
Пашана да Эўхарыстыі [65]

**Адарацыя і эўхарыстычная пабожнасць**
Унутраная сувязь паміж цэлебрацыяй і адарацыяй [66]
Практыка эўхарыстычнай адарацыі [67]
Формы эўхарыстычнай пабожнасці [68]
Месца табернакулюма ў касцёле [69]

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

**ЭЎХАРЫСТЫЯ, ТАЯМНІЦА ЖЫЦЦЯ**

**Эўхарыстычная форма хрысціянскага жыцця**
Разумнае служэнне – *logiké latreía (Рым 12,1)* [70]
Усеахопная плённасць эўхарыстычнага культу [71]
*Iuxta dominicam viventes* – жыць паводле нядзелі [72]
Выкананне наказу святкавання [73]
Сэнс адпачынку і працы [74]
Нядзельны сход пры адсутнасці святара [75]
Касцёльная прыналежнасць – эўхарыстычная форма хрысціянскага існавання [76]
Духоўнасць і эўхарыстычная культура [77]
Эўхарыстыя і евангелізацыя культур [78]
Эўхарыстыя і свецкія вернікі [79]
Эўхарыстыя і святарская духоўнасць [80]
Эўхарыстыя і кансэкраванае жыццё [81]
Эўхарыстыя і маральная перамена [82]
Эўхарыстычная лучнасць [83]

**Эўхарыстыя, таямніца абвяшчэння**
Эўхарыстыя і місія [84]
Эўхарыстыя і сведчанне [85]
Езус Хрыстус – адзіны Збаўца [86]
Свабода культу [87]

**Эўхарыстыя, таямніца, ахвяраваная свету**
Эўхарыстыя – ламаны хлеб дзеля жыцця свету [88]
Грамадскія вынікі эўхарыстычнай таямніцы [89]
Спажытак праўды і беднасць чалавека [90]
Сацыяльнае вучэнне Касцёла [91]
Асвячэнне свету і абарона стварэння [92]
Карыснасць «Кампендыя» на тэму Эўхарыстыі [93]

**Заключэнне** [94]

## УВОДЗІНЫ

1. Сакрамэнт любові1, Найсвяцейшая Эўхарыстыя, з’яўляецца дарам, які Езус Хрыстус дае з сябе, адкрываючы нам бясконцую любоў Бога да кожнага чалавека. У гэтым надзвычайным сакрамэнце выяўляецца «найбо́льшая» любоў, якая заахвочвае аддаць жыццё сваё за сяброў сваіх (пар. Ян 15, 13). Езус сапраўды «палюбіў іх да канца» (Ян 13, 1). Гэтымі словамі Евангеліст прадказвае Яго бясконцую пакору: перш чым памерці на крыжы за нас, Ён абвязаўся ручніком і мыў ногі сваім вучням. Такім жа чынам у сакрамэнце Эўхарыстыі Ён працягвае любіць нас «аж да канца», аж да дару свайго цела і сваёй крыві. Як жа павінны былі здзіўляцца Апосталы ў сваіх сэрцах чынам і словам Пана на працягу гэтай Вячэры! Якое здзіўленне павінна выклікаць таксама і ў нашых сэрцах таямніца Эўхарыстыі!

### *Спажытак праўды*

2. У сакрамэнце алтара Пан выходзіць насустрач чалавеку, створанаму паводле вобраза і падабенства Бога (пар. Быц 1, 27), і спадарожнічае нам на шляху. У гэтым сакрамэнце Пан дае сябе як спажытак чалавеку, які прагне праўды і свабоды. Толькі праўда можа зрабіць нас сапраўды свабоднымі (пар. Ян 8, 36). Таму Хрыстус становіцца для нас спажыткам праўды. З дакладным веданнем чалавечай прыроды св. Аўгустын паказаў, як спантанна, а не з прымусу, дзейнічае чалавек, калі сутыкаецца з тым, што яго прыцягвае і абуджае ў ім жаданне. Пытаючыся тады ў сябе, што можа так узбуджаць у глыбіні душы, святы біскуп усклікае: «Чаго можа прагнуць душа найбольш палымяна, калі не праўды?»2. Кожны чалавек носіць у сабе нястрыманую прагу праўды, канчатковай і дэфінітыўнай. Таму Пан Езус, «дарога, праўда і жыццё» (Ян 14, 6), звяртаецца да ўздыхаючага сэрца чалавека,які адчувае сябе сасмаглым пілігрымам; да сэрца, якое шукае крыніцу жыцця; да сэрца, якое жабруе праўду. Езус Хрыстус ёсць Праўдай, якая сталася Чалавекам, што прыцягвае да

сябе свет. «Езус – гэта палярная зорка чалавечай свабоды: без Яго яна губляе арыенцір, таму што без ведання праўды свабода скажаецца, ізалiруецца і ператвараецца ў марную волю. Свабода ёсць разам з Ім»3. У сакрамэнце Эўхарыстыі Езус асабліва паказвае нам *праўду аб любові*, якой з’яўляецца сама Божая сутнасць. Гэта тая евангельская праўда, якая датычыць кожнага чалавека і ўсяго чалавецтва. Таму Касцёл, які знаходзіць у Эўхарыстыiсвой жыццёвы асяродак, абавязваецца стала абвяшчаць усім, *у час і неў час* (пар. 2 Цім 4, 2), што Бог ёсць любоў4. Менавіта таму, што Хрыстус стаўся для нас спажыткам праўды, Касцёл звяртаецца да чалавека і запрашае яго дабравольна прыняць Божы дар.

***Развіццё эўхарыстычнага абраду***

3. Гледзячы на двухтысячагадовую гісторыю Божага Касцёла, якой кіруе мудрае дзеянне Духа Святога, мы захапляемся, поўныя ўдзячнасці, яго развіццём, упарадкаванасцю ў часе, абрадавымі формамі, у якіх успамінаем падзеі нашага збаўлення. Са шматлікіх форм першых стагоддзяў, якія ўсё яшчэ яснеюць у абрадах старажытных Касцёлаў Усходу, аж да распаўсюджвання рымскага абраду; ад выразных указанняў Трыдэнцкага Сабору і Імшала св. Пія V аж да літургічнай адновы, якой жадаў Другі Ватыканскі Сабор: на кожным этапе гісторыі Касцёла эўхарыстычная цэлебрацыя, як крыніца і вяршыня яго жыцця і місіі, ззяе ў літургічным абрадзе ва ўсёй разнастайнасці свайго багацця. XI Звычайны Агульны Сход Сіноду Біскупаў, які адбыўся з 2 па 23 кастрычніка 2005г. у Ватыкане, выказаў за гэтую гісторыю глыбокую падзяку Богу, прызнаючы ў ёй дзейснае кіраўніцтва Духа Святога. Асаблівым чынам Айцы Сіноду ўстанавілі і яшчэ раз пацвердзілі дабратворны ўплыў на жыццё Касцёла літургічнай рэформы, распачатай Другім Сусветным Ватыканскім Саборам5. Сінод Біскупаў меў магчымасць ацаніць яе прыняцце ў паслясаборны перыяд. Было шмат выразаў прызнання. Сцвярджалася, што цяжкасці і некаторыя заўважаныя празмернасці не могуць засланіць дыхтоўнасць і дзейснасць літургічнага аднаўлення, якое ўтрымлівае яшчэ не цалкам даследаваныя багацці. Канкрэтна гаворка ідзе аб зразуменні змен, жаданых Саборам у межах такой еднасці, якая характарызуе гістарычнае развіццё самога абраду, не ўводзячы штучных парушэнняў6.

***Сінод Біскупаў і Год Эўхарыстыі***

4. Акрамя таго, неабходна падкрэсліць сувязь нядаўняга Сіноду Біскупаў на тэму Эўхарыстыі з падзеямі апошніх гадоў у жыцці Касцёла. Перш за ўсё мы павінны ўзгадаць Вялікі Юбілей 2000-га года, з дапамогай якога мой умілаваны Папярэднік, Слуга Божы Ян Павел II, увёў Касцёл у трэцяе тысячагоддзе хрысціянства. Юбілейны Год несумненна меў моцны эўхарыстычны акцэнт. Таму нельга забываць, што Сіноду Біскупаў папярэднічаў, і ў пэўным сэнсе падрыхтаваў Год Эўхарыстыі, якога з вялікай надзеяй жадаў Ян Павел II для ўсяго Касцёла. Гэты год распачаўся Міжнародным Эўхарыстычным Кангрэсам у Гуадалаяры ў кастрычніку 2004г. і закончыўся 23 кастрычніка 2005г., падчас XI Сінадальнага

Сходу кананізацыяй пяці благаслаўлёных, якія вызначаліся асаблівай эўхарыстычнай пабожнасцю: біскупа Юзафа Більчэўскага, святара Гаэтана Катаноза, Зыгмунда Гараздоўскага і Альберта Хуртада Кручага, а таксама капуцына Фелічэ Нікозскага. Дзякуючы навучанню Яна Паўла II, змешчанаму ў апостальскім лісце «Mane nobiscum Domine»7, і каштоўным прапановам Кангрэгацыі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў8 з'явіліся шматлікія ініцыятывы дыяцэзій і касцёльных інстытутаў дзеля абуджэння і павелічэння сярод вернікаў эўхарыстычнай веры і дзеля большай стараннасці ў цэлебрацыі і развіцці эўхарыстычнай адарацыі, а таксама для дзейснай салідарнасці, якая, выходзячы з Эўхарыстыі, дасягнула б патрабуючых. Урэшце, неабходна згадаць значэнне апошняй энцыклікі «Ecclesia de Eucharistia»9 майго шаноўнага Папярэдніка, у якой ён пакінуў нам дакладную спасылку на вучэнне пра Эўхарыстыю і апошняе сведчанне аб цэнтральным месцы, якое гэты боскі сакрамэнт займаў у яго жыцці.

***Мэта дадзенай адгартацыі***

5. Гэтая паслясінадальная апостальская адгартацыя мае на мэце аднавіць разнастайныя багацці разважанняў і прапаноў нядаўняга Звычайнага Агульнага Сходу Сіноду Біскупаў – пачынаючы ад «Lineamenta» аж да «Propositiones», праз «Instrumentum laboris», «Relationes ante et post disceptationem», выказванняў Айцоў Сіноду, *auditores*і дэлегатаў братніх Касцёлаў, – каб растлумачыць некаторыя асноўныя напрамкі дзейнасці дзеля абуджэння ў Касцёле новага імпульсу і эўхарыстычнага запалу. Усведамляючы вялікую дактрынальную і дысцыплінарную спадчыну, што стваралася на працягу стагоддзяў вакол гэтага сакрамэнту10, у гэтым дакуменце асабліва прагну заахвоціць, улічваючы меркаванне Айцоў Сіноду11, каб хрысціяне паглыбілі разуменне сувязі, якая існуе паміж *эўхарыстычнай таямніцай*, *літургічным дзеяннем* і *новым духоўным культам*, што паходзіць з Эўхарыстыі – *сакрамэнту любові*. Таму прагну паказаць адносіны дадзенай адгартацыі з маёй першай энцыклікай «Deus caritas est», у якой шмат разоў казаў пра сакрамэнт Эўхарыстыі, падкрэсліваючы яе сувязь з хрысціянскай любоўю да Бога і да бліжняга: «Уцелаўлёны Бог прыцягвае нас усіх да сябе. Мы можам зразумець, што *agape* таксама азначае Эўхарыстыю: у ёй *agape* Бога прыходзіць да нас цялесна, каб надалей дзейнічаць у нас і праз нас»12.

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

## ЭЎХАРЫСТЫЯ, ТАЯМНІЦА ВЕРЫ

***«У тым справа Божая, каб вы верылі ў таго, каго Ён паслаў» (Ян 6, 29)***

***Эўхарыстычная вера Касцёла***

6. «*Гэта вялікая таямніца веры!*» Гэтымі словамі, сказанымі пасля слоў кансэкрацыі, святар абвяшчае здзейсненую таямніцу і выражае сваё захапленне субстанцыяльным перамяненнем хлеба і віна ў Цела і Кроў Пана Езуса, – рэчаіснасцю, якая пераўзыходзіць усялякае чалавечае разуменне. Эўхарыстыя з’яўляецца надзвычайнай «таямніцай веры», «сутнасцю і падсумаваннем нашай веры»13. Вера Касцёла – гэта па сутнасці эўхарыстычная вера. Яна асаблівым чынам жывіцца пры эўхарыстычным стале. Вера і сакрамэнты – гэта два аспекты эклезіяльнага жыцця. Узбуджаная абвяшчэннем Божага слова, вера корміцца і ўзрастае ў спатканні з ласкай уваскрослага Пана, якое адбываецца ў сакрамэнтах: «Вера выражаецца ў абрадзе, а абрад узмацняе і ўмацоўвае веру»14. Таму сакрамэнт алтара заўсёды застаецца ў цэнтры жыцця Касцёла; «дзякуючы Эўхарыстыі Касцёл заўсёды нараджаецца наноў!»15. Чым больш жывой з’яўляецца эўхарыстычная вера Божага народу, тым глыбей яна ўдзельнічае ў касцёльным жыцці праз свядомае далучэнне да місіі, якую Хрыстус даручыў сваім вучням. Сведчыць пра гэта сама гісторыя Касцёла. Кожная вялікая рэформа звязана нейкім чынам з адкрыццём нанова веры ў эўхарыстычную прысутнасць Пана сярод яго народу.

## Найсвяцейшая Тройца і Эўхарыстыя

### *Хлеб, які сышоў з неба*

7. Першая рэчаіснасць эўхарыстычнай веры – гэта сама таямніца Бога, трынітарная любоў. У дыялогу Езуса з Нікадэмам знаходзім гэтаму тлумачэнне: «Бо так палюбіў Бог свет, што аддаў Сына свайго Адзінароднага, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае. Бо не паслаў Бог Сына свайго ў свет, каб судзіць свет, але каб свет быў збаўлены праз Яго» (Ян 3, 16-17). Гэтыя словы паказваюць галоўную сутнасць дару Бога. Езус у Эўхарыстыі дае нам не «штосьці», але сябе самога. Ён ахвяруе сваё цела і праліваe сваю кроў. Такім чынам аддае ўсё сваё існаванне, выяўляючы першакрыніцу гэтай любові. Ён з’яўляецца вечным Сынам, дадзеным нам Айцом. Таксама ў Евангеллі мы чуем Езуса, які, насыціўшы мноства праз размнажэнне хлябоў і рыбы, кажа сваім суразмоўцам, што ішлі за Ім у сінагогу ў Кафарнауме: «Айцец Мой дае вам сапраўдны хлеб з неба. Бо хлеб Божы ёсць той, які сыходзіць з неба і дае жыццё свету» (Ян 6, 32-33), і атаясамлівае сябе, сваё цела і сваю кроў з гэтым хлебам: «Я хлеб жывы, які сышоў з неба. Калі хто будзе есці хлеб гэты, будзе жыць вечна. А хлеб, які Я дам, гэта цела Маё дзеля жыцця свету» (Ян 6, 51). Такім чынам Езус выяўляе сябе, як хлеб жыцця, дадзены чалавецтву спрадвечным Айцом.

### *Бескарыслівы дар Найсвяцейшай Тройцы*

8. У Эўхарыстыі выяўляецца план любові, які кіруе ўсёй гісторыяй збаўлення (пар. Эф 1, 10; 3, 8-11). У ёй *Deus Trinitas*, які ў самім сабе ёсць любоўю (пар. 1 Ян 4, 7-8), цалкам далучаецца да нашага чалавечага стану. У хлебе і віне, пад постацямі якіх Хрыстус дае нам сябе падчас пасхальнай вячэры (пар. Лк 22, 14-20; 1 Кар 11, 23-26), усё Божае жыццё

дасягае нас і перадаецца нам у форме сакрамэнту. Бог ёсць дасканалай камуніяй любові паміж Айцом, Сынам і Святым Духам. Ужо пры стварэнні чалавек быў пакліканы ў пэўнай ступені да ўдзелу ў жыватворным подыху Бога (пар. Быц 2, 7). Але ў Хрысце, памерлым і ўваскрослым, і ў праліцці Духа Святога, дадзенага без меры (пар. Ян 3, 34), мы становімся ўдзельнікамі боскага сяброўства16. Таму Езус Хрыстус, які «праз вечнага Духа склаў сябе самога як беззаганную ахвяру Богу» (Гбр 9, 14), у эўхарыстычным дары перадае нам тое самае боскае жыццё. Гаворка ідзе пра абсалютна бескарыслівы дар, які выключна адпавядае абяцанням Бога, здзейсненым у поўнай меры. Касцёл прымае, цэлебруе і пакланяецца гэтаму дару ў вернай паслухмянасці. «Таямніца веры» – гэта таямніца трынітарнай любові, да ўдзелу ў якой, дзякуючы ласцы, мы пакліканы. Таму і мы павінны ўсклікаць са св. Аўгустынам: «Калі бачыш любоў, бачыш Тройцу»17.

## Эўхарыстыя: Езус – сапраўднае ахвярнае Ягнё

### *Новы і вечны запавет у крыві Ягняці*

9. Місія, дзеля якой Езус прыйшоў да нас, цалкам здзяйсняецца ў Пасхальнай таямніцы. З вышыні крыжа, адкуль прыцягвае ўсіх да сябе (пар. Ян 12, 32), перш чым «аддаць Духа», Ён кажа: «Збылося!» (Ян 19, 30). У таямніцы сваёй паслухмянасці аж да смерці, смерці крыжовай (пар. Флп 2, 8), рэалізуецца новы і вечны запавет. Свабода Бога і свабода чалавека канчаткова сустракаюцца ў Яго ўкрыжаваным целе, у непарыўным, назаўсёды дзейсным пагадненні. Грэх чалавека таксама быў адкуплены раз і назаўсёды Божым Сынам (пар. Гбр 7, 27; 1 Ян 2,2; 4, 10). Як меў ужо магчымасць сцвярджаць, «у Яго смерці на крыжы адбываецца той паварот Бога супраць самога сябе, у якім Ён аддаецца, каб падняць чалавека і выбавіць яго, – гэта любоў, выражаная ў найбольш радыкальнай форме»18. У Пасхальнай таямніцы адбываецца нашае сапраўднае вызваленне са зла і смерці. Пры ўстанаўленні Эўхарыстыі Езус сам казаў аб «новым і вечным запавеце», заключаным у Яго пралітай крыві (пар. Мц 26, 28; Мк 14, 24; Лк 22, 20). Гэтая канчатковая мэта Ягонай місіі была відавочна ўжо на пачатку Яго зямнога жыцця. Калі на берагах Ярдана Ян Хрысціцель убачыў Езуса, які ішоў да яго, ён усклікнуў: «Вось *Ягнё Божае*, вось той, хто бярэ на сябе грахі свету» (Ян 1, 29). Паказальным з'яўляецца паўтарэнне гэтага выразу кожны раз падчас цэлебрацыі св. Імшы, калі святар заклікае наблізіцца да алтара: «Вось *Ягнё Божае*, вось той, хто бярэ на сябе грахі свету. Благаслаўлёныя пакліканыя на вячэру Ягоную». Езус з'яўляецца сапраўдным пасхальным ягнём, які добравольна ахвяраваў сябе за нас, рэалізуючы такім чынам новы і вечны запавет. Эўхарыстыя змяшчае ў сабе гэтую радыкальную навіну, якая наноў прапаноўваецца нам у кожнай цэлебрацыі19.

### *Устанаўленне Эўхарыстыі*

10. Такім чынам мы даходзім да разважання над устанаўленнем Эўхарыстыі на Апошняй Вячэры. Гэта адбываецца ў кантэксце абрадавай вячэры, якая з'яўляецца ўспамінам падзеі,

якая фарміруе ізраэльскі народ: вызваленне з егіпецкай няволі. Гэтая абрадавая вячэра, звязаная з прынясеннем ў ахвяру ягнят (пар. Зых 12, 1-28. 43-51), была ўспамінам мінулага, але ў той жа час і прароцкім успамінам, інакш кажучы, абвяшчэннем будучага вызвалення. Сапраўды, народ зведаў, што тое вызваленне не было канчатковым, таму што іх гісторыя яшчэ была празмерна пазначана няволяй і грахом. Успамін старадаўняга вызвалення адказвае такім чынам на пытанне і чаканне збаўлення больш глыбокага, радыкальнага, усеагульнага і канчатковага. У гэтым кантэксце Езус адкрывае навізну свайго дару. У малітве хвалы, *Berakah*, Ён дзякуе Айцу не толькі за вялікія падзеі мінулай гісторыі, але і за ўласнае «ўзвялічванне». Устанаўліваючы сакрамэнт Эўхарыстыі, Езус апярэджвае і ўключае ў яе ахвяру Крыжа і перамогу ўваскрасення. У той жа час Ён аб'яўляецца як *сапраўднае* ахвярнае ягнё, што было прадбачана ў плане Айца перад стварэннем свету, пра што чытаем у Першым пасланні св. Пятра (пар. 1, 18-20). Змяшчаючы ў гэтым кантэксце свой дар, Езус выяўляе збаўчы сэнс сваёй смерці і ўваскрасення, таямніцы, якая становіцца рэчаіснасцю гісторыі і ўсяго сусвету. Устанаўленне Эўхарыстыі сапраўды паказвае, як тая смерць, сама па сабе гвалтоўная і недарэчная, стала ў Езусе найвышэйшым дзеяннем любові і канчатковага вызвалення чалавецтва ад зла.

***Figura transit in veritatem***

11. Езус далучае сваё радыкальнае *novum* да старажытнай ахвярнай габрэйскай вячэры. Мы, хрысціяне, не павінны болей паўтараць той вячэры. Як справядліва кажуць Айцы, *figura transit in veritatem:* тое, што прадказвала будучую рэчаіснасць, цяпер пакінула месца самой праўдзе. Старажытны абрад здзейсніўся і быў канчаткова прасякнуты дарам любові ўцелаўлёнага Божага Сына. Спажытак праўды, Хрыстус, ахвяраваны за нас, *dat figuris terminum*20. Наказам: «*Гэта чыніце на маю памяць*» (Лк 22, 19; 1 Кар 11, 25). Ён просіць адказваць на Яго дар і прадстаўляць яго сакрамэнтальна. Таму гэтымі словамі Пан выражае, можна сказаць, чаканне, што Касцёл, народжаны з Ягонай ахвяры, прыме гэты дар, развіваючы пад кіраўніцтвам Духа Святога літургічную форму сакрамэнту. Успамін Яго дасканалага дару на самай справе заключаецца не ў простым паўтарэнні Апошняй Вячэры, але менавіта ў Эўхарыстыі, інакш кажучы, у радыкальнай навізне хрысціянскага культу. Такім чынам Езус пакінуў нам заданне ўвайсці ў Яго «гадзіну»: «Эўхарыстыя далучае нас да ахвярнага акту Езуса. Мы не толькі статычна атрымліваем уцелаўлёны *Logos*, але ўключаемся ў саму дынаміку яго ахвяры»21. Ён «далучае нас да сябе самога»22. Субстанцыянальнае перамяненне хлеба і віна ў Яго цела і Яго кроў уносіць у стварэнне прынцып радыкальнай змены, нешта накшталт «дзялення ядра», каб ужыць вядомы сёння вобраз, пранікаючы ў самую глыбіню быцця, змены, якая павінна выклікаць працэс ператварэння рэчаіснасці, апошняй мяжой якога будзе перамяненне ўсяго свету аж да стану, калі Бог будзе ўсім ва ўсіх (пар. 1 Кар 15, 28).

**Дух Святы і Эўхарыстыя**

***Езус і Дух Святы***

12. Сваім словам, а таксама хлебам і віном сам Пан даў нам істотныя элементы новага культу. Касцёл – Яго абранніца, пакліканы цэлебраваць эўхарыстычную гасціну дзень за днём на Яго памяць. Ён упісвае такім чынам збаўчую ахвяру свайго Абранніка ў гісторыю людзей і робіць яго сакрамэнтальна прысутным ва ўсіх культурах. Гэтая «вялікая таямніца» цэлебруецца ў літургічных формах, якія Касцёл, пад кіраўніцтвам Духа Святога, развівае ў часе і прасторы23. У сувязі з гэтым неабходна ўсвядоміць вырашальную ролю, якую выконвае Дух Святы ў развіцці літургічнай формы і паглыбленні Божых таямніц. Параклет, першы дар вернікам24, які дзейнічае ўжо ў стварэнні (пар Быц 1, 2), ёсць цалкам прысутны ва ўсім існаванні ўцелаўлёнага Слова: Езус Хрыстус быў зачаты з Дзевы Марыі праз дзеянне Духа Святога (пар. Мц 1, 18; Лк 1, 35); на пачатку сваёй зямной місіі на берагах Ярдана, бачыць Духа, які спускаецца на Яго ў выглядзе голуба (пар. Мц 3, 16 і парал.); у тым жа самым Духу дзейнічае, прамаўляе і радуецца (пар. Лк 10, 21); і гэта ў Ім Ён можа ахвяраваць сябе самога (пар. Гбр 9, 14). У гэтак званай «развітальнай прамове», перададзенай св. Янам, Езус усталёўвае выразную сувязь дару свайго жыцця ў Пасхальнай таямніцы з дарам Духа для сваіх вучняў. Будучы ўваскрослым і маючы на сваім целе знакі пакуты, Ён можа праліваць Духа (пар. Ян 20, 22), робячы іх удзельнікамі сваёй місіі (пар. Ян 20, 21). Пазней Дух будзе вучыць вучняў усяму і прыпамінаць ім усё, што казаў Езус (пар. Ян 14, 26), таму што Яму, як Духу Праўды (пар. Ян 15, 26), належыць уводзіць вучняў ва ўсю праўду (пар. Ян 16, 13). У апісанні паводле *Дзеяў Апосталаў* Дух сыходзіць на Апосталаў, сабраных на малітве з Марыяй ў дзень Пяцідзесятніцы (пар. 2, 1-4), і ажыўляе іх для місіі абвяшчэння ўсім народам Евангелля. Больш за тое, гэта дзякуючы моцы дзеяння Духа сам Хрыстус застаецца прысутным і дзейнічае ў сваім Касцёле, пачынаючы з яго жыццёвага цэнтра, якім ёсць Эўхарыстыя.

***Дух Святы і эўхарыстычная цэлебрацыя***

13. У гэтай перспектыве можна зразумець вырашальную ролю Духа Святога ў эўхарыстычнай цэлебрацыі і асабліва ў перамяненні. Гэтае разуменне добра адлюстравана ў Айцоў Касцёла. Св. Кірыл Ерузалемскі ў сваіх «Катэхезах» нагадвае, што мы «ўпрошваем міласэрнага Бога паслаць свайго Духа Святога на прынесеныя ахвяры, каб Ён перамяніў хлеб у Цела Хрыста і віно – у Кроў Хрыста. Тое, чаго датыкаецца Дух Святы, асвячаецца і цалкам перамяняецца»25. Св. Ян Хрызастом таксама зазначае, што святар заклікае Духа Святога, калі цэлебруе ахвяру26: ён кажа, што распарадчык, як Ілля, заклікае Духа Святога, каб ласка, «сыходзячая на ахвяру, распаліла душы ўсіх»27. Як ніколі для духоўнага жыцця вернікаў неабходна больш выразнае ўсведамленне багацця анафары: разам са словамі, вымаўленымі Хрыстом падчас Апошняй Вячэры, яна ўтрымлівае эўхарыстычную малітву, або заклік да Айца спасладь дар Духа Святога, каб хлеб і віно сталі Целам і Крывёю Езуса Хрыста і каб «уся супольнасць станавілася ўсё больш целам Хрыста»28. Дух, якога заклікае цэлебрант над дарамі хлеба і віна, размешчанымі на алтары, з’яўляецца тым самым, які

яднае вернікаў «у адным целе», ствараючы з іх духовую ахвяру, прыемную Айцу29.

## Эўхарыстыя і Касцёл

### *Эўхарыстыя – першапрычына Касцёла*

14. Праз сакрамэнт Эўхарыстыі Езус уводзіць вернікаў у сваю ўласную гадзіну; такім чынам Ён паказвае сувязь, якую прагнуў устанавіць паміж сабой і намі, паміж сваёй асобай і Касцёлам. Сам Хрыстус у ахвяры крыжа нарадзіў Касцёл як сваю абранніцу і сваё цела. Айцы Касцёла шмат разважалі над сувяззю паміж паходжаннем Евы з боку спячага Адама (пар. Ян 2, 21-23) і новай Евай, Касцёлам, які нарадзіўся з адкрытага боку Хрыста, ахопленага сном смерці: з прабітага боку, кажа св. Ян, выцякла кроў і вада (пар. Ян 19, 34) – сімвал сакрамэнтаў30. Кантэмпляцыйны позірк «на таго, каго прабілі» (Ян 19, 37), вядзе нас да разважання над прычыннай сувяззю паміж ахвярай Хрыста, Эўхарыстыяй і Касцёлам. Касцёл, насамрэч, «жыве дзякуючы Эўхарыстыі»31. Паколькі ў ёй становіцца прысутнай збаўчая ахвяра Хрыста, неабходна першза ўсё распазнаць, што «існуе прычынная сувязь паміж Эўхарыстыяй і самім пачаткам Касцёла»32. Эўхарыстыя – гэта Хрыстус, які дае сябе нам, няспынна будуючы нас, як сваё цела. Таму ў пераканаўчай цыклічнасці паміж Эўхарыстыяй, якая будуе Касцёл, і самым Касцёлам, які здзяйсняе Эўхарыстыю33, першапрычынай з'яўляецца тое, што выражана ў першай формуле: Касцёл можа цэлебраваць і пакланяцца таямніцы Хрыста, прысутнага ў Эўхарыстыі менавіта таму, што сам Хрыстус першы даў сябе ёй у ахвяры Крыжа. Для Касцёла магчымасць «здзяйсняць» Эўхарыстыю цалкам укаранёна ў дары, якім з'яўляецца сам Хрыстус. Таксама і тут адкрываем пераканаўчы аспект выказвання св. Яна: «Ён першы палюбіў нас» (1 Ян 4, 19). Такім чынам мы таксама прызнаём першынство дару Хрыста ў кожнай цэлебрацыі. Прычынны ўплыў Эўхарыстыі на вытокі Касцёла канчаткова адкрывае папярэджанне не толькі храналагічнае, але таксама анталагічнае, што Ён палюбіў нас «першым». Праз усю вечнасць Ён з'яўляецца тым, хто першым палюбіў нас.

### *Эўхарыстыя і эклезіяльная камунія*

15. Эўхарыстыя складае быццё і дзейнасць Касцёла. Таму хрысціянская старажытнасць словамі *Corpus Christi* акрэслівала таксама Цела, народжанае з Дзевы Марыі, Цела эўхарыстычнае і эклезіяльнае цела Хрыста34. Гэты факт, прысутны ў традыцыі, дапамагае нам больш глыбока ўсвядоміць непадзельнасць Хрыста і Касцёла. Пан Езус, аддаючы сябе самога ў ахвяру за нас, дзейсна прадказаў у сваім дары таямніцу Касцёла. Важна тое, што II эўхарыстычная малітва, заклікаючы Параклета, фарміруе такім чынам малітву аб еднасці Касцёла: *«Каб усіх нас, прымаючых Цела і Кроў Хрыста, Дух Святы сабраў у адно»*. Гэты ўрывак дапамагае зразумець, як *рэчаіснасць* сакрамэнту Эўхарыстыі стварае адзінства вернікаў у эклезіяльнай камуніі. Эўхарыстыя выяўляецца такім чынам ў пачатках Касцёла як таямніца камуніі35.

На сувязь Эўхарыстыі і *communio* ўжо звяртаў увагу слуга Божы Ян Павел II у сваёй энцыкліцы «Ecclesia de Eucharistia». Ён казаў аб успаміне Хрыста, як аб «найвышэйшым сакрамэнтальным праяўленні камуніі ў Касцёле»36. Адзінства эклезіяльнай камуніі канкрэтна праяўляецца ў хрысціянскіх супольнасцях і аднаўляецца ў эўхарыстычным акце, які іх яднае і распазнае ў мясцовых Касцёлах, «*in quibus et ex quibus una et unica Ecclesia catholica exsistit*»37. Менавіта рэчаіснасць адзінай Эўхарыстыі, якая цэлебруецца ў кожнай дыяцэзіі разам са сваім біскупам, дае нам зразумець, як самі мясцовыя Касцёлы існуюць *in* і *ex Ecclesia*. Сапраўды, «еднасць і непадзельнасць эўхарыстычнага Цела Пана падтрымлівае еднасць Яго Містычнага цела, якім ёсць адзіны і непадзельны Касцёл. З эўхарыстычнага цэнтра нараджаецца неабходная адкрытасць кожнай цэлебруючай супольнасці, кожнага мясцовага Касцёла: прыцягнуты распасцёртымі рукамі Пана, ён уваходзіць у Яго адзінае і непадзельнае цела»38. З гэтай прычыны ў цэлебрацыі Эўхарыстыі кожны вернік знаходзіцца ў *сваім* Касцёле, г.зн. у Касцёле Хрыста. У гэтай эўхарыстычнай перспектыве, адпаведна зразуметай, эклезіяльная камунія выяўляецца як рэчаіснасць, каталіцкая па сваёй прыродзе39. Падкрэсліванне гэтых эўхарыстычных каранёў можа плённа садзейнічаць таксама і экуменічнаму дыялогу з Касцёламі і Касцёльнымі супольнасцямі, якія не знаходзяцца ў поўнай еднасці са Сталіцай Пятра. Эўхарыстыя ўсталёўвае моцную сувязь еднасці паміж каталіцкім Касцёлам і праваслаўнымі Касцёламі, якія захавалі сапраўдную і цэласную сутнасць таямніцы Эўхарыстыі. У той жа час, значнасць, нададзеная эклезіяльнаму характару Эўхарыстыі, можа стаць прывілеяваным элементам таксама ў дыялогу з супольнасцямі, якія ўзніклі ў выніку Рэфармацыі40.

## Эўхарыстыя і сакрамэнты

### *Сакрамэнтальнасць Касцёла*

16. Другі Ватыканскі Сабор нагадаў, што «ўсе сакрамэнты, як і ўсе касцёльныя служэнні і справы апостальства, цесна з'яднаны са святой Эўхарыстыяй і скіраваны да яе. У найсвяцейшай Эўхарыстыі змяшчаецца ўсё духоўнае багацце Касцёла, г.зн. – сам Хрыстус, наша Пасха і Хлеб жывы, які праз сваё ажыўленае Духам Святым і жыватворнае цела дае жыццё людзям і такім чынам запрашае і заахвочвае іх ахвяроўваць разам з Ім самых сябе, уласную працу і ўсе створаныя рэчы»41. Гэтая ўнутраная сувязь Эўхарыстыі з усімі іншымі сакрамэнтамі і хрысціянскім жыццём найглыбей разумеецца праз сузіранне таямніцы самога Касцёла як сакрамэнту42. У сувязі з гэтым Другі Ватыканскі Сабор сцвердзіў, што «Касцёл у Хрысце з'яўляецца ў пэўным сэнсе сакрамэнтам, г.зн. знакам і прыладай яго ўнутранага з'яднання з Богам і адзінства ўсяго чалавечага роду»43. Касцёл, як кажа св. Кіпрыян, у якасці «народу, з'яднанага еднасцю Айца, Сына і Духа Святога»44, з'яўляецца сакрамэнтам трынітарнай еднасці.

Той факт, што Касцёл – гэта «паўсюдны сакрамэнт збаўлення»45, указвае, як

сакрамэнтальная «эканомія» канчаткова вызначае тое, якім чынам Хрыстус, адзіны Збаўца, праз Духа дасягае нашага існавання ў спецыфічнасці яго умоў. Касцёл прымае сябе і разам з тым выражаецца ў сямі сакрамэнтах, праз якія ласка Божая канкрэтна ўздзейнічае на быццё вернікаў, каб усё жыццё, адкупленае Хрыстом, стала пакланеннем, прыемным Богу. У гэтай перспектыве хацеў бы падкрэсліць некаторыя элементы, на якія звярнулі сваю ўвагу Айцы Сіноду і якія могуць дапамагчы зразумець сувязь усіх сакрамэнтаў з таямніцай Эўхарыстыі.

**I. Эўхарыстыя і хрысціянскае ўтаямнічанне**

***Эўхарыстыя – паўната хрысціянскага ўтаямнічання***

17. Калі Эўхарыстыя сапраўды з'яўляецца крыніцай і вяршыняй хрысціянскага жыцця і місіі Касцёла, то з гэтага перш за ўсё вынікае, што пунктам аднясення на шляху хрысціянскага ўтаямнічання ёсць магчымасць прыступаць да гэтага сакрамэнту. У сувязі з гэтым, як сцвердзілі Айцы Сіноду, мы павінны запытаць сябе, ці ў нашых хрысціянскіх супольнасцях дастаткова зразумета сувязь паміж хростам, канфірмацыяй і Эўхарыстыяй46. Мы ніколі не павінны забываць, што праз хрост і канфірмацыю мы скіраваны да Эўхарыстыі. З гэтага факту вынікае абавязак, каб у пастырскай дзейнасці садзейнічаць больш інтэгральнаму разуменню працэса хрысціянскага ўтаямнічання. Сакрамэнт хросту, праз які мы прыпадабняемся да Хрыста47, далучаемся да Касцёла і становімся дзецьмі Божымі, з'яўляецца ўваходнай брамай да ўсіх сакрамэнтаў. Праз хрост мы далучаемся да адзінага цела Хрыста (пар. 1 Кар 12, 13), святарскага народу. Аднак, толькі ўдзел у эўхарыстычнай Ахвяры ўдасканальвае ў нас тое, што нам было дадзена ў хросце. Таксама дары Духа дадзены нам для будавання цела Хрыста (1 Кар 12) і для большага евангельскага сведчання ў свеце48. Таму найсвяцейшая Эўхарыстыя вядзе да паўнаты хрысціянскага ўтаямнічання і з'яўляецца цэнтрам і мэтай усяго сакрамэнтальнага жыцця49.

***Парадак сакрамэнтаў утаямнічання***

18. У сувязі з гэтым неабходна звярнуць увагу на парадак сакрамэнтаў утаямнічання. У Касцёле існуюць розныя традыцыі. Гэтая разнастайнасць выразна бачна ў касцёльных традыцыях Усходу50 і ў заходняй практыцы адносна ўтаямнічання дарослых51 у параўнанні з утаямнічаннем дзяцей52. Тым не менш гэтыя адрозненні не дагматычныя, а маюць пастырскі характар. Канкрэтна разглядаючы гэтае пытанне, неабходна вызначаць, якая практыка сапраўды можа лепш дапамагчы вернікам змясціць у цэнтры сакрамэнт Эўхарыстыі, як рэчаіснасць, да якой імкнецца ўсё ўтаямнічанне. У цесным супрацоўніцтве з кампетэнтнымі ведамствамі Рымскай Курыі Канферэнцыі Біскупаў павінны распазнаць плённасць актуальнай арганізацыі ўтаямнічання, каб выхаваўчая дзейнасць нашых супольнасцяў дапамагла хрысціяніну ва ўсё большым сталенні, каб ён дайшоў да прыняцця ў сваім жыцці аўтэнтычнага эўхарыстычнага фундаменту, каб адпаведна нашаму часу змог

надаць сэнс уласнай надзеі (пар. 1 П 3,15).

### *Утаямнічанне, эклезіяльная і сямейная супольнасць*

19. Неабходна заўсёды памятаць, што ўсё хрысціянскае ўтаямнічанне – гэта шлях навяртання, якое ажыццяўляецца з дапамогай Бога і з пастаянным аднясеннем да эклезіяльнай супольнасці, ці ў выпадку дарослага, які просіць аб прыняцці ў Касцёл, – гэта адбываецца на тэрыторыях першай евангелізацыі або на секулярызаваных тэрыторыях, – ці тады, калі бацькі просяць аб сакрамэнтах для сваіх дзяцей. У сувязі з гэтым прагну звярнуць увагу перш за ўсё на адносіны паміж хрысціянскім утаямнічаннем і сям’ёй. У пастырскай працы на шляху ўтаямнічання трэба заўсёды прыцягваць сям’ю. Прыняцце хросту, канфірмацыі і першае прыступанне да Эўхарыстыі з’яўляюцца вырашальнымі момантамі не толькі для асобы, якая іх прымае, але таксама для ўсёй сям’і, якую павінны падтрымліваць у сваім выхаваўчым заданні эклезіяльныя супольнасці53. Тут хацеў бы падкрэсліць значэнне першай св. Камуніі. Для многіх вернікаў гэты дзень застаецца ў памяці як першая сустрэча, у якой, хоць яшчэ на пачатковым узроўні, спазнана важнасць асабістага спаткання з Езусам. Парафіяльнае пастырства павінна адпаведна ацэньваць гэтую вельмі значную падзею.

## II. Эўхарыстыя і сакрамэнт паяднання

### *Іх унутраная сувязь*

20. Слушна сцвердзілі Айцы Сіноду, што любоў да Эўхарыстыі вядзе да ўсё большага шанавання таксама сакрамэнту паяднання54. З увагі на сувязь паміж гэтымі сакрамэнтамі аўтэнтычная катэхеза наконт значэння Эўхарыстыі не можа быць аддзелена ад прапановы шляху пакаяння (пар. 1 Кар 11, 27-29). У наш час вернікі акружаны культурай, якая імкнецца сцерці пачуццё граху55, садзейнічаючы павярхоўнаму стаўленню, якое вядзе да забыцця неабходнасці быць ў стане ласкі Божай, каб годна прыступіць да сакрамэнтальнай Камуніі56. На самой справе страта свядомасці граху заўсёды з’яўляецца вынікам пэўнай павярхоўнасці ў разуменні самой любові Бога. Вялікую карысць прыносіць вернікам заклік да тых элементаў, якія падчас абраду св. Імшы выражаюць разуменне асабістай грэшнасці і адначасова міласэрнасць Бога57. Больш за тое, сувязь паміж Эўхарыстыяй і паяднаннем нагадвае, што грэх ніколі не з’яўляецца рэчаіснасцю выключна індывідуальнай; ён заўсёды раніць таксама ўсю эклезіяльную супольнасць, да якой мы далучаны праз хрост. Таму паяднанне, як казалі Айцы Касцёла, – гэта *laboriosus quidam baptismus*58, падкрэсліваючы такім чынам, што вынікам шляху навяртання ёсць таксама аднаўленне поўнай эклезіяльнай еднасці, якая выяўляецца ў адноўленым прыняцці Эўхарыстыі59.

### *Некаторыя пастырскія заўвагі*

21. Сінод нагадаў, што пастырскім заданнем біскупа ва ўласных дыяцэзіях з’яўляецца

рашучае аднаўленне педагогікі навяртання, якое нараджаецца з Эўхарыстыі і спрыяе частай споведзі вернікаў. Усе святары павінны прысвячаць сябе з велікадушнасцю, стараннасцю і кампетэнтнасцю ажыццяўленню сакрамэнту паяднання60. У сувязі з гэтым неабходна звярнуць увагу на тое, каб канфесіяналы ў нашых касцёлах былі добра бачныя і каб падкрэслівалі важнасць гэтага сакрамэнту. Звяртаюся да пастыраў з просьбай старанна сачыць за цэлебрацыяй сакрамэнту паяднання, абмяжоўваючы практыку агульнага адпушчэння грахоў выключна да выпадкаў, прадугледжаных правам61, бо толькі індывідуальная споведзь з'яўляецца звычайнай формай гэтага сакрамэнту62. З увагі на неабходнасць нанова адкрыць сакрамэнтальнае прабачэнне ва ўсіх дыяцэзіях павінен быць *спаведнік*63. Нарэшце, для новага ўсведамлення сувязі паміж Эўхарыстыяй і паяднаннем, дзейснай дапамогай можа быць памяркоўная і паглыбленая практыка *адпустаў*, атрыманых для сябе ці за памерлых. Праз яго дасягаецца «прабачэнне перад Богам часовай кары за грахі, віна за якія ўжо прабачана»64. Карыстанне з адпустаў дапамагае зразумець, што, спадзеючыся толькі на свае сілы, мы не здолеем выправіць учыненае зло і што грахі кожнага прычыняюць шкоду ўсёй супольнасці; практыка адпусту, якая змяшчае ў сабе акрамя вучэння аб бясконцых заслугах Езуса і вучэння аб еднасці святых, кажа нам, «наколькі глыбока мы з'яднаныя між сабой ў Хрысце і наколькі звышпрыроднае жыццё кожнага можа прыносіць карысць іншым»65. Паколькі сама формула адпусту прадугледжвае сярод умоў яго атрымання споведзь і сакрамэнтальную Камунію, то гэтая практыка можа дзейсна падтрымліваць вернікаў на шляху навяртання і ў адкрыцці цэнтральнага месца Эўхарыстыі ў хрысціянскім жыцці.

### *III. Эўхарыстыя і намашчэнне хворых*

22. Езус не толькі паслаў сваіх вучняў аздараўляць хворых (пар. Мц 10, 8; Лк 9, 2; 10,9), але ўстанавіў таксама для іх асаблівы сакрамэнт: намашчэнне хворых66. *Пасланне св. Якуба* сведчыць пра прысутнасць гэтага сакрамэнтальнага чыну ўжо ў першай хрысціянскай супольнасці (пар. 5, 14-16). Калі Эўхарыстыя паказвае, як пакуты і смерць Хрыста перамяніліся ў любоў, то намашчэнне хворых у сваю чаргу далучае таго, хто церпіць, да ахвяры Хрыста, якую Ён учыніў для збаўлення ўсіх, каб хворы таксама мог у таямніцы еднасці святых удзельнічаць у збаўленні свету. Сувязь паміж гэтымі сакрамэнтамі выяўляецца таксама тады, калі стан хворага пагаршаецца. «Тым, хто збіраецца пакінуць гэтае жыццё, Касцёл прапануе акрамя намашчэння хворых Эўхарыстыю як Віятык»67. У пераходзе да Айца прыняцце ў св. Камуніі Цела і Крыві Хрыста становіцца задаткам вечнага жыцця і моцы ўваскрашэння: «Хто есць Маё цела і п'е Маю кроў, мае жыццё вечнае, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень» (Ян 6, 54). Паколькі святы Віятык адкрывае хвораму паўнату Пасхальнай таямніцы, то неабходна гарантаваць гэтую паслугу68. Увага і пастырскі клопат пра хворых прыносіць безумоўную карысць усёй супольнасці, бо тое, што ўчынілі найменшаму, учынілі самому Езусу (пар. Мц 25, 40).

## IV. Эўхарыстыя і сакрамэнт пасвячэння

### *In persona Christi capitis*

23. Унутраная сувязь паміж Эўхарыстыяй і сакрамэнтам пасвячэння вынікае са слоў самога Езуса ў Вячэрніку: «Гэта чыніце на Маю памяць» (Лк 22, 19). Езус у вігілію сваёй смерці ўстанавіў Эўхарыстыю, а таксама *святарства Новага Запавету*. Ён з'яўляецца святаром, ахвярай і алтаром: пасрэднікам паміж Богам Айцом і народам (пар. Гбр 5, 5-10), ахвярай экспіяцыі (пар. 1 Ян 2, 2; 4, 10), які аддае самога сябе на алтары крыжа. Ніхто не можа сказаць «гэта цела маё» і «гэта келіх крыві маёй», калі не ў імя і ад асобы Хрыста, адзінага найвышэйшага святара новага і вечнага Запавету (пар. Гбр 8-9). Сінод Біскупаў ужо на папярэдніх сходах звяртаўся да тэмы сакрамэнтальнага святарства, ці то адносна сутнасці гэтага служэння69, ці то адносна фармацыі кандыдатаў70. З гэтай нагоды ў святле дыялогу, які адбыўся падчас апошняй сінадальнай сустрэчы, лічу неабходным узгадаць некаторыя важныя моманты адносна сувязі паміж сакрамэнтам Эўхарыстыі і пасвячэннем. Перш за ўсё неабходна пацвердзіць, што сувязь паміж *пасвячэннем і Эўхарыстыяй* з'яўляецца бачнай па-сапраўднаму ў св. Імшы, якую ўзначальвае біскуп ці прэзбітэр *у асобе Хрыста-Галавы*.

Вучэнне Касцёла чыніць святарскае пасвячэнне неад'емнай умовай для дзейснай цэлебрацыі Эўхарыстыі71. «У касцёльным служэнні пасвячанага святара ёсць сам Хрыстус, які прысутны ў сваім Касцёле, як Галава свайго цела, Пастыр сваёй паствы, Найсвяцейшы Святар збаўчай ахвяры»72. Бясспрэчна, пасвячаны святар «дзейнічае таксама ад імя ўсяго Касцёла, калі прадстаўляе Богу малітву Касцёла і, асаблівым чынам, калі здзяйсняе эўхарыстычную Ахвяру»73. Таму неабходна, каб святары ўсвядомілі, што іх служэнне ніколі не павінна ставіць на першае месца іх саміх, ці іх погляды, але Езуса Хрыста. Супярэчыць святарскай тоеснасці кожная спроба паставіць саміх сябе галоўнымі дзеючымі асобамі літургічнага дзеяння. Святар, больш, чым хто-небудзь, ёсць слугой і павінен абавязацца няспынна быць знакам, які, як паслухмяная прылада ў руках Хрыста, адсылае да Яго. Гэта выяўляецца асаблівым чынам у пакоры, з якой святар кіруе літургічным дзеяннем, у паслухмянасці абраду, служачы яму сэрцам і розумам, пазбягаючы ўсяго, што стварае ўражанне недарэчнага вынясення сябе на першае месца. Таму заклікаю духавенства пастаянна паглыбляць разуменне ўласнага эўхарыстычнага служэння, як пакорнай паслугі Хрысту і ўсяму Касцёлу. Святарства, як казаў св. Аўгустын, з'яўляецца *amoris officium*74, абавязкам добрага пастыра, які ахвяруе жыццё за авечак (пар. Ян 10, 14-15).

### *Эўхарыстыя і святарскі цэлібат*

24. Айцы Сіноду хацелі падкрэсліць, што службовае святарства патрабуе поўнага прыпадаблення Хрысту праз пасвячэнне. Шануючы розныя практыкі і ўсходнюю традыцыю,

неабходна пацвердзіць глыбокі сэнс святарскага цэлібату, які справядліва лічыцца бясцэнным багаццем, што пацверджана таксама ва ўсходняй практыцы выбіраць біскупаў сярод тых, хто жыве ў цэлібаце і глыбока шануе выбар цэлібату, зроблены многімі прэзбітэрамі. У гэтым выбары святара асабліва выяўляецца адданасць, якая прыпадабняе яго да Хрыста, і выключны дар з сябе самога для Божага Валадарства75. Тое, што сам Хрыстус, вечны святар, выконваў сваю місію аж да ахвяры на крыжы ў стане нявіннасці, з'яўляецца падставай для зразумення сэнсу гэтай традыцыі лацінскага Касцёла. Таму недастаткова разумець святарскі цэлібат тэрмінамі выключна функцыянальнымі. У рэчаіснасці цэлібат з'яўляецца асаблівым прыпадабненнем да вобраза жыцця самога Хрыста. Такі выбар з'яўляецца перш за ўсё шлюбным; гэта атаясамленне з сэрцам Хрыста Абранніка, які аддае жыццё за сваю абранніцу. У адзінстве з вялікімі касцёльнымі традыцыямі, з Другім Ватыканскім Саборам76 і з Найвышэйшымі Пантыфікамі, маімі папярэднікамі77, яшчэ раз пацвярджаю прыгажосць і значнасць святарскага жыцця, пражытага ў цэлібаце, як выразны знак поўнай і выключнай адданасці Хрысту, Касцёлу і Божаму Валадарству. Таму пацвярджаю абавязковасць цэлібату для лацінскай традыцыі. Святарскі цэлібат, пражыты ў сталасці, радасці і адданасці, з'яўляецца найвялікшым благаслаўленнем для Касцёла і ўсяго грамадства.

***Недахоп духавенства і пастырства пакліканняў***

25. Адносна сувязі паміж сакрамэнтамі пасвячэння і Эўхарыстыяй Сінод затрымаўся над цяжкай сітуацыяй, якая склалася ў розных дыяцэзіях, у якіх не хапае святароў. Гэта адбываецца не толькі на тэрыторыях першай евангелізацыі, але таксама ў шматлікіх краінах з працяглай хрысціянскай традыцыяй. Безумоўна, карысным у вырашэнні праблемы ёсць больш раўнамернае размеркаванне духавенства. Таму неабходна салідная праца для абуджэння асабістай уражлівасці. Біскупам варта заахвочваць да ўдзелу ў пастырстве іствтуты кансэкраванага жыцця і новыя эклезіяльныя супольнасці, ушаноўваючы іх уласныя харызмы. Варта таксама заахвочваць усіх духоўных да большай гатоўнасці дапамагаць у служэнні Касцёлу там, дзе гэта неабходна, нават коштам ахвяры78. Акрамя таго падчас Сіноду абмяркоўвалася пастырская стараннасць, якая павінна ажыццяўляцца дзеля садзейнічання, асабліва сярод моладзі, унутранай адкрытасці на пакліканне да святарства. Такія сітуацыі не могуць вырашацца толькі  простымі прагматычнымі метадамі. Біскупам неабходна пазбягаць, пад уплывам зразумелай функцыянальнай заклапочанасці з прычыны недахопу духавенства, невыканання адпаведнага распазнання пакліканняў і допушчэння да спецыяльнай фармацыі і пасвячэння кандыдатаў, якія не валодаюць неабходнымі для святарскага служэння якасцямі79. Прадстаўнік духавенства, недастаткова сфармаваны і допушчаны да пасвячэння без належнага распазнання, з цяжкасцю зможа даваць сведчанне, здольнае абудзіць у іншых жаданне велікадушна адказаць на заклік Хрыста. Пастырства пакліканняў павінна заахвочваць да ўдзелу ў сваёй працы ўсю хрысціянскую супольнасць80. Зразумела, у гэтай адказнай пастырскай працы мае месца таксама заданне павялічваць адчувальнасць сем'яў, часта абыякавых, а нават варожа настаўленых да

магчымасці святарскага паклікання. Ім варта з велікадушнасцю адкрыцца на дар жыцця і выхоўваць дзяцей, быць адкрытымі на волю Божую. Сцісла кажучы, неабходна перш за ўсё мець адвагу прапанаваць моладзі радыкальнасць наследавання Хрыста, паказваючы ім яго прывабнасць.

### *Удзячнасць і надзея*

26. Нарэшце, неабходна мець бóльшую веру і надзею на Божую ініцыятыву. Нават, калі ў некаторых мясцовасцях назіраецца недахоп духавенства, не павінна змяншацца ўпэўненасць, што Хрыстус працягвае клікаць мужчын, якія, пакінуўшы ўсялякія іншыя справы, цалкам аддадуць сябе цэлебрацыі святых таямніц, абвяшчэнню Евангелля і пастырскаму служэнню. У сувязі з гэтым хачу выразіць удзячнасць усяго Касцёла за ўсіх біскупаў і прэзбітэраў, якія з вернай адданасцю і стараннасцю ажыццяўляюць сваю місію. Безумоўна, падзяка Касцёла скіравана таксама да дыяканаў, на якіх былі ўскладзены рукі «не для святарства, а для служэння»81. Згодна з рэкамендацыяй сінадальнага сходу выказваю асаблівую падзяку прэзбітэрам *fidei donum*, якія з кампетэнцыяй і велікадушнай адданасцю будуюць супольнасць, абвяшчаючы ёй Божае слова і ламаючы Хлеб жыцця, не шкадуючы сілаў у служэнні місіі Касцёла82. Неабходна дзякаваць Богу за шматлікіх святароў, якія цярпелі аж да ахвяры жыцця, каб служыць Хрысту. У іх, у іхніх чынах выяўляецца, што значыць быць святаром да самага канца. Гаворка ідзе аб хвалюючых сведчаннях, якія могуць натхняць шматлікую моладзь наследаваць Хрыста і аддаць сваё жыццё для іншых, знаходзячы праз гэта сапраўднае жыццё.

## V. Эўхарыстыя і сужэнства

### *Эўхарыстыя – шлюбны сакрамэнт*

27. Эўхарыстыя, сакрамэнт любові, паказвае асаблівую сувязь з любоўю паміж мужчынам і жанчынай, з’яднаных у сужэнстве. Паглыбленне гэтай сувязі – гэта неабходнасць нашага часу83. Папа Ян Павел II шмат разоў меў магчымасць пацвердзіць шлюбны характар Эўхарыстыі і яе асаблівую сувязь з сакрамэнтам сужэнства: «Эўхарыстыя – гэта сакрамэнт нашага адкуплення. Гэта сакрамэнт Абранніка і абранніцы»84. Урэшце, «усё хрысціянскае жыццё адзначаецца абранніцкай любоўю Хрыста і Касцёла. Ужо хрост, які далучае да Божага народу, выяўляе шлюбную таямніцу. Гэта, так бы мовіць, шлюбная купель, якая папярэднічае вясельнай гасціне – Эўхарыстыі»85. Эўхарыстыя бясконца ўзмацняе непарыўнае адзінства і любоў кожнага хрысціянскага сужэнства. У ім моцай сакрамэнту сужэнскі вузел па сутнасці звязаны з эўхарыстычным адзінствам паміж Хрыстом- Абраннікам і Касцёлам-абранніцай (пар. Эф 5, 31-32). Узаемная згода, якой муж і жонка абменьваюцца ў Хрысце і якая стварае з іх адзінства жыцця і кахання, мае таксама эўхарыстычнае вымярэнне. У тэалогіі св. Паўла сужэнская любоў ёсць сакрамэнтальным знакам любові Хрыста да свайго Касцёла, любові, якая дасягае сваёй кульмінацыі на Крыжы, які з’яўляецца

выразам Яго «шлюбу» з чалавецтвам і адначасова вытокам і цэнтрам Эўхарыстыі. Таму Касцёл выражае асаблівую духоўную блізкасць да ўсіх, хто заснаваў сваю сям'ю на сакрамэнце сужэнства86. Сям'я – хатні Касцёл87 – гэта галоўнае асяроддзе жыцця Касцёла, асабліва з увагі на яе важную ролю ў хрысціянскім выхаванні дзяцей88. У гэтым кантэксце Сінод заклікаў таксама распазнаваць асаблівую місію жанчыны ў сям'і і грамадстве, місію, якую неабходна абараняць, захоўваць і падтрымліваць89. Яе становішча як жонкі і маці ўяўляе неад'емную рэчаіснасць, якую ніколі нельга абмінаць і абясцэньваць.

*Эўхарыстыя і адзінства сужэнства*

28. Менавіта ў святле гэтых унутраных адносінаў паміж сужэнствам, сям'ёй і Эўхарыстыяй можна разглядаць некаторыя пастырскія праблемы. Адданая, непарыўная і выключная сувязь, якая яднае Хрыста і Касцёл і якая знаходзіць сакрамэнтальнае выяўленне ў Эўхарыстыі, сутыкаецца з першаснай антрапалагічнай звесткай, згодна з якой мужчына павінен быць канчаткова з'яднаны з адной толькі жанчынай і наадварот (пар. Ян 2, 24; Мц 19,5). У гэтай перспектыве Сінод Біскупаў разглядаў тэму пастырскай практыкі адносна тых, хто сустракаецца з абвяшчэннем Евангелля  і хто паходзіць з культур, у якіх практыкуецца палігамія. Тым, хто трапляе ў такую сітуацыю і хоча прыняць хрысціянскую веру, трэба дапамагчы спалучыць сваю жыццёвую праграму з радыкальнай навізной у Хрысце. Падчас падрыхтоўкі да прыняцця хросту Хрыстус сустракае іх у іхніх спецыфічных умовах і заклікае да поўнай праўды пра любоў, да якой можна дайсці праз неабходныя адрачэнні, маючы на ўвазе дасканалую эклезіяльную еднасць. Касцёл ахоплівае іх пастырствам, поўным пяшчоты, а разам з тым і цвёрдасці90, паказваючы ім у першую чаргу святло, што выпраменьвае з таямніц хрысціянскай веры на натуру чалавека і на яго пачуцці.

*Эўхарыстыя і непарыўнасць сужэнства*

29. Калі Эўхарыстыя выражае незваротнасць любові Бога ў Хрысце да свайго Касцёла, тады зразумела навошта любоў утрымлівае, у адносінах да сакрамэнту сужэнства, тую непарыўнасць, якой прагне кожная сапраўдная любоў91. Таму вельмі справядлівай ёсць пастырская ўвага, якую Сінод прысвяціў балючым сітуацыям, у якіх аказваецца нямала вернікаў, якія пасля заключэння сакрамэнту сужэнства разводзяцца і заключаюць новае сужэнства. Гаворка ідзе пра складаную і далікатную пастырскую праблему, пра сапраўднае бедства сённяшніх грамадскіх адносінаў, якое закранае таксама ўсё больш і каталіцкае асяроддзе. Пастыры дзеля любові да праўды абавязаны добра распазнаваць розныя сітуацыі, каб адпаведным чынам дапамагчы духоўна такім асобам92. Сінод Біскупаў пацвердзіў практыку Касцёла, заснаваную на Святым Пісанні (пар. Мк 10, 2-12), не дапускаць да сакрамэнтаў разведзеных і тых, хто зноў заключыў сужэнства, таму што іх стан і ўмовы іхняга жыцця аб'ектыўна супярэчаць таму адзінству любові паміж Хрыстом і Касцёлам, якая адзначаецца і ажыццяўляецца ў Эўхарыстыі. Аднак, нягледзячы на іх сітуацыю, разведзеныя і тыя, хто заключыў новае сужэнства, надалей належаць да Касцёла,

якія з асаблівай увагай ім спадарожнічае ў іх жаданні, наколькі гэта магчыма, весці хрысціянскі стыль жыцця, прымаючы ўдзел у св. Імшы, хоць і не прымаючы св. Камуніі, у слуханні Божага слова, у эўхарыстычнай адарацыі, малітве, у жыцці супольнасці, ведучы даверлівы дыялог са святаром або духоўным настаўнікам, прысвячаючы сябе дзейснай любові, справам дабрачыннасці, абавязку выхавання дзяцей.

Там, дзе паўстаюць слушныя сумненні адносна сапраўднасці заключанага сакрамэнтальнага сужэнства, павінна рабіцца ўсё, што неабходна для вызначэння іх верагоднасці. Неабходна гарантаваць, з поўным захаваннем кананічнага права93, прысутнасць на дадзенай тэрыторыі касцёльных трыбуналаў, іх пастырскі характар, правільную і хуткую дзейнасць94. Неабходна, каб у кожнай дыяцэзіі была дастатковая колькасць кваліфікаваных асобаў для спраўнага функцыянавання касцёльных трыбуналаў. Нагадваю, што «сур’ёзным абавязкам з’яўляецца імкненне ўсё больш наблізіць да вернікаў інстытуцыйную дзейнасць Касцёла ў трыбуналах»95. Аднак неабходна пазбягаць разумення пастырскага клопату, быццам бы ён супярэчыў праву. Трэба хутчэй зыходзіць з перадумовы, што асноўным пунктам сутыкнення права і пастырства з’яўляецца *любоў дзеля праўды*: яна ж ніколі не бывае абстрактнай, але «выяўляецца ў чалавечым і хрысціянскім шляху кожнага верніка»96. Нарэшце, калі несапраўднасць сужэнства непрызнаная і ёсць аб’ектыўныя акалічнасці, якія сапраўды робяць сумеснае жыццё незваротным, Касцёл падбадзёрвае гэтых вернікаў перажываць свой новы саюз, згодна з патрабаваннямі Божага закону, як сябры, як брат і сястра; так змогуць зноў наблізіцца да эўхарыстычнага стала, захоўваючы патрабаванні, прадугледжаныя праверанай пастырскай практыкай. Гэты шлях, паколькі з’яўляецца магчымым і прыносіць плён, павінен падтрымлівацца пастырамі і адпаведнымі касцёльнымі ініцыятывамі, пазбягаючы, у кожным выпадку, благаслаўлення гэтых адносінаў, каб сярод вернікаў не з’явілася замяшанне адносна каштоўнасці сужэнства97.

Зважаючы на складанасць культурнага кантэксту, у якім жыве Касцёл у многіх краінах, Сінод заклікае да максімальнай пастырскай апекі ў падрыхтоўцы пар да сужэнства і ў папярэднім кантролі іх перакананняў адносна неад’емных абавязкаў, якія ўплываюць на сапраўднасць сакрамэнту сужэнства. У сувязі з гэтым распазнаванне можа дапамагчы пазбегнуць таго, каб эмацыянальныя пачуцці або легкадумныя меркаванні схілілі двух маладых людзей узяць на сябе адказнасць, якую пазней не змогуць выканаць98. Вельмі вялікім з’яўляецца дабро, якога Касцёл і ўсё грамадства чакаюць ад сужэнства і заснаванай на ім сям’і. Таму неабходна распачаць працу ў гэтай асаблівай пастырскай сферы. Сужэнства і сям’я – гэта інстытуты, якія трэба падтрымліваць і абараняць ад кожнай магчымай двузначнасці адносна іх праўды, таму што нанесеная ім шкода па сутнасці раніць чалавечае суіснаванне.

## Эўхарыстыя і эсхаталогія

*Эўхарыстыя: дар чалавеку на ягоным шляху*

30. Калі праўда, што сакрамэнты з’яўляюцца рэчаіснасцю, якая належыць Касцёлу, што пілігрымуе ў часе99 да поўнага выяўлення перамогі ўваскрослага Хрыста, то праўда і тое, што асабліва ва эўхарыстычнай літургіі нам дадзена папярэдне смакаваць эсхаталагічнае спаўненне, да якога ідзе кожны чалавек і ўсё стварэнне (пар. Рым 8, 19 і нас.). Чалавек створаны для сапраўднага і вечнага шчасця, якое можа даць яму толькі любоў Бога. Але нашая зраненая свабода загубілася б, калі б не было магчымым ужо сёння спазнаць штосьці з будучага здзяйснення. Зрэшты, кожны чалавек, каб мог рухацца ў правільным кірунку, мае патрэбу быць скіраваным да канчатковай мэты. Гэтай канчатковай мэтай з’яўляецца сам Хрыстус Пан, пераможца граху і смерці, які асаблівым чынам становіцца прысутным для нас у эўхарыстычнай цэлебрацыі. Так, з’яўляючыся пакуль «чужаземцамі і пілігрымамі» (1 П 2, 11) у гэтым свеце, у веры мы ўжо ўдзельнічаем у паўнаце ўваскрослага жыцця. Эўхарыстычная гасціна, адкрываючы сваё сціслае эсхаталагічнае вымярэнне, прыходзіць на дапамогу нашай свабодзе.

*Эсхаталагічная гасціна*

31. Разважаючы над гэтай таямніцай, можам сказаць, што Езус сваім прыйсцем увайшоў у адносіны з чаканнямі ізраэльскага народу, усяго чалавецтва і, больш глыбока, усяго стварэння. Дарам з самога сябе Ён аб’ектыўна распачаў эсхаталагічны час. Хрыстус прыйшоў сабраць рассеяны Божы народ (пар. Ян 11, 52), выразна адкрываючы намер сабраць супольнасць запавету, каб здзейсніць абяцанні Бога, дадзеныя праайцам (пар. Ер 23,3; 31,10; Лк 1, 55.70). У пакліканні Дванаццаці, што належыць звязаць з дванаццацю плямёнамі Ізраэля, і ў наказе, даручаным ім падчас Апошняй Вячэры, перад сваёй збаўчай мукай, каб яны цэлебравалі яе ў Яго памяць, Езус паказаў, што хоча перадаць усёй супольнасці, якую Ён заснаваў, заданне быць у гісторыі знакам і прыладай эсхаталагічнай сустрэчы, распачатай у Ім. Таму ў кожнай эўхарыстычнай цэлебрацыі здзяйсняецца эсхаталагічная сустрэча Божага народу. Эўхарыстычная гасціна з’яўляецца для нас сапраўдным прадказаннем апошняй гасціны, прадказанай прарокамі (пар Іс 25, 6-9) і апісанай у Новым Запавеце як «вяселле Ягняці» (Ап 19, 7.9), якая цэлебруецца ў радаснай еднасці святых100.

*Малітва за памерлых*

32. Эўхарыстычная цэлебрацыя, у якой мы абвяшчаем смерць Пана, вызнаём Яго ўваскрасенне і чакаем Яго прыйсця, з’яўляецца задаткам будучай хвалы, у якой таксама і нашы целы будуць праслаўлены. Цэлебруючы ўспамін нашага збаўлення, узмацняецца ў нас надзея на ўваскрашэнне цела і на магчымасць сустрэцца наноў тварам у твар з тымі, хто адышоў перш за нас у знаку веры. У гэтым кантэксце разам з Айцамі Сіноду хацеў бы нагадаць усім вернікам значэнне малітвы за памерлых, асабліва цэлебрацыі за іх св.

Імшы101, каб, ачышчаныя, яны маглі дасягнуць благаслаўлёнага бачання Бога. Адкрываючы эсхаталагічнае вымярэнне, заключанае ў Эўхарыстыі, цэлебраванай і адараванай, мы атрымліваем падтрымку на нашым шляху і суцяшэнне надзеяй хвалы (пар. Рым 5, 2; Ціт 2,13).

## Эўхарыстыя і Дзева Марыя

33. З сувязі паміж Эўхарыстыяй і асобнымі сакрамэнтамі і з эсхаталагічнага значэння святых таямніц паўстае цэласны вобраз хрысціянскага існавання, пакліканага ў кожным моманце да духоўнага культу праз прыемную Богу ахвяру з самога сябе. Калі праўда, што ўсе мы знаходзімся на шляху да поўнага здзяйснення нашай надзеі, то гэта не пазбаўляе магчымасці ўжо цяпер з удзячнасцю бачыць, што тое, чым адарыў нас Бог, знаходзіць дасканалае здзяйсненне ў Дзеве Марыі, Маці Бога і нашай Маці: яе Унебаўзяцце з целам і душой з'яўляецца для нас знакам упэўненай надзеі, паколькі указвае нам, пілігрымам у часе, тую эсхаталагічную мэту, якую сакрамэнт Эўхарыстыі дае нам ужо зараз папярэдне смакаваць.

У Найсвяцейшай Марыі бачым дасканалае здзяйсненне сакрамэнтальнага дзеяння, праз якое Бог дасягае і ўключае ў сваю збаўчую ініцыятыву чалавечае стварэнне. Ад Звеставання да Спаслання Духа Святога Марыя з Назарэта паказваецца як асоба, чыя свабода з'яўляецца цалкам адкрытай на волю Бога. Яе Беззаганнае Зачацце выяўляецца менавіта ў яе безумоўнай пакоры Божаму слову. Паслухмяная вера – гэта пастава, якую Яна прымае ў сваім жыцці ў кожнае імгненне адносна Божага дзеяння. Заслуханная Дзева жыве ў поўнай гармоніі з Божай воляй; захоўвае ў сваім сэрцы словы, якія паходзяць ад Бога і, састаўляючы іх разам як у мазаіцы, вучыцца больш глыбокаму іх разуменню (пар. Лк 2, 19. 51); Марыя мае вялікую веру. Яна з поўным даверам аддае сябе ў рукі Бога, давяраючыся Яго волі102. Гэтая таямніца ўзрастае аж да поўнага ўдзелу Марыі ў збаўчай місіі Езуса. Як пацвердзіў Другі Ватыканскі Сабор, «благаслаўлёная Дзева ішла наперад у пілігрымцы веры і верна захоўвала сваю еднасць з Сынам аж да крыжа, дзе Яна стаяла згодна з Божым намерам (пар Ян 19, 25), і найбольш глыбока супрацоўнічала са сваім Адзінародным і злучылася мацярынскім духам з Яго ахвярай, з любоўю згаджаючыся на ахвяраванне народжанай з Яе Жэртвы; і, нарэшце, праз таго ж Езуса Хрыста, паміраючага на крыжы, была дадзена ў якасці маці вучню: "Жанчына, вось сын твой" (пар. Ян 19, 26-27)»103. Ад Звеставання аж да Крыжа Марыя з'яўляецца той, якая прымае Слова, што сталася ў Ёй целам. Яна трывае з Ім ў еднасці аж да таго моманту, калі Яно замаўкае ў цішыні смерці. Урэшце, гэта яна прымае ў свае рукі прынесенае ў ахвяру цела, цяпер ужо нежывое, таго, хто сапраўды палюбіў сваіх «аж да канца» (Ян 13,1).

Таму кожны раз, калі ў эўхарыстычнай літургіі мы набліжаемся да Цела і Крыві Хрыста, мы

кіруемся таксама да той, якая, цалкам злучаючыся з ахвярай Хрыста, прыняла яе для ўсяго Касцёла. Справядліва Айцы Сіноду пацвердзілі, што «Марыя дае пачатак удзелу Касцёла ў ахвяры Адкупіцеля»104. Яна, Беззаганная, безумоўна прымае дар Бога і такім чынам далучаецца да справы збаўлення. Марыя з Назарэта, вобраз Касцёла, які нараджаецца, з'яўляецца прыкладам, як кожны з нас павінен прыняць дар, які Езус робіць з сябе самога ў Эўхарыстыі.

ЧАСТКА ДРУГАЯ

## ЭЎХАРЫСТЫЯ, ЦЭЛЕБРАВАНАЯ ТАЯМНІЦА

***«Сапраўды, сапраўды кажу вам: не Майсей даў вам хлеб з неба,***
***але Айцец Мой дае вам сапраўдны хлеб з неба» (Ян 6, 32)***

### *Lex orandi і lex credendi*

34. Сінод Біскупаў шмат разважаў над унутранымі адносінамі паміж эўхарыстычнай верай і цэлебрацыяй, ясна раскрываючы сувязь паміж *lex orandi* і *lex credendi,* і падкрэсліваючы першынство *літургічнага дзеяння*. Неабходна разумець Эўхарыстыю як таямніцу веры, якая аўтэнтычна цэлебруецца з яснай свядомасцю, што «*intellectus fidei*заўсёды ёсць першапачатковым у адносінах да літургічнага дзеяння Касцёла»105. У гэтай сферы тэалагічнае разважанне не можа абмінуць сакрамэнтальны парадак, устаноўлены самім Хрыстом. З іншага боку літургічнае дзеянне не можа разглядацца агульна, не зважаючы на таямніцу веры. Крыніцай нашай веры і эўхарыстычнай літургіі сапраўды з'яўляецца адна і тая ж надзея: дар, які Хрыстус зрабіў з сябе самога ў Пасхальнай таямніцы.

### *Прыгажосць і літургія*

35. Сувязь паміж таямніцай, у якую верацць, і таямніцай, якую цэлебруюць, выяўляецца асабліва ў тэалагічнай і літургічнай каштоўнасці прыгажосці. Літургія, як зрэшты і хрысціянскае Аб'яўленне, мае ўнутраную сувязь з прыгажосцю: ёсць *veritatis splendor*, бляскам праўды. У літургіі ззяе Пасхальная таямніца, праз якую сам Хрыстус прыцягвае нас да сябе і кліча нас да камуніі. У Езусе, як звычайна казаў св. Бонавэнтура, мы сузіраем прыгажосць і ззянне вытокаў106. Гэты атрыбут, на які спасылаемся, не з'яўляецца толькі эстэтызмам, але спосабам, якім праўда пра Божую любоў у Хрысце дасягае нас, прываблівае і захапляе, схіляючы нас адарвацца ад нас саміх і такім чынам прыцягваючы нас да нашага сапраўднага паклікання: любові107. Ужо ў створаным свеце Бог дае

распазнаць сябе праз прыгажосць і гармонію сусвету (пар. Мдр 13,5; Рым 1, 19-20). Затым у Старым Запавеце мы сустракаем шматлікія знакі бляску магутнасці Бога, якая праяўляе сваю хвалу праз цуды, учыненыя сярод выбранага народу (пар. Зых 14; 16,10; 24, 12-18; Ліч 14, 20-23). У Новым Запавеце канчаткова здзяйсняецца гэтая эпіфанія прыгажосці ў аб’яўленні Бога ў Езусе Хрысце108. Ён з’яўляецца поўным адлюстраваннем Божай хвалы. Ва ўсхваленні Сына ззяе і перадаецца хвала Айца (пар. Ян 1,14; 8, 54; 12, 28; 17, 1). Тым не менш гэтая прыгажосць не з’яўляецца простай гармоніяй формы; «найпрыгажэйшы з сыноў чалавечых» (Пс 45 (44), 3) ёсць таксама таямнічым чынам тым, хто «не меў ... ні хараства, ні прыгажосці, каб мы паглядзелі на яго; і не меў выгляду, каб прывабіць нас» (Іс 53, 2). Езус Хрыстус паказвае як праўда любові можа перамяніць цёмную таямніцу смерці ў свет увасрасення. Тут ззянне хвалы Бога пераўзыходзіць усялякую ўнутраную прыгажосць сусвету. Сапраўднай прыгажосцю з’яўляецца любоў Бога, якая канчаткова аб’явілася нам ў Пасхальнай таямніцы.

Прыгажосць літургіі – гэта частка гэтай таямніцы; яна з’яўляецца найвышэйшым выразам хвалы Бога і ў пэўным сэнсе з’яўляецца на зямлі водблескам Неба. Успамін збаўчай ахвяры мае ў сабе рысы той прыгажосці Езуса, аб якой Пётр, Якуб і Ян далі нам сведчанне, калі Настаўнік на шляху ў Ерузалем перамяніўся перад імі (пар. Мк 9, 2). Таму прыгажосць не з’яўляецца дэкаратыўным фактарам літургічнага дзеяння; хутчэй яна з’яўляецца складовым элементам, паколькі ёсць атрыбутам самога Бога і Яго Аб’яўлення. Усё гэта павінна нас зрабіць свядомымі, як трэба клапаціцца, каб літургічнае дзеянне ззяла згодна сваёй уласнай натуры.

**Эўхарыстычная цэлебрацыя – справа «Christus totus»**

***Christus totus in capite et in corpore***

36. Унутраная прыгажосць літургіі заключана ў Хрысце, уваскрослым і праслаўленым у Духу Святым, які ўводзіць Касцёл у сваё дзеянне109. У гэтай перспектыве варта ўзгадаць словы св. Аўгустына, які апісвае гэтую дынаміку веры, уласцівую Эўхарыстыі. Вялікі святы з Гіпоны менавіта ў адносінах да эўхарыстычнай таямніцы падкрэслівае, як сам Хрыстус прыпадабняе нас да сябе: «Гэты хлеб, што бачыце на алтары, асвячаны Божым словам і з’яўляецца Целам Хрыста. Келіх, ці дакладней тое, што ён утрымлівае, асвячанае Божым словам, – гэта Кроў Хрыста. У гэтых знаках Хрыстус Пан захацеў даць нам сваё Цела і сваю Кроў, якую праліў за нас дзеля адпушчэння грахоў. Калі вы прынялі іх добра, то вы самі з’яўляецеся тым, што прынялі»110. Таму «не толькі сталі мы хрысціянамі, але сталі самім Хрыстом»111. Адгэтуль можам сузіраць таямнічае дзеянне Бога, якое выклікае глыбокае адзінства паміж намі і Панам Езусам: «Не можа Хрыстус быць галавой і не прысутнічаць ў целе, але Ён увесь ёсць галавой і целам»112.

***Эўхарыстыя і ўваскрослы Хрыстус***

37. Паколькі эўхарыстычная літургія ёсць па сутнасці *actio Dei*, якая далучае нас да Езуса з дапамогай Духа, то яе аснова не з'яўляецца ў веданні нашай волі і не можа падлягаць уздзеянню часовай моды. Бясспрэчным з'яўляецца сцвярджэнне св. Паўла: «Ніхто не можа пакласці іншага падмурку, акрамя пакладзенага, якім ёсць Езус Хрыстус» (1 Кар 3, 11). І зноў Апостал народаў запэўнівае нас, што ў адносінах да Эўхарыстыі, ён не перадае нам сваё асабістае вучэнне, але тое, якое ў сваю чаргу атрымаў (пар. 1 Кар 11, 23). Цэлебрацыя Эўхарыстыі ўтрымлівае жывую Традыцыю. Касцёл цэлебруе эўхарыстычную Ахвяру ў паслухмянасці наказу Хрыста, пачынаючы ад сустрэчы з Уваскрослым і праліцця Духа Святога. З гэтай прычыны хрысціянская супольнасць з самага пачатку яднаецца для *fractio panis* у дзень Пана. Дзень, у які Хрыстус уваскрос з памерлых, нядзеля, з'яўляецца таксама першым днём тыдня, тым, у якім старадаўняя традыцыя бачыла пачатак стварэння. Дзень стварэння стаў сёння днём «новага стварэння», днём нашага вызвалення, у які мы ўспамінаем Хрыста памерлага і ўваскрослага113.

## Ars celebrandi

38. У сінадальных працах шмат разоў падкрэслівалася неабходнасць пераадолення кожнага магчымага падзелу паміж *ars celebrandi*, або мастацтва правільнага цэлебравання, і поўным удзелам усіх вернікаў, актыўным і плённым. Першае, што спрыяе ўдзелу Божага народу ў святым абрадзе – гэта яго адпаведная цэлебрацыя. *Ars celebrandi* з'яўляецца найлепшай умовай для *actuosa participatio*114. *Ars celebrandi* выплывае з вернай паслухмянасці літургічным нормам у іх паўнаце, таму што менавіта гэты спосаб цэлебрацыі забяспечвае на працягу двух тысяч год жыццё веры ўсіх вернікаў, якія пакліканы да ўдзелу ў цэлебрацыі як Божы народ, каралеўскае святарства, народ святы(пар. 1 П 2, 4-5. 9)115.

### *Біскуп – найвышэйшы літург*

39. Ёсць праўдай, што ўвесь Божы народ удзельнічае ва эўхарыстычнай літургіі, аднак, што датычыць правільнага *ars celebrandi*, неад'емнае заданне належыць тым, хто атрымаў сакрамэнт пасвячэння. Біскупы, святары і дыяканы, кожны паводле сваёй ступені, павінны лічыць цэлебрацыю сваім першасным абавязкам116. Перш за ўсё дыяцэзіяльны біскуп, «першы служыцель Божых таямніцаў у даручаным яму мясцовым Касцёле, накіроўвае, развівае і ахоўвае ўсё літургічнае жыццё»117. Гэта ўсё з'яўляецца важным для жыцця мясцовага Касцёла не толькі таму, што еднасць з біскупам ёсць умовай таго, каб кожная цэлебрацыя на дадзенай тэрыторыі была сапраўднай, але таксама таму, што ён сам з'яўляецца найдасканалейшым літургам дадзенага Касцёла118. Ён павінен сцерагчы гарманічнае адзінства цэлебрацыі ў сваёй дыяцэзіі. Таму біскуп абавязаны «клапаціцца пра тое, каб прэзбітэры, дыяканы і свецкія вернікі Хрыстовыя глыбей спасціглі сапраўдны сэнс абрадаў і літургічных тэкстаў і праз гэта заахвочваліся да чыннай і плённай цэлебрацыі

Эўхарыстыі»119. Асабліва заклікаю чыніць усё, што неабходна для таго, каб літургічныя цэлебрацыі, якія здзяйсняе біскуп у катэдральным Касцёле, адбываліся ў поўнай згоднасці з *ars celebrandi*, каб маглі быць узорам для ўсіх касцёлаў, размешчаных на дадзенай тэрыторыі120.

### *Павага да літургічных кніг і багацце знакаў*

40. Падкрэсліваючы значэнне *ars celebrandi*, раскрываецца значэнне літугргічных норм121. *Ars celebrandi* павінна спрыяць развіццю пачуцця *sacrum* і выкарыстанню тых знешніх форм, якія развіваюць гэтае пачуццё як, напрыклад, гармонія абраду, літургічнае адзенне, прадметы культу і святое месца. Эўхарыстычная цэлебрацыя прыносіць карысць там, дзе святары і адказныя за літургічнае пастырства руляцца аб тым, каб знаёміць з абавязковымі літургічнымі кнігамі і з адпаведнымі нормамі, звяртаючы ўвагу на вялікія багацці *Агульных уводзінаў да Рымскага Імшала* і *Уводзінаў да імшальных чытанняў.* Часам лічыцца, што ў касцёльных супольнасцях іх ведаюць і сапраўды захоўваюць, але часта здараецца, што гэта не так. Ёсць тэксты, у якіх утрымліваюцца багацці, якія захоўваюць і выражаюць веру і шлях Божага народу на працягу яго двухтысячнай гісторыі. Настолькі ж важным для правільнага *ars celebrandi* з'яўляецца ўвага да ўсіх форм мовы, што прадугледжаны літургіяй: слова і спеў, жэсты і маўчанне, рух цела, літургічныя колеры і прадметы. Літургія па сваёй сутнасці валодае разнастайнымі сродкамі камунікацыі, якія дазваляюць актывізаваць усю чалавечую істоту. Прастата жэстаў і ўмеркаванасць знакаў, устаноўленых у прадугледжаным парадку і падчас літургіі, перадаюць і актывізуюць вернікаў больш, чым штучныя недарэчныя дадаткі. Уважлівасць і паслухмянасць адносна адпаведнай структуры абраду сведчыць пра разуменне характару Эўхарыстыі як невыказнага дару і выяўляюць волю цэлебранта прыняць з пакорнай удзячнасцю гэты невыказны дар.

### *Мастацтва ў служэнні цэлебрацыі*

41. Глыбокая сувязь паміж прыгажосцю і літургіяй патрабуе асаблівай увагі да ўсіх мастацкіх сродкаў, якія служаць цэлебрацыі122. Важным элементам сакральнага мастацтва з'яўляецца *архітэктура* касцёлаў123, якая павінна захоўваць адзінства паміж элементамі прэзбітэрыя: алтаром, крыжом, табернакулюмам, амбонай, крэсламі. У сувязі з гэтым неабходна памятаць, што мэта сакральнай архітэктуры – прадставіць Касцёлу, які цэлебруе таямніцы веры, асабліва Эўхарыстыю, найбольш прыдатнае месца для адпаведнага здзяйснення літургічнага дзеяння124. Характар хрысціянскай святыні падпарадкаваны самой літургіі, якая прадугледжвае сход вернікаў (*ecclesia*), якія з'яўляюцца жывымі камянямі святыні (пар. 1 П 2, 5).

Гэты самы прынцып датычыць усяго сакральнага мастацтва ўвогуле, асабліва жывапісу і скульптуры. Рэлігійная іканаграфія павінна быць арыентавана на сакрамэнтальную містагогію. Паглыбленае веданне форм, якія сакральнае мастацтва выпрацавала на працягу

стагоддзяў, можа вельмі дапамагчы тым, хто адказвае за заказ у архітэктараў і мастакоў мастацкіх твораў, звязаных з літургіяй. Таму неабходна, каб у фармацыю семінарыстаў і святароў была ўключана, у якасці важнай дысцыпліны, гісторыя мастацтва, асабліва што датычыць культавых пабудоў згодна з літургічнымі нормамі. Урэшце, неабходна, каб ва ўсім, што датычыць Эўхарыстыі, захоўвалася пачуццё прыгажосці. Трэба таксама захоўваць пашану і клапаціцца аб прадметах культу, упрыгожванне, сакральнае начынне, каб звязаныя гарганічным чынам і ўпарадкаваныя паміж сабой яны жывілі захапленне Божай таямніцай, выяўлялі адзінства веры і ўзмацнялі пабожнасць125.

***Літургічны спеў***

42. У *ars celebrandi* значнае месца займае літургічны спеў126. Справядліва сцвярджае св. Аўгустын у сваім вядомым казанні: «Новы чалавек ведае новы спеў. Спеў – з’яўляецца выразам радасці. Калі ўдумаемся глыбей, то сцвердзім, што гэта выраз любові»127. Божы народ, сабраны на цэлебрацыі, спявае хвалу Богу. Касцёл у сваёй двухтысячагадовай гісторыі стварыў і працягвае ствараць музыку і спеў, якія ўзбагачаюць спадчыну веры і любові, таму яны не павінны быць згублены. Не можам сказаць, што ў літургіі адзін спеў мае тое ж значэнне, што і іншы. У сувязі з гэтым неабходна пазбягаць агульнай імправізацыі ці ўвядзення музычных жанраў, якія прыніжаюць сэнс літургіі. Паколькі спеў з’яўляецца літургічным элементам, ён павінен далучацца да формы, уласцівай цэлебрацыі128. Таму ўсё – у тэксце, мелодыі, выкананні – павінна адпавядаць сэнсу цэлебраванай таямніцы, часткам абраду і літургічным перыядам129. Урэшце, ушаноўваючы розныя кірункі і розныя дастаткова пахвальныя традыцыі, прагну, як прасілі Айцы Сіноду, каб адпаведна дацэньваўся грыгарыянскі спеў130, як уласцівы спеў рымскай літургіі131.

## Структура эўхарыстычнай цэлебрацыі

43. Пасля таго, як нагадаў галоўныя элементы *ars celebrandi*, якія выявіліся ў сінадальных працах, хацеў бы звярнуць асаблівую ўвагу на некаторыя часткі структуры эўхарыстычнай цэлебрацыі, якія ў наш час патрабуюць асаблівага клопату дзеля захавання іх вернасці глыбокім намерам літургічнай адновы, пажаданай Другім Ватыканскім Саборам, у непарыўнасці з усёй вялікай традыцыяй Касцёла.

***Унутранае адзінства літургічных дзеянняў***

44. Перш за ўсё неабходна паразважаць над унутраным адзінствам абраду св. Імшы. Неабходна пазбягаць, ці то ў катэхезах ці ў спосабе цэлебрацыі, стварэння ўражання супрацьпастаўлення дзвюх частак абраду. Літургія слова і эўхарыстычная літургія – па-за ўступным абрадам і абрадам заканчэння – «так цесна звязаны між сабою, што ўтвараюць

адно культавае дзеянне»132. Існуе ўнутраная сувязь паміж Божым словам і Эўхарыстыяй. Праз слуханне Божага слова нараджаецца і ўзмацняецца вера (пар. Рым 10, 17); у Эўхарыстыі слова, якое сталася целам, даецца нам як духоўны спажытак133. Такім чынам «з двух сталоў – Божага слова і Цела Хрыста – Касцёл атрымлівае і дае вернікам Хлеб жыцця»134. Таму неабходна пастаянна памятаць, што Божае слова, чытанае Касцёлам і абвешчанае ў літургіі, вядзе да Эўхарыстыі як да сваёй уласцівай мэты.

### *Літургія слова*

45. Разам з Сінодам прашу, каб літургія слова належна ўспрымалася і была заўсёды належным чынам падрыхтавана. Таму горача заклікаю, каб у літургіях вялікая ўвага надавалася абвяшчэнню Божага слова добра прыгатаванымі лектарамі. Ніколі не забывайма, што «калі ў Касцёле чытаецца Святое Пісанне, тады сам Бог прамаўляе да свайго народу, і Хрыстус, прысутны ў сваім слове, абвяшчае Евангелле»135. Калі дазваляюць абставіны, можна падумаць аб некалькіх уводных словах, якія дапамогуць вернікам нанава іх усвядоміць. Каб Божае слова было добра зразумета, яго неабходна слухаць і прымаць у духу Касцёла і з разуменнем яго адзінства з сакрамэнтам Эўхарыстыі. Слова, якое абвяшчаем і слухаем, з'яўляецца словам, якое сталася целам (пар. Ян 1, 14), і мае ўнутранае аднясенне да асобы Хрыста і да Яго сакрамэнтальнай прысутнасці. Хрыстус не кажа ў мінулым, а ў нашай сучаснасці як той, хто прысутнічае ў літургічным дзеянні. У гэтым сакрамэнтальным кантэксце хрысціянскага абнаўлення136 веданне і вывучэнне Божага слова дазваляе нам ацэньваць, цэлебраваць і лепш удзельнічаць у Эўхарыстыі. Таксама тут адкрываецца ва ўсёй сваёй праўдзе сцвярджэнне: «няведанне Пісання – гэта няведанне Хрыста»137. З гэтай мэтай неабходна дапамагчы вернікам дацаніць скарбы Святога Пісання, заключаныя ў Лекцыянарыі, праз пастырскія ініцыятывы, цэлебрацыі слова і малітоўныя чытанні (*lectio divina*). Акрамя таго, нельга забывацца пра формы малітвы, замацаваныя ў традыцыі: Літургія гадзінаў, асабліва Ютрань, Нешпары, Камплета і вігілійныя цэлебрацыі. Малітва псальмамі, біблійныя чытанні і чытанні, узятыя з вялікай традыцыі, прадстаўленай у Боскім Афіцыі,могуць прывесці да больш глыбокага разумення той падзеі, якой з'яўляецца Хрыстус, і эканоміі збаўлення, што ў сваю чаргу можа ўзбагаціць разуменне і ўдзел у эўхарыстычнай цэлебрацыі138.

### *Гамілія*

46. З увагі на значэнне Божага слова паўстае неабходнасць палепшыць якасць гаміліі. Яна з'яўляецца «часткай літургічнага дзеяння»139; павінна спрыяць больш поўнаму разуменню Божага слова і яго эфектыўнасці ў жыцці вернікаў. Таму пасвячаныя распарадчыкі павінны

«старанна рыхтаваць гамілію, абапіраючыся на адпаведным веданні Святога Пісання»140. Трэба пазбягаць гамілій агульных і абстрактных. Асабліва заклікаю духоўных, каб гамілія звязвала абвешчанае Божае слова з сакрамэнтальнай цэлебрацыяй141 і жыццём супольнасці такім чынам, каб Божае слова было сапраўднай падтрымкай для жыцця Касцёла142. Таму трэба памятаць пра катэхетычную і пабуджальную мэту гаміліі. Пажадана, зыходзячы з трохгадовага цыкла Лекцыянарыя, адпаведным чынам прапаноўваць вернікам тэматычныя гаміліі, у якіх на працягу літургічнага года закраналіся б галоўныя пытанні хрысціянскай веры згодна з аўтарытэтным навучаннем Настаўніцкага Інстытута Касцёла і на падставе чатырох «калон», вызначаных у «Катэхізісе Каталіцкага Касцёла» і ў нядаўна выдадзеным «Кампендыі»: на вызнанні веры, на цэлебрацыі хрысціянскай таямніцы, на жыцці ў Хрысце, на хрысціянскай малітве143.

### *Прыгатаванне дароў*

47. Айцы Сіноду звярнулі таксама ўвагу на прыгатаванне дароў. Гаворка ідзе не проста аб нейкім «перапынку» паміж літургіяй слова і эўхарыстычнай літургіяй. Такое разуменне аспрэчыла б сэнс адзінага абраду, складзенага з дзвюх звязаных паміж сабою частак. У гэтым простым і пакорным жэсце выяўляецца вельмі вялікае значэнне: у хлебе і віне, якія прыносім на алтар, Хрыстус Адкупіцель прымае ўсё стварэнне, каб яго перамяніць і ахвяраваць Айцу144. У гэтым сэнсе мы нясём на алтар таксама ўсе цярпенні і боль свету і верым, што ўсё з’яўляецца каштоўным у вачах Бога. Каб гэты жэст быў правільна зразуметы, ён не паінен празмерна падкрэслівацца дадаткамі. Гэты жэст дазваляе ацаніць першасны ўдзел, якога Бог чакае ад чалавека для здзяйснення ў ім Боскай справы, каб надаць такім чынам поўны сэнс чалавечай працы, якая праз эўхарыстычную цэлебрацыю яднаецца са збаўчай ахвярай Хрыста.

### *Эўхарыстычная малітва*

48. Эўхарыстычная малітва – «цэнтральная і кульмінацыйная частка ўсяго літургічнага дзеяння»145. Яе значэнне заслугоўвае адпаведнай увагі. Розныя эўхарыстычныя малітвы, якія змяшчаюцца ў Імшале, перададзены нам жывой традыцыяй Касцёла і адзначаюцца невычэрпным тэалагічным і духоўным багаццем. Вернікаў трэба вучыць цаніць іх. *Агульныя ўводзіны да Рымскага Імшала* нагадваюць нам асноўныя элементы кожнай эўхарыстычнай малітвы: падзяку, акламацыю, эпіклезу, апісанне ўстанаўлення і кансэкрацыю, анамнэзу, ахвяраванне, малітву заступніцтва і заключную даксалогію146. Асаблівым чынам эўхарыстычная духоўнасць і тэалагічнае разважанне будуць асветленыспасціжэннем глыбокага адзінства ў анафары (эўхарыстычнай малітве) паміж заклікам Духа Святога і словамі ўстанаўлення147, у якім «здзяйсняецца ахвяра, якую сам Хрыстус устанавіў на Апошняй Вячэры»148. «Касцёл просіць моц Духа Святога асвяціць дары, прынесеныя людзьмі, каб яны сталі Целам і Крывёю Хрыста, і каб беззаганная ахвяра, прынятая на Камуніі, паслужыла збаўленню тых, хто будзе ў ёй удзельнічаць»149.

### *Знак супакою*

49. Эўхарыстыя па сваёй сутнасці з'яўляецца сакрамэнтам спакою. Гэтае вымярэнне эўхарыстычнай таямніцы знаходзіць у літургічнай цэлебрацыі асаблівае адлюстраванне ў абрадзе перадачы знаку супакою. Гаворка несумненна ідзе пра знак вялікай каштоўнасці (пар. Ян 14, 27). У наш час, моцна насычаны канфліктамі, гэты жэст набывае, таксама паводле агульнага меркавання, асаблівае значэнне, паколькі Касцёл усё больш адчувае сваё жаданне прасіць Пана аб дары спакою і аб адзінстве для сябе і ўсёй чалавечай сям'і. Спакой з'яўляецца нястрыманым прагненнем кожнага сэрца. Касцёл выказвае просьбу аб спакоі і паяднанні, якая выходзіць з душы кожнага чалавека добрай волі, і скіроўвае яе да таго, хто «ёсць нашым спакоем» (Эф 2, 14) і хто можа прымірыць народы і асобы там, дзе безвыніковымі аказваюцца чалавечыя намаганні. З усяго гэтага становіцца зразумелым, чаму з такой інтэнсіўнасцю людзі адносяцца да абраду супакою ў літургічнай цэлебрацыі. Аднак, у сувязі з гэтым падчас Сіноду Біскупаў звернута была ўвага на стрыманасць гэтага жэсту, каб не быў празмерна выражаны, ствараючы некаторае замяшанне ў сходзе вернікаў адразу перад св. Камуніяй. Пажадана прыпомніць, што для захавання належнай атмасферы стрыманасць у гэтым жэсце неабходна. Гэта не зменшыць яго вялікай каштоўнасці. Неабходна абмяжоўвацца, напрыклад, перадачай знаку супакою тым, хто стаіць побач150.

### *Удзяленне і прыняцце Эўхарыстыі*

50. Іншым момантам цэлебрацыі, пра які неабходна сказаць, з'яўляецца ўдзяленне і прыняцце св. Камуніі. Звяртаюся да ўсіх, асабліва да пасвячаных распарадчыкаў і да тых, хто адпаведна прыгатаваны і, у выпадку рэальнай неабходнасці, упаўнаважаны да паслугі ўдзялення Эўхарыстыі, зрабіць усё магчымае, каб гэты жэст у сваёй практыцы адпавядаў свайму значэнню – асабістаму спатканню з Панам Езусам у сакрамэнце. Што датычыць прадпісанняў наконт правільнай практыкі, адсылаю да нядаўна выдадзеных дакументаў151. Усім хрысціянскім супольнасцям належыць верна выконваць дзейнічаючыя нормы, бачачы ў іх выраз веры і любові, якую ўсе мы павінны мець у адносінах да гэтага найвышэйшага сакрамэнту. Акрамя таго, не належыць занядбоўваць каштоўны час удзячнасці пасля св. Камуніі: акрамя выканання адпаведнага спеву даволі карысным можа быць таксама захаванне сабранымі цішыні152.

У сувязі з гэтым хачу звярнуць увагу на пастырскую праблему, з якой часта даводзіцца сустракацца ў наш час. Маю на ўвазе той факт, што ў некаторых абставінах, як, напрыклад, падчас св. Імшаў, цэлебраваных з нагоды шлюбаў, пахаванняў ці падобных выпадкаў, на цэлебрацыі прысутнічаюць акрамя практыкуючых вернікаў таксама тыя, хто на працягу

гадоў не набліжаўся да алтара ці, магчыма, знаходзіцца ў жыццёвай сітуацыі, якая не дазваляе прыступаць да сакрамэнтаў. Іншы раз здараецца, што прысутнічаюць асобы іншых хрысціянскіх канфесій ці нават іншых рэлігій. Падобныя абставіны здараюцца таксама і ў касцёлах, якія наведваюць турысты, асабліва ў гарадах мастацтва. У гэтых выпадках зразумелай з'яўляецца неабходнасць кароткіх і пераканаўчых раз'ясненняў значэння сакрамэнтальнай Камуніі і ўмоў яе прыняцця. Там, дзе ёсць сітуацыі, у якіх немагчыма гарантаваць належную яснасць адносна значэння Эўхарыстыі, трэба правільна ацаніць магчымасць замены эўхарыстычнай цэлебрацыі цэлебрацыяй Божага слова153.

***Разасланне: «Ite, missa est»***

51. Урэшце, хацеў бы затрымацца над тым, што Айцы Сіноду сказалі адносна заключнага разаслання на заканчэнне эўхарыстычнай цэлебрацыі. Пасля благаслаўлення дыякан ці святар адпускае народ словамі: «*Ite, missa est*». Гэтае разасланне паказвае нам сувязь паміж цэлебраванай Імшой і хрысціянскай місіяй у свеце. У старажытнасці «*missa*» азначала проста «выхад». Аднак ў хрысціянскім жыцці яно набыло больш глыбокае значэнне. Выраз «выхад» на самой справе пераўтвараецца ў «місію». Гэтае разасланне выражае сцісла місійную сутнасць Касцёла. Таму варта дапамагаць Божаму народу паглыбляць разуменне гэтага вымярэння эклезіяльнага жыцця, якое бярэ пачатак з літургіі. У гэтай перспектыве могуць быць карысны адпаведна падабраныя тэксты для малітвы над народам і заключнага благаслаўлення, якое тлумачыць гэтую сувязь паміж св. Імшой і хрысціянскай місіяй154.

**Actuosa participatio**

***Сапраўдны ўдзел***

52. Другі Ватыканскі Сабор справядліва падкрэсліў важнасць актыўнага, поўнага і плённага ўдзелу ўсяго Божага народу ў эўхарыстычнай цэлебрацыі155. Зразумела, аднаўленне, здзейсненае ў мінулыя гады, паспрыяла значнаму прагрэсу, якога жадалі Айцы Сабору. Аднак мы не павінны хавацца ад таго факту, што часамі выяўляецца некаторае неразуменне, менавіта адносна сэнсу гэтага ўдзелу. Таму належыць растлумачыць, што гэтыя словы не адносяцца да простага знешняга дзеяння падчас цэлебрацыі. На самой справе актыўны ўдзел, якога жадаў Сабор, павінен быць зразуметы глыбей, каб дасягнуць большага разумення таямніцы, якая цэлебруецца, і яе сувязі са штодзённым жыццём. Надалей важнай з'яўляецца рэкамендацыя саборнай канстытуцыі «SacrosanctumConcilium», якая заклікае вернікаў прысутнічаць на эўхарыстычнай літургіі «не ў якасці чужых ці нямых гледачоў», але ўдзельнічаць «у святым дзеянні свядома, цалкам і актыўна»156. Працягваючы разважанні, Сабор кажа, што вернікі, «сфармаваныя Божым словам, жывяцца пры стале Целам Пана; складаюць падзяку Богу; прыносяць беззаганную ахвяру не толькі

праз рукі святара, але разам з ім, і вучацца ахвяроўваць сябе самых і з дня ў дзень праз заступніцтва Хрыста ўдасканальваюцца ў адзінстве з Богам і паміж сабою»157.

### *Удзел і святарская паслуга*

53. Прыгажосць і гармонія літургічнага дзеяння адлюстроўваецца ў парадку, паводле якога кожны пакліканы да актыўнага ўдзелу. Гэта азначае празнанне розных іерархічных функцый, заключаных у самой цэлебрацыі. Варта нагадаць, што актыўны ўдзел у ёй не адназначны з выкананнем пэўнай паслугі. Асабліва не прыносіць карысць актыўнаму ўдзелу вернікаў замяшанне, выкліканае няздольнасцю адрозніваць у касцёльнай супольнасці розныя паасобныя заданні158. А менавіта, неабходна, каб было яснае разуменне спецыфічных заданняў святара. Ён незаменным чынам, як пацвярджае традыцыя Касцёла, з'яўляецца тым, хто ўзначальвае ўсю эўхарыстычную цэлебрацыю ад пачатковага прывітання да заключнага благаслаўлення. Згодна з атрыманым пасвячэннем ён прадстаўляе Езуса Хрыста, Галаву Касцёла, а таксама адпаведным чынам сам Касцёл159. Кожнай цэлебрацыяй Эўхарыстыі, на самой справе, кіруе біскуп, «альбо асабіста, альбо праз сваіх памочнікаў – прэзбітэраў»160. Яму дапамагае дыякан, які мае падчас цэлебрацыі пэўныя вызначаныя заданні: падрыхтоўку алтара і служэнне святару, абвяшчэнне Евангелля, магчыма прамаўленне гаміліі, прапанаванне вернікам інтэнцыі агульнай малітвы, удзяленне вернікам Эўхарыстыі161. У сувязі з гэтымі паслугамі, звязанымі з сакрамэнтам пасвячэння, існуюць таксама іншыя літургічныя функцыі, якія добра выконваюць законнікі і падрыхтаваныя свецкія вернікі162.

### *Эўхарыстычная цэлебрацыя і інкультурацыя*

54. Пачынаючы з асноўных сцвярджэнняў Другога Ватыканскага Сабору, шмат разоў падкрэслівалася значэнне актыўнага ўдзелу вернікаў у эўхарыстычнай Ахвяры. Каб спрыяць актыўнаму ўдзелу, можна дазволіць некаторыя адаптацыя адпаведна да розных сітуацый і розных культур163. Тое, што здараліся некаторыя злоўжыванні, не зацямняе яснасць гэтага прынцыпу, які павінен быць захаваны згодна з рэальнымі патрэбамі Касцёла, які жыве і цэлебруе тую ж самую таямніцу Хрыста ў розных культурных сітуацыях. Пан Езус менавіта ў таямніцы Уцелаўлення, народжаны з жанчыны як дасканалы чалавек (пар. Гал 4, 4), мае непасрэдную сувязь не толькі з чаканнямі са Старога Запавету, але таксама з чаканнямі ўсіх людзей. Ён паказаў нам, што Бог імкнецца дасягнуць нас у нашых жыццёвых абставінах. Таму дзеля больш эфектыўнага ўдзелу вернікаў у святых таямніцах карысна прадоўжыць працэс інкультурацыі ў сферы эўхарыстычнай цэлебрацыі, беручы пад увагу магчымасці для адаптацыі, прапанаваныя *Агульнымі ўводзінамі да Рымскага Імшала*164, а таксама іх

інтэрпрэтацыі ў святле крытэрыяў, устаноўленых IV Інструкцыяй Кангрэгацыі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў «Varietates legitimae» ад 25 студзеня 1994 г.165, і ў святле ўказанняў, дадзеных папам Янам Паўлам II у паслясінадальных адгартацыях «Ecclesia in Africa», «Ecclesia in America», «Ecclesia in Asia», «Ecclesia in Oceania», «Ecclesia in Europa»166. З гэтай мэтай заклікаю Канферэнцыі Біскупаў дзейнічаць так, каб спрыяць захаванню сапраўднай раўнавагі паміж ужо выдадзенымі дырэктывамі і новымі дастасаваннямі167 заўсёды ў згодзе з Апостальскай Сталіцай.

***Асабістыя ўмовы для «Actuosa participatio»***

55. Разглядаючы тэму *actuosa participatio* вернікаў у святым абрадзе, Айцы Сіноду звярнулі ўвагу на асабістыя ўмовы, якія кожны павінен выконваць, каб яго ўдзел быў плённым168. Адна з іх – гэта, зразумела, дух пастаяннага навяртання, які павінен характарызаваць жыццё ўсіх вернікаў. Мы не можам чакаць актыўнага ўдзелу ў эўхарыстычнай  літургіі, калі ўваходзім у яе павярхоўна, не даследаваўшы папярэдне нашае жыццё. Спрыяюць гэтай унутранай гатоўнасці, напрыклад, сканцэнтраванасць і цішыня, прынамсі на некалькі хвілінаў перад пачаткам літургіі, пост і, калі неабходна, сакрамэнтальная споведзь. Сэрца, паяднанае з Богам, з’яўляецца падрыхтаваным да сапраўднага ўдзелу. Асабліва неабходна нагадваць вернікам, што *actuosa participatio* у святых таямніцах не можа адбыцца, калі не будзе імкнення прымаць актыўны ўдзел у касцёльным жыцці ў яго паўнаце, што заключае ў сабе таксама місійны абавязак несці любоў Хрыста ў грамадства.

Без сумненняў, поўны ўдзел у Эўхарыстыі адбываецца тады, калі мы асабіста прыступаем да алтара, каб прыняць св. Камунію169. Аднак неабходна звярнуць увагу на тое, каб гэтае справядлівае сцвярджэнне не вяло да пэўнага аўтаматызму сярод вернікаў, быццам праз сам толькі факт знаходжання ў касцёле падчас літургіі існуе права ці магчыма абавязак прыступаць да эўхарыстычнага Стала. Нават, калі немагчыма прыступіць да сакрамэнтальнай Камуніі, удзел у св. Імшы застаецца неабходным, важным, значным і плённым. У такіх умовах добра развіваць прагненне поўнай еднасці з Хрыстом, напрыклад, праз практыку духоўнай камуніі, згаданай Янам Паўлам II170 і рэкамендаванай святымі настаўнікамі духоўнага жыцця171.

***Удзел хрысціянаў некатолікаў***

56. Разважаючы над тэмай удзелу, мы апынаемся перад неабходнасцю разгледзіць тэму хрысціянаў, якія належаць да Касцёлаў ці Касцёльных супольнасцяў, якія не знаходзяцца ў поўнай лучнасці з каталіцкім Касцёлам. У сувязі з гэтым трэба сказаць, што ўнутраная сувязь, якая існуе паміж Эўхарыстыяй і адзінствам Касцёла з аднаго боку чыніць у нас гарачае прагненне дня, у які зможам цэлебраваць разам з усімі веруючымі ў Хрыста Божую Эўхарыстыю і яўнавыражаць такім чынам паўнату еднасці, якой Хрыстус жадаў для сваіх вучняў (пар. Ян 17,21). З іншага боку, пашана, якая належыць сакрамэнту Цела і Крыві

Хрыста, не дазваляе нам лічыць яе толькі «сродкам», якім мы маглі б неразважліва карыстацца, каб дасягнуць гэтай самай еднасці172. Эўхарыстыя не выражае толькі нашай асабістай еднасці з Езусам Хрыстом, але прадугледжвае поўную *communio* з Касцёлам. Таму гэта з’яўляецца прычынай, у якой з болем, але не без надзеі просім хрысціянаў некатолікаў разумець і паважаць нашыя перакананні, якія паходзяць з Бібліі і Традыцыі. Мы лічым, што эўхарыстычная Камунія і эклезіяльная камунія так унутрана належаць адна адной, што робіць увогуле немагчымым, з боку хрысціянаў некатолікаў, прыступанне да адной, не маючы другой. Яшчэ больш было б пазбаўлена сэнсу сапраўдная і канкрэтная канцэлебра з духоўнымі Касцёлаў ці Касцёльных супольнасцяў, якія не знаходзяцца ў поўнай лучнасці з каталіцкім Касцёлам. Застаецца тым не менш праўдай тое, што, улічваючы вечнае збаўленне, існуе магчымасць удзялення асобным хрысціянам некатолікам Эўхарыстыі, сакрамэнту пакаяння і намашчэння хворых. Гэта абумоўлена аднак акрэсленымі і выключнымі сітуацыямі, апраўданымі канкрэтнымі ўмовамі173. Яны выразна прадстаўлены ў «Катэхізісе Каталіцкага Касцёла»174 і ў яго «Кампендыі»175. Кожны абавязаны верна іх прытрымлівацца.

***Удзел праз сродкі камунікацыі***

57. З прычыны надзвычайнага развіцця сродкаў камунікацыі ў апошнія дзесяцігоддзі слова «ўдзел» набыло больш шырокае значэнне, чым у мінулым. Усе мы з задавальненнем прызнаём, што гэтыя прылады прапануюць новыя магчымасці таксама ў адносінах да эўхарыстычнай цэлебрацыі176. Гэта патрабуе ад пастыраў, якія працуюць у гэтай сферы, асаблівай падрыхтоўкі і жывога пачуцця адказнасці. Св. Імша, якая трансліруецца па тэлебачанні, несумнена мае характар пэўнага прыкладу. Таму неабходна прыкласці асаблівыя намаганні, каб цэлебрацыя, акрамя таго, што адбываецца ў дастойных і добра падрыхтаваных месцах, была згодная з літургічнымі нормамі.

Нарэшце, што датычыць вартасці ўдзелу ў св. Імшы, які стаў магчымым дзякуючы сродкам камунікацыі, то кожны, хто карыстае з такой трансляцыі, павінен ведаць, што ў нармальных умовах ён не выконвае святочнага абавязку. Мова вобразаў прадстаўляе рэчаіснасць, але яе не ўзнаўляе177. Калі пахвальна тое, што пажылыя і хворыя ўдзельнічаюць у святочнай св. Імшы праз радыё і тэлетрансляцыі, то нельга гэтага сказаць пра тых, хто праз такія трансляцыі хацеў бы звольніць сябе ад наведвання касцёла, каб удзельнічаць ва эўхарыстычнай цэлебрацыі ў супольнасці жывога Касцёла.

***«Actuosa participatio» хворых***

58. Улічваючы ўмовы тых, хто з прычыны здароўя ці ўзросту не могуць пайсці на месца культу, хацеў бы звярнуць увагу ўсёй касцёльнай супольнасці на пастырскую неабходнасць забеспячэння духоўнай дапамогі хворым, якія застаюцца ў сваіх дамах або знаходзяцца ў шпіталях. Шмат разоў падчас Сіноду біскупы вярталіся да разгляду іх сітуацыі. Неабходна

паклапаціцца, каб гэтыя нашы браты і сёстры маглі часта прымаць сакрамэнтальную Камунію. Умацоўваючы такім чынам сувязь з укрыжаваным і ўваскрослым Хрыстом, яны змогуць адчуць уласнае існаванне, цалкам злучанае з жыццём і місіяй Касцёла, праз ахвяраванне свайго цярпення ў еднасці з ахвярай нашага Пана. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць інвалідам. Калі іх стан дазваляе, то хрысціянская супольнасць павінна спрыяць іх удзелу ў цэлебрацыі, якая здзяйсняецца ў месцах культу. У сувязі з гэтым неабходна рупіцца аб тым, каб ў сакральных пабудовах былі ліквідаваны ўсялякія архітэктурныя перашкоды, якія перашкаджалі б інвалідам. Урэшце, наколькі гэта магчыма, трэба гарантаваць эўхарыстычную Камунію разумова хворым, ахрышчаным і канфірмаваным: яны прымаюць Эўхарыстыю ў веры сям'і ці супольнасці, якая іх суправаджае178.

### *Клопат пра вязняў*

59. Духоўная традыцыя Касцёла згодна з дакладным указаннем Хрыста (пар. Мц 25, 36) вылучыла наведванне вязняў як адну са спраў міласэрнасці адносна цела. Тыя, хто знаходзіцца ў такіх сітуацыях, маюць асаблівую патрэбу, каб іх наведаў сам Пан у сакрамэнце Эўхарыстыі. Адчуванне блізкасці касцёльнай супольнасці, удзел у Эўхарыстыі і прыняцце св. Камуніі ў асаблівы і балючы перыяд іх жыцця можа безумоўна прычыніцца да асабістага ўзрастання ў веры і да поўнага грамадскага аднаўлення асобы. Выказваючы жаданні, сфармуліраваныя падчас Сіноду, звяртаюся да дыяцэзій, каб яны, па меры магчымасці, зрабілі адпаведны ўклад у пастырскую дзейнасць, скіраваную на духоўны клопат пра вязняў179.

### *Эмігранты і ўдзел у Эўхарыстыі*

60. Закранаючы праблему тых, хто па розных прычынах вымушаны пакідаць сваю краіну, Сінод выказаў асаблівую ўдзячнасць тым, хто займаецца пастырскай апекай эмігрантаў. У сувязі з гэтым асаблівую увагу неабходна звярнуць на тых эмігрантаў, якія належаць да ўсходніх каталіцкіх Касцёлаў і для якіх аддаленне ад уласнага дому ўскладняе магчымасць удзелу ў эўхарыстычнай літургіі свайго абраду. Таму там, дзе гэта магчыма, неабходна прадставіць ім святароў іх абраду. У любым выпадку прашу біскупаў прымаць гэтых братоў у любові Хрыста. Спатканне вернікаў розных абрадаў можа стаць таксама нагодай узаемнага ўзбагачэння. Асабліва думаю аб карысці перш за ўсё для духавенства, бо яны могуць пазнаёміцца з рознымі традыцыямі180.

### *Вялікія канцэлебры*

61. Сінадальны сход затрымаўся над разважаннем якасці ўдзелу ў вялікіх канцэлебрах, якія адбываюцца ў пэўных акалічнасцях і ў якіх, акрамя вялікай колькасці вернікаў, удзельнічае шмат канцэлебрантаў181. З аднаго боку, лёгка распазнаць вартасць гэтых момантаў, асабліва, калі цэлебрацыю ўзначальвае біскуп у акружэнні свайго прэзбітэрыя і дыяканаў. З іншага боку, у такіх абставінах могуць узнікнуць цяжкасці ў выяўленні адчувальнай еднасці прэзбітэрыя, асабліва падчас эўхарыстычнай малітвы, а таксама цяжкасці пры ўдзяленні св. Камуніі. Неабходна пазбягаць таго, каб такія вялікія канцэлебры не ўносілі замяшання. Можна гэтага пазбегнуць, стварыўшы адпаведую каардынацыю і падрыхтаваўшы месца культу так, каб даць прэзбітэрам і вернікам магчымасць поўнага і сапраўднага ўдзелу. У любым выпадку неабходна памятаць, што гаворка ідзе пра канцэлебры выключнага характару і абмежаваныя надзвычайнымі сітуацыямі.

### *Лацінская мова*

62. Маючы гэта на ўвазе, не трэба прыніжаць вартасць такіх вялікіх цэлебрацый. У гэты момант я асабліва думаю пра цэлебрацыі, што адбываюцца падчас міжнародных сустрэч, якія становяцца сёння ўсё больш частымі. Яны павінны быць адпаведна ацэненыя. Каб лепш выявіць адзінства і паўсюднасць Касцёла, хацеў бы прадставіць меркаванне Сіноду Біскупаў згодна з дырэктывамі Другога Ватыканскага Сабору182: за выключэннем чытанняў, гаміліі і малітвы вернікаў, добра, калі такія цэлебрацыі будуць адбывацца на лацінскай мове. Таксама могуць чытацца на лацінскай мове найбольш вядомыя ў традыцыі Касцёла малітвы183; могуць быць выкананы фрагменты грыгарыянскага спеву. Прашу, каб будучыя святары ўжо ў семінарыі былі прыгатаваны да разумення і цэлебравання св. Імшы на лацінскай мове, а таксама да выкарыстання лацінскіх тэкстаў і выканання грыгарыянскага спеву. Не трэба занядбоўваць магчымасці, каб самі вернікі былі навучаны больш агульным малітвам на лацінскай мове і грыгарыянскаму спеву пэўных частак літургіі184.

### *Эўхарыстычныя цэлебрацыі ў малых групах*

63. У пастырстве здараюцца нетыповыя сітуацыі, калі менавіта з увагі на больш свядомы, актыўны і плённы ўдзел трэба спрыяць цэлебрацыі ў малых групах. Пазнаючы фармацыйную вартасць такіх выбараў, неабходна ўдакладніць, што яны павінны быць згарманізаваны з усёй пастырскай праграмай дыяцэзіі. Насамрэч, такія досведы страцілі б выхаваўчы характар, калі б адбываліся паралельна ці ў спаборніцтве з мясцовым Касцёлам. У сувязі з гэтым Сінод пералічыў некаторыя крытэрыі, якіх належыць прытрымлівацца:

малыя групы павінны служыць яднанню супольнасці, а не яе раздзяленню, аб чым павінны сведчыць канкрэтныя паводзіны; гэтыя групы павінны падтрымліваць удзел усёй супольнасці і захоўваць, наколькі магчыма, адзінства літургічнага жыцця ў паасобных сем’ях185.

## Глыбокі ўдзел у цэлебрацыі

### *Містагагічная катэхеза*

64. Вялікая літургічная традыцыя Касцёла вучыць, што для плённага ўдзелу неабходны асабісты ўдзел, каб можна было адказаць на таямніцу, якая цэлебруецца праз адданне Богу ўласнага жыцця ў еднасці з ахвярай Хрыста, здзейсненай дзеля збаўлення ўсяго свету. З гэтай прычыны Сінод Біскупаў заклікаў клапаціцца аб адпаведнасці слоў і жэстаў унутранай гатоўнасці. Калі, нягледзячы на ажыўленне, гэтага не хапіла б нашым цэлебрацыям, то гэта пагражала б зваротам да знешняга рытуалізму. Таму неабходна стымуляваць выхаванне ў эўхарыстычнай веры, якая робіць здольнымі вернікаў перажываць асабіста тое, што цэлебруецца. З увагі на істотнае значэнне гэтага асабістага і свядомага *participatio*, якія павінны быць адпаведныя фармацыйныя сродкі? Айцы Сіноду аднадушна ўказалі на шлях катэхезы містагагічнага характару, якая вядзе вернікаў да ўсё больш глыбокага разумення цэлебраванай таямніцы186. Што датычыць сувязі паміж *ars celebrandi*і *actuosa participatio,* належыць перш за ўсё сцвердзіць, што «лепшая катэхеза аб Эўхарыстыі – гэта сама Эўхарыстыя, добра цэлебраваная»187. Па сваёй сутнасці літургія мае педагагічную здольнасць уводзіць вернікаў у разуменне цэлебраванай таямніцы. Менавіта таму, у найбольш старажытнай традыцыі Касцёла, фармацыйны шлях хрысціяніна, не занядбоўваючы сістэматычнага навучання праўдам веры, меў заўсёды характар досведу, у якім было акрэслена жывое і пераканаўчае спатканне з Хрыстом, абвешчаным аўтэнтычнымі сведкамі. У гэтым сэнсе той, хто ўводзіць у таямніцы, з’яўляецца перш за ўсё сведкам. Бясспрэчна, такое спатканне паглыбляецца падчас катэхезы і знаходзіць сваю крыніцу і сваю кульмінацыю ў цэлебрацыі Эўхарыстыі. З фундаментальнай структуры хрысціянскага досведу бярэ пачатак неабходнасць містагагічнага шляху, у якім заўсёды павінны прысутнічаць тры элементы.

*а*) Перш за ўсё, *тлумачэнне абрадаў у святле збаўчых падзей* згодна з жывой традыцыяй Касцёла. Цэлебрацыя Эўхарыстыі, у яе бясконцым багацці, мае няспыннае аднясенне да гісторыі збаўлення. Ва ўкрыжаваным і ўваскрослым Хрысце дадзена па-сапраўднаму цэлебраваць цэнтральную падзею, якая падагульняе ўсю рэчаіснасць (пар. Эф 1,10). Ад пачатку хрысціянская супольнасць разважала над падзеямі з жыцця Езуса, і асабліва над Пасхальнай таямніцай, у кантэксце ўсёй старазапаветнай гісторыі.

*б*) Містагагічная катэхеза павінна паклапаціцца, акрамя таго, аб *увядзенні ў сэнс знакаў*, змешчаных у абрадах. Гэтае заданне з’яўляецца асабліва неадкладным у наш час, моцна тэхнізаваны, калі існуе рызыка згубіць здольнасць успрыняцця знакаў і сімвалаў. Містагагічная катэхеза павінна не толькі інфармаваць, але абуджаць і выхоўваць чуллівасць вернікаў на мову знакаў і жэстаў, якія ў спалучэнні са словам ствараюць абрад.

*в*) Нарэшце, містагагічная катэхеза павінна клапаціцца аб выяўленні *значэння абрадаў у сувязі з хрысціянскім жыццём* ва ўсіх яго вымярэннях,  працы і абавязку, думак і пачуццяў, дзейнасці і адпачынку. Гэта частка містагагічнага шляху паказвае сувязь цэлебраваных у абрадзе таямніц з місійнай адказнасцю вернікаў. У гэтым сэнсе сталым вынікам містагогіі з’яўляецца ўсведамленне, што ўласнае існаванне паступова перамяняецца ў выніку цэлебраваных святых таямніц. Мэтай усяго хрысціянскага выхавання, зрэшты, ёсць фарміраванне верніка як «новага чалавека» ў сталай веры, якая робіць яго здольным сведчыць ва ўласным асяроддзі аб хрысціянскай надзеі, якая яго натхняе.

Каб мець магчымасць здзяйсняць унутры нашых эклезіяльных супольнасцяў такое выхаваўчае заданне, неабходна мець адпаведна падрыхтаваных выхавальнікаў. Безумоўна, увесь Божы народ павінен адчуваць сябе абавязаным да гэтай фармацыі. Кожная хрысціянская супольнасць паклікана быць месцам педагагічных уводзінаў у таямніцы, якія цэлебруюцца ў веры. У сувязі з гэтым Айцы падчас Сіноду падкрэслілі дарэчнасць большай актывізацыі супольнасцяў кансэкраванага жыцця, рухаў і аб’яднанняў, якія паводле сваіх харызмаў могуць прынесці новы імпульс хрысціянскай фармацыі188. Таксама і ў наш час Дух Святы не скупіцца праліваць свае дары, каб падтрымліваць апостальскую місію Касцёла, якой належыць распаўсюджваць веру і ўзрошчваць яе да сталасці189.

### *Пашана да Эўхарыстыі*

65. Пераканаўчай прыкметай эфектыўнасці эўхарыстычнай катэхезы для вернікаў з’яўляецца, безумоўна, узрастанне ў іх адчування таямніцы Бога, прысутнага сярод нас. Гэта можа выяўляцца ў асаблівай пашане да Эўхарыстыі, што з’яўляецца вынікам містагагічнага ўвядзення вернікаў190. Я думаю ўвогуле аб значнасці жэстаў і пастаў, такіх як укленчванне падчас важных момантаў эўхарыстычнай малітвы. Прыстасоўваючыся да слушнага адрознення знакаў, якія здзяйсняюцца ў кантэксце розных культур, адчуваецца і выяўляецца ўсведамленне падчас кожнай цэлебрацыі, што мы знаходзімся перад бясконцай веліччу Бога, які пакорна дасягае нас у сакрамэнтальных знаках.

## Адарацыя і эўхарыстычная пабожнасць

### *Унутраная сувязь паміж цэлебрацыяй і адарацыяй*

66. Кульмінацыйным момантам Сіноду была супольная, разам са шматлікімі вернікамі, эўхарыстычная адарацыя ў базыліцы св. Пятра. Гэтай малітвай сход біскупаў хацеў звярнуць увагу, не толькі словамі, на значнасць унутранай сувязі паміж эўхарыстычнай цэлебрацыяй і адарацыяй. У гэтым важным аспекце веры Касцёла знаходзіцца адзін з вырашальных момантаў касцёльнага шляху, здзейсненага пасля літургічнай адновы, пажаданай Другім Ватыканскім Саборам. У той час, як літургічная рэформа рабіла першыя крокі, унутраная сувязь паміж св. Імшой і адарацыяй Найсвяцейшага Сакрамэнту часам разумелася недастаткова ясна. Закіды, якія распаўсюджваліся, паходзілі з таго погляду, што эўхарыстычны Хлеб быў нам дадзены не для таго, каб яго сузіраць, але каб спажываць. Насамрэч, у святле досведу малітвы Касцёла гэтае супярэчанне беспадстаўна. Ужо св. Аўгустын сказаў: «*Nemo autem illam carnem manducat, nisi prius adoraverit; peccemus non adorando»*191 (няхай ніхто не есць гэты хлеб, калі папярэдне яго не адараваў; грашылі б мы, калі б яму не пакланяліся). У Эўхарыстыі Сын Божы сапраўды ідзе нам насустрач і прагне з’яднацца з намі; эўхарыстычная адарацыя нішто іншае, як відавочнае развіццё эўхарыстычнай цэлебрацыі, якая сама ў сабе з’яўляецца найвялікшым актам адарацыі Касцёла192. Прымаць Эўхарыстыю – значыць мець паставу адарацыі перад тым, каго прымаем. Менавіта так і толькі так мы становімся з Ім адно і смакуем нейкім чынам наперад прыгажосць нябеснай літургіі. Акт адарацыі па-за св. Імшой працягвае і ўзмацняе ўсё, што адбывалася падчас самой літургічнай цэлебрацыі. «Толькі ў адарацыі можна ўзрасці да глыбокага і сапраўднага прыняцця Хрыста. Менавіта ў гэтым акце асабістай сустрэчы з Панам сталее таксама грамадская місія, якая заключана ў Эўхарыстыі і якая прагне зламаць бар’еры не толькі між Панам і намі, але таксама і перш за ўсё бар’еры, якія раздзяляюць нас»193.

***Практыка эўхарыстычнай адарацыі***

67. Таму разам з сінадальным сходам горача заклікаю пастыраў Касцёла і Божы народ да практыкавання эўхарыстычнай адарацыі, як асабістай, так і супольнай194. У сувязі з гэтым вельмі карыснай будзе адпаведная катэхеза, якая б тлумачыла вернікам значэнне гэтага акту культу, які дазваляе больш глыбока і плённа ўдзельнічаць у літургічнай цэлебрацыі. У найбольш населеных цэнтрах, наколькі гэта магчымага, было б дарэчным вызначыць касцёлы ці капліцы, прыдатныя для няспыннай адарацыі. Акрамя таго, заклікаю, каб ў катэхетычнай фармацыі дзяцей, асабліва ў межах падрыхтоўкі да першай св. Камуніі, было раскрыта для іх значэнне і прыгажосць знаходжання з Езусам, каб павялічвалася іх захапленне адносна Яго прысутнасці ў Эўхарыстыі.

Прагну выказаць павагу і падтрымку ўсім інстытутам кансэкраванага жыцця, чые члены прысвячаюць значную частку свайго часу эўхарыстычнай адарацыі. Такім чынам яны з’яўляюцца для ўсіх прыкладам асобаў, якіх фарміруе рэальная прысутнасць Пана. Таксама хачу падбадзёрыць тыя аб’яднанні вернікаў і брацтвы, якія лічаць гэтую практыку сваім асаблівым абавязкам, становячыся такім чынам рошчынай кантэмпляцыі для ўсяго Касцёла

і нагадваючы пра цэнтральнае месца Хрыста ў жыцці паасобных людзей і супольнасцяў.

### *Формы эўхарыстычнай пабожнасці*

68. Асабістая сувязь, якую кожны вернік устанаўлівае з Езусам, прысутным у Эўхарыстыі, скіроўвае яго заўсёды да касцёльнай супольнасці, павялічваючы свядомасць яго прыналежнасці да Цела Хрыста. Таму, акрамя запрашэння паасобных вернікаў, каб яны асабіста знаходзілі час для малітвы перад сакрамэнтам алтара, лічу, што маім абавязкам з’яўляецца заахвочванне парафій і розных касцёльных груп да практыкавання сумеснай адарацыі. Зразумела, захоўваюць усю сваю каштоўнасць ужо існуючыя формы эўхарыстычнай пабожнасці. Маю на ўвазе, напрыклад, эўхарыстычныя працэсіі, асабліва традыцыйную працэсію ва ўрачыстасць Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста, пабожную практыку саракагадзіннага набажэнства, мясцовыя, нацыянальныя і міжнародныя эўхарыстычныя кангрэсы і іншыя падобныя ініцыятывы. Належным чынам дастасаваныя да сучаснасці і да розных абставінаў, гэтыя формы пабожнасці заслугоўваюць на практыкаванне таксама і сёння195.

### *Месца табэрнакулюма ў касцёле*

69. У сувязі з важнасцю захавання Эўхарыстыі і адарацыі, а таксама пашаны да сакрамэнту Ахвяры Хрыста, Сінод Біскупаў паставіў перад сабой пытанне наконт адпаведнага размяшчэння табернакулюма ў нашых касцёлах196. Яго правільнае размяшчэнне дапамагае ў выяўленні рэальнай прысутнасці Хрыста ў Найсвяцейшым Сакрамэнце. Таму неабходна, каб месца, дзе захоўваюцца эўхарыстычныя постаці, з лёгкасцю заўважалі ўсе, хто ўваходзіць у касцёл, дзякуючы таксама лампадзе, якая павінна заўсёды гарэць. Для гэтага неабходна браць пад увагу архітэктуру сакральнага будынку: у касцёле, дзе няма капліцы для Найсвяцейшага Сакрамэнту, але ёсць галоўны алтар з табернакулюмам, трэба выкарыстоўваць гэтую структуру для захоўвання Эўхарыстыі і адарацыі, пазбягаючы размяшчэння ў гэтым месцы крэсла для цэлебранта. У новых касцёлах пажадана прадугледзець капліцу для Найсвяцейшага Сакрамэнту побач з прэзбітэрыем; там, дзе гэта немагчыма, лепш размясціць табернакулюм у прэзбітэрыі, у месцы дастаткова высокім, у цэнтры абсіды або ў іншым месцы, адкуль ён будзе добра бачны. Гэта надае вартасць табернакулюму, аб якой заўсёды трэба клапаціцца таксама з мастацкага пункту гледжання. Зразумела, неабходна зважаць на тое, што прадпісваюць у сувязі з гэтым *Агульныя ўводзіны да Рымскага Імшала*197. У любым выпадку апошняе рашэнне адносна гэтага пытання належыць дыяцэзіяльнаму біскупу.

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

## ЭЎХАРЫСТЫЯ, ТАЯМНІЦА ЖЫЦЦЯ

***«Як паслаў Мяне жывы Айцец, і Я жыву Айцом, так і той, хто есць Мяне, будзе жыць Мною» (Ян 6, 57)***

### Эўхарыстычная форма хрысціянскага жыцця

***Разумнае служэнне– logiké latreía (Рым 12, 1)***

70. Пан Езус, стаўшы для нас хлебам праўды і любові, кажа пра дар свайго жыцця і запэўнівае нас, што той, «хто будзе есці хлеб гэты, будзе жыць вечна» (Ян 6, 51). Але гэтае «вечнае жыццё» распачынаецца ў нас ужо цяпер праз перамяненне, якое эўхарыстычны дар нараджае ў нас. «Той, хто есць Мяне, будзе жыць Мною» (Ян 6, 57). Гэтыя словы Езуса дапамагаюць зразумець, што таямніца, «у якую верацъ» і «якую цэлебруюць», мае дынамізм, які робіць яе пачаткам у нас новага жыцця і формай хрысціянскага існавання. Прымаючы Цела і Кроў Езуса Хрыста, мы становімся ўдзельнікамі боскага жыцця больш сталым і свядомым чынам. Тут таксама мае істотнае значэнне ўсё, што св. Аўгустын кажа ў сваіх «Вызнаннях» аб вечным *Logos*, ежы душы: падкрэсліваючы парадаксальны характар гэтай ежы, ён уяўляе, як у дыялогу з Ім чуе словы: «Гэта ежа дарослых: дарасці і будзеш мяне спажываць. Я не буду прыпадобнены ў табе да ежы твайго цела, але ты будзеш прыпадобнены да мяне»198. Гэта не эўхарыстычны спажытак перамяняецца ў нас, але гэта мы таямнічым чынам ім перамяняемся. Хрыстус жывіць нас, яднаючы з сабою: «Ён нас прымае і прыцягвае да сябе»199.

Эўхарыстычная цэлебрацыя праяўляецца тут ва ўсёй сваёй моцы як крыніца і вяршыня касцёльнага існавання, паколькі выражае адначасова як генезіс, так і здзяйсненне новага і дэфінітыўнага культу, *logiké latreía*200. У сувязі з гэтым словы св. Паўла, скіраваныя да Рымлянаў, з'яўляюцца сінтэтычнай фармуліроўкай таго, як Эўхарыстыя перамяняе ўсё нашае жыццё ў духоўны культ, прыемны Богу: «Прашу вас, браты, праз літасць Божую: аддайце вашыя целы на ахвяру жывую, святую, прыемную Богу – на разумнае служэнне вашае» (Рым 12, 1). У гэтым закліку паўстае вобраз новага культу як поўнае ахвяраванне нашай асобы ў еднасці з усім Касцёлам. Падкрэсліванне Апосталам ахвяры з нашых целаў пацвярджае канкрэтны чалавечы характар служэння, якое не можа быць бесцялесным. Таксама ў сувязі з гэтым святы з Гіпоны нагадвае нам зноў: «Вось ахвяра хрысціянаў: "усе разам мы ствараем адно цела ў Хрысце". Касцёл цэлебруе гэтую таямніцу ў сакрамэнце алтара, які добра ведаюць вернікі, і выразна ведае, што ў тым, што ахвяруе, сам ёсць ахвярай»201. Каталіцкае вучэнне сцвярджае, што Эўхарыстыя, паколькі з'яўляецца ахвярай

Хрыста, з’яўляецца таксама ахвярай усяго Касцёла, а значыць вернікаў202. Падкрэсліванне ахвяры – «sacrum facere» – выражае тут усё экзістэнцыяльнае багацце, якое ўдзельнічае ў перамяненні нашай чалавечай рэчаіснасці, адкупленай Хрыстом (пар. Флп 3,12 ).

***Усеахопная плённасць эўхарыстычнага культу***

71. Новы хрысціянскі культ ахоплівае кожны аспект існавання, перамяняючы яго: «Таму ці ясцё, ці п’яцё, ці што іншае робіце, усё рабіце на хвалу Божую» (1 Кар 10, 31). У кожным праяўленні свайго жыцця хрысціянін пакліканы да праўдзівага Божага культу. Адсюль набывае ўнутраную форму эўхарыстычная прырода хрысціянскага жыцця. Наколькі Эўхарыстыя актывізуе чалавечую рэчаіснасць верніка ў яе штодзённай канкрэтнасці, настолькі робіць магчымым, дзень за днём, паступовую перамену чалавека, пакліканага праз ласку да таго, каб быць вобразам Божага Сына (пар. Рым 8, 29 і наст.). Няма нічога найбольш аўтэнтычна чалавеку – думкі і пачуццяў, слоў і чынаў, – што не знаходзіла б у сакрамэнце Эўхарыстыі адпаведнай формы поўнай іх рэалізацыі. Тут выяўляецца ўся антрапалагічная каштоўнасць радыкальнай навізны, якую прынёс Хрыстус у Эўхарыстыі: пакланенне Богу не можа ў чалавечым існаванні абмяжоўвацца канкрэтным прыватным момантам, але па сваёй сутнасці павінна пранікаць у кожны аспект чалавечай рэчаіснасці. Культ, прыемны Богу, становіцца такім чынам новым спосабам успрыняцця ўсіх абставінаў жыцця, дзе кожная дробязь вылучана, бо разглядаецца ў кантэксце сувязі з Хрыстом, як ахвяра, прынесеная Богу. Хвала Бога – гэта жывы чалавек (пар. 1 Кар 10,31). А жыццё чалавека – гэта бачанне Бога203.

***«Iuxta dominicam viventes» – жыць паводле нядзелі***

72. Гэтая радыкальная навізна, якую Эўхарыстыя ўводзіць ў жыццё чалавека, выяўляецца ў хрысціянскім сумленні ад самага пачатку. Вернікі адразу ж спазналі глыбокае ўздзеянне, якое эўхарыстычная цэлебрацыя аказвала на спосаб іх жыцця. Св. Ігнацый з Антыёхіі тлумачыць гэтую праўду, акрэсліваючы хрысціянаў як «тых, хто прыйшоў да новай надзеі», і як тых, хто жыве «паводле нядзелі» (*iuxta dominicam viventes*)204. Гэтае сцвярджэнне вялікага мучаніка з Антыёхіі ўказвае на сувязь паміж Эўхарыстыяй і штодзённым хрысціянскім існаваннем. Характэрны для хрысціянаў звычай збірацца ў першы дзень пасля шабату для цэлебрацыі ўваскрасення Хрыста – паводле апісання св. Юстына мучаніка205 – з’яўляецца таксама тым, што вызначае форму існавання, адноўленую сустрэчай з Хрыстом. Выраз св. Ігнацыя «жыць паводле нядзелі» падкрэслівае парадыгматычную вартасць, якую гэты святы дзень мае ў параўнанні з іншымі днямі тыдня. Нядзеля, насамрэч, не адрозніваецца толькі простым спыненнем звычайнай дзейнасці, яна не з’яўляецца нейкім прыпынкам у межах звычайнага рытму дзён. Хрысціяне заўсёды лічылі гэты дзень першым днём тыдня, бо ў гэты дзень здзяйсняецца ўспамін радыкальнай навізны, прынесенай

Хрыстом. Таму нядзеля з'яўляецца днём, калі хрысціянін нанова адкрывае эўхарыстычную форму свайго існавання, дзякуючы якой ён пастаянна заклікаецца да жыцця. «Жыць паводле нядзелі» азначае жыць у свядомасці вызвалення, якое прынёс Хрыстус, і здзяйсняць уласнае існаванне як ахвяру, прынесеную Богу з самога сябе, бо Яго перамога аб'явілася ў поўні ўсім людзям праз унутрана адноўленыя паводзіны.

***Выкананне наказу святкавання***

73. Айцы Сіноду, усведамляючы новы жыццёвы прынцып, які адкрывае хрысціяніну Эўхарыстыя, яшчэ раз пацвердзілі значэнне для ўсіх вернікаў святкавання нядзелі, як крыніцы сапраўднай свабоды, каб яны маглі жыць кожны дзень паводле таго, што цэлебравалі ў «дзень Пана». Жыццё веры будзе знаходзіцца ў небяспецы, калі не будзе жадання ўдзельнічаць у эўхарыстычнай цэлебрацыі, у якой здзяйсняецца ўспамін пасхальнай перамогі. Удзел у літургічным нядзельным сходзе разам з усімі братамі і сёстрамі, з якімі ствараем адно цела ў Езусе Хрысце, з'яўляецца патрабаваннем хрысціянскага сумлення і ў той жа час ён фарміруе хрысціянскае сумленне. Страта сэнсу нядзелі як дня Пана, які трэба асвячаць, сведчыць пра загубленасць сапраўднага сэнсу хрысціянскай свабоды, свабоды дзяцей Божых206. Таму застаюцца каштоўнымі для хрысціянаў заўвагі, зробленыя маім папярэднікам Янам Паўлам II у апостальскім лісце «Dies Domini»207 наконт розных вымярэнняў нядзелі: яна з'яўляецца *Dies Domini* адносна справы стварэння; *Dies Christi,* бо гэта дзень новага стварэння і дару Духа Святога, дадзенага ўваскрослым Панам; *Dies Ecclesiae,* бо гэта дзень, калі хрысціянская супольнасць збіраецца для цэлебрацыі; *Dies hominis,* бо гэта дзень радасці, адпачынку і братэрскай любові.

Таму гэты дзень выяўляецца як асноўны і першы святочны дзень, у які кожны вернік, у асяроддзі, у якім жыве, можа стаць вестуном і вартаўніком сэнсу часу. Насамрэч, з гэтага дня вынікае хрысціянскі сэнс існавання і новы спосаб разумення часу, адносінаў, працы, жыцця і смерці. Таму добра, калі ў дзень Пана касцёльныя групы арганізоўваюць вакол нядзельнай эўхарыстычнай цэлебрацыі мерапрыемствы і іншыя ўласцівыя хрысціянскай супольнасці акцыі: сяброўскія сустрэчы, ініцыятывы для выхавання ў веры дзяцей, моладзі і дарослых, пілігрымкі, дабрачынныя справы і розныя формы малітвы. З прычыны гэтых вельмі важных каштоўнасцяў – паколькі суботні вечар справядліва ўжо ад I Нешпараў належыць да нядзелі, і дазваляецца тады выкананне нядзельнага абавязку – трэба аднак памятаць, што сама па сабе нядзеля заслугоўвае на асвячэнне, і каб не скончылася на тым, што яна стане днём, «пазбаўленым Бога»208.

***Сэнс адпачынку і працы***

74. Урэшце, асабліва важным з’яўляецца напамін, што дзень Пана – гэта таксама дзень адпачынку ад працы. Вельмі спадзяёмся, што ён будзе прызнаны такім таксама грамадзянскай супольнасцю, каб была магчымасць устрымання ад працоўнай дзейнасці і не было за гэта пакарання. Хрысціяне, зважаючы на значэнне шабату ў габрэйскай традыцыі, лічылі дзень Пана таксама днём, вольным ад штодзённых клопатаў. Гэта мае асаблівае значэнне, бо гаворыць пра *рэлятывізацыю працы*, якая павінна быць скіравана на чалавека: праца існуе для чалавека, а не чалавек – для працы. Можна ўбачыць у гэтым абарону, дадзеную самому чалавеку, якая вызваляе такім чынам ад магчымай формы рабства. Як я ўжо сцвярджаў, «праца мае першаснае значэнне для чалавека і для развіцця грамадства. Таму неабходна, каб яна была заўсёды арганізавана і выконвалася ў поўнай пашане да чалавечай годнасці і ў служэнні агульнаму дабру. У той жа час неабходна, каб чалавек не быў зняволены працай, каб ёй не пакланяўся, каб не імкнуўся знайсці ў ёй канчатковы і асноўны сэнс жыцця»209. У дзень, прысвечаны Богу, чалавек спасцігае сэнс свайго існавання, а таксама сваёй працоўнай дзейнасці210.

### *Нядзельны сход пры адсутнасці святара*

75. Адкрываючы значэнне нядзельнай цэлебрацыі для жыцця хрысціяніна, сутыкаемся з праблемай тых хрысціянскіх супольнасцяў, у якіх няма святара, а таму немагчыма цэлебрацыя св. Імшы ў дзень Пана. У сувязі з гэтым неабходна сказаць, што мы маем дачыненне з даволі разнастайнымі сітуацыямі. Сінод заклікаў вернікаў, нават калі гэта патрабуе пэўнай ахвяры, збірацца ў адным з касцёлаў дыяцэзіі, у якім гарантавана прысутнасць святара211. Там, дзе вялікія адлегласці робяць удзел у нядзельнай Эўхарыстыі практычна немагчымым, важна, каб хрысціянская супольнасць усё роўна збіралася дзеля праслаўлення Пана і ўспаміну дня, прысвечанага Яму. Аднак, гэта павінна адбывацца ў кантэксце адпаведнага вучэння адносна розніцы паміж св. Імшой і нядзельнымі сходамі пры адсутнасці святара. Пастырская апека Касцёла павінна ў гэтым выпадку выражацца ў назіранні, каб літургія слова, арганізаваная пад кіраўніцтвам дыякана ці асобы, упаўнаважанай кампетэнтнымі ўладамі, адбывалася згодна з пэўным рытуалам, распрацаваным Канферэнцыяй Біскупаў і зацверджаным для гэтай мэты212. Нагадваю, што ардынарыі павінны ўпаўнаважваць асобы для ўдзялення св. Камуніі ў такіх літургічных сходах, уважліва ацэньваючы адпаведнасць дадзенага выбару. Акрамя гэтага, неабходна дзейнічаць так, каб такія сходы не прычыніліся да змяншэння галоўнай ролі святара і сакрамэнтальнага характару жыцця Касцёла. Значэнне ролі свецкіх, якім справядліва належыць удзячнасць за іх велікадушнасць у служэнні хрысціянскай супольнасці, ніколі не павінна закрываць неад’емную паслугу святароў у жыцці Касцёла213. Таму трэба ўважліва сачыць за тым, каб сходы, якія чакаюць святара, не давалі б падставы эклезіяльным уяўленням, нязгодным з праўдай Евангелля і традыцыяй Касцёла. Хутчэй яны павінны быць прывілеяванымі нагодамі для малітвы, каб Бог спаслаў святых святароў паводле свайго

Сэрца. У сувязі з гэтым узрушвае тое, што пісаў папа Ян Павел II у «Лісце да святароў» на Вялікі чацвер 1979г., узгадваючы тыя месцы, дзе людзі, пазбаўленыя святароў з прычыны дыктатарскіх рэжымаў, збіраліся ў касцёле ці ў санктуарыі, клалі на алтар стулу, якая яшчэ захавалася, і прамаўлялі малітвы эўхарыстычнай літургіі, а «ў момант, які адпавядаў кансэкрацыі, на сведчанне таго, як горача яны прагнулі пачуць словы, якія толькі вусны святара могуць дзейсна вымавіць», захоўвалі цішыню214. Менавіта ў сувязі з гэтым, беручы пад увагу непараўнальнае дабро, якое вынікае з цэлебрацыі эўхарыстычнай Ахвяры, прашу ўсіх святароў аб актыўнай і канкрэтнай гатоўнасці як мага больш частага наведвання супольнасцяў, давераных іх пастырскай апецы, каб яны не заставаліся празмерна доўгі час без сакрамэнту любові.

***Касцёльная прыналежнасць - эўхарыстычная форма хрысціянскага існавання***

76. Узгадванне нядзелі як *Dies Ecclesiae* заклікае нас да ўсведамлення ўнутранай сувязі паміж перамогай Езуса над злом і смерцю і нашай прыналежнасцю да Яго эклезіяльнага цела. Сапраўды, кожны хрысціянін у дзень Пана адкрывае таксама супольнае вымярэнне свайго ўласнага адкупленага існавання. Удзел у літургічнай цэлебрацыі, прыняцце Цела і Крыві Хрыста азначае паглыбленне нашай прыналежнасці да таго, хто памёр за нас (пар. 1 Кар 6, 19 і наст.; 7, 23). Хто корміцца Хрыстом, жыве для Яго. У святле эўхарыстычнай таямніцы выяўляецца глыбокі сэнс *communio sanctorum*. Камунія заўсёды і непарыўна мае вертыкальную і гарызантальную канатацыю: камунія з Богам і камунія з братамі і сёстрамі. Два вымярэнні сустракаюцца таямнічым чынам у эўхарыстычным дары. «Дзе знішчаецца камунія з Богам, якая ёсць камуніяй з Айцом, Сынам і Духам Святым, там знішчаецца корань і крыніца камуніі паміж намі. А калі мы не жывем у камуніі паміж сабой, там няма таксама жывой і сапраўднай камуніі з Трынітарным Богам»215. Будучы пакліканымі быць членамі Хрыста і членамі адны другіх (пар. 1 Кар 12, 27), мы ствараем рэчаіснасць, анталагічна заснаваную на хросце і ўскормленую Эўхарыстыяй, рэчаіснасць, якая патрабуе адчувальнай прысутнасці ў жыцці нашых супольнасцяў. Эўхарыстычны характар хрысціянскага існавання – гэта несумненна эклезіяльны і супольнасны характар. Праз дыяцэзіі і парафіі, якія ствараюць асноўныя структуры Касцёла на дадзенай тэрыторыі, кожны вернік можа канкрэтна адчуць сваю прыналежнасць да цела Хрыста. Таварыствы, касцёльныя рухі і новыя супольнасці, а таксама інстытуты кансэкраванага жыцця, разам з жыццёвымі харызмамі, атрыманымі ад Духа Святога для нашага часу, павінны ўнесці свой асаблівы ўклад, каб дапамагчы вернікам усвядоміць іх прыналежнасць да Пана (пар. Рым 14, 8). Феномен секулярызацыі, які невыпадкова мае выразна індывідуалістычныя рысы, дасягае сваіх згубных эфектаў перш за ўсё сярод людзей, якія адасабляюцца з-за слабага адчування сваёй прыналежнасці. Хрысціянства ад самага пачатку будавалася на яднанні, на стварэнні сеткі сувязяў, якія няспынна аднаўляліся слуханнем слова і эўхарыстычнай цэлебрацыяй і ажыўляліся Духам Святым.

*Духоўнасць і эўхарыстычная культура*

77. Айцы Сіноду выразна сцвердзілі, што «хрысціянскія вернікі маюць патрэбу больш глыбокага разумення сувязяў паміж Эўхарыстыяй і штодзённым жыццём. Эўхарыстычная духоўнасць – гэта не толькі ўдзел у св. Імшы і пакланенне Найсвяцейшаму Сакрамэнту. Яна ахоплівае ўсё жыццё»216. Гэта заўвага набывае сёння для ўсіх нас асаблівае значэнне. Неабходна падкрэсліць, што адным з найбольш цяжкіх вынікаў згаданай секулярызацыі з'яўляецца змяшчэнне хрысціянскай веры па-за існаваннем, бо яна быццам бы непатрэбная ў канкрэтным жыцці людзей. Мізэрнасць такога спосабу жыцця «быццам Бога няма» сёння бачна для ўсіх. Таму неабходна нанова адкрыць, што Езус Хрыстус не з'яўляецца проста прыватным перакананнем ці абстрактным вучэннем, але рэальнай асобай, чый уваход у гісторыю вядзе да аднаўлення жыцця ўсіх. Таму Эўхарыстыя як крыніца і вяршыня жыцця і місіі Касцёла павінна нарадзіць духоўнасць, жыццё «паводле Духа» (Рым 8, 4 і наст.; пар. Гал 5, 16. 25). Паказальна тое, што св. Павел ва ўрыўку з Паслання да Рымлянаў, у якім запрашае да новага духоўнага культу, кажа адначасова пра неабходнасць перамены ўласнага спосабу жыцця і думак: «Не дастасоўвайцеся да гэтага веку, але перамяняйцеся праз абнаўленне розуму вашага, каб вы пазналі, якая воля Божая – добрая, прыемная і дасканалая» (12, 2) Такім чынам Апостал народаў падкрэслівае сувязь паміж сапраўдным духоўным культам і неабходнасцю новага разумення існавання і вядзення жыцця. Неад'емнай часткай эўхарыстычнай формы хрысціянскага жыцця з'яўляецца аднаўленне менталітэту: «мы больш не павінны быць немаўлятамі, якіх хістае і захапляе кожны вецер вучэнняў» (Эф 4, 14).

*Эўхарыстыя і евангелізацыя культур*

78. З вышэйзгаданага вынікае, што эўхарыстычная таямніца ўводзіць нас *ў дыялог* з рознымі культурамі, таксама ў пэўным сэнсе робіць ім выклік217. Неабходна распазнаць міжкультурны характар гэтага культу, той *logiké latréía*. Прысутнасць Езуса Хрыста і праліццё Духа Святога – гэта падзеі, якія могуць пастаянна супастаўляцца з кожнай культурнай рэчаіснасцю, каб унесці ў яе закваску Евангелля. У выніку гэта вядзе да абавязку з упэўненасцю праводзіць евангелізацыю культур, памятаючы, што сам Хрыстус ёсць праўдай кожнага чалавека і ўсёй чалавечай гісторыі. Эўхарыстыя становіцца крытэрыем ацэнкі таго, з чым сустракаецца хрысціянін ў розных культурных праяўленнях. У гэтым важным працэсе можам заўважыць, наколькі значнымі з'яўляюцца словы св. Паўла, які запрашае ў сваім Першым пасланні да Тэсаланікійцаў: «Усё правярайце, трымайцеся добрага» (пар. 5, 21).

*Эўхарыстыя і свецкія вернікі*

79. У Хрысце, Галаве Касцёла – Яго цела, усе хрысціяне ствараюць «выбраны род, каралеўскае святарства, народ святы, люд, узяты Богам ва ўласнасць, каб абвяшчаць цноты таго, хто паклікаў вас з цемры ў цудоўнае святло сваё» (1 П 2, 9). Эўхарыстыя, як таямніца, якой трэба жыць, удзяляецца кожнаму з нас у той сітуацыі, у якой мы знаходзімся, робячы нашу экзістэнцыяльную сітуацыю месцам, у якім штодзённа перажываецца хрысціянская навізна. Калі эўхарыстычная Ахвяра корміць і ўзмацняе ў нас тое, што было дадзена падчас хросту, праз які ўсе мы пакліканы да святасці218, то цяпер гэта павінна выплываць і выяўляцца менавіта ў сітуацыях ці станах жыцця, у якія трапляе кожны хрысціянін. Пражываючы сваё жыццё, дзень за днём, як пакліканне, хрысціянін аддае сябе на служэнне, прыемнае Богу. Пачынаючы з літургічнага сходу, сакрамэнт Эўхарыстыі абавязвае нас удзельнічаць у штодзённай рэчаіснасці, каб усё рабіць на Божую хвалу.

Паколькі свет з’яўляецца «полем» (Мц 13,38), якое Бог засявае сваімі дзецьмі, як добрым насеннем, свецкія хрысціяне паводле моцы хросту і канфірмацыі, а таксама падмацаваныя Эўхарыстыяй, пакліканы да радыкальна новага жыцця, якое прынёс Хрыстус у штодзённыя ўмовы існавання219. Яны павінны падтрымліваць жаданне, каб Эўхарыстыя ўсё больш уплывала на іх штодзённае жыццё і рабіла іх бачнымі сведкамі ва ўласным асяроддзі працы і ва ўсім грамадстве220. Асабліва заахвочваю сем’і, каб чэрпалі натхненне і моц з гэтага сакрамэнту. Каханне паміж мужчынам і жанчынай, прыняцце жыцця і абавязак выхавання становяцца прывілеяванай сферай, у якой дзеянне Эўхарыстыі можа перамяняць і весці да таго, каб нашае існаванне набыло поўны сэнс221. Пастыры няхай ніколі не занядбоўваюць таго, каб падтрымліваць, выхоўваць і натхняць свецкіх вернікаў ажыццяўляць у поўні сваё пакліканне да святасці ў гэтым свеце, які Бог так палюбіў, што даў Сына свайго, каб свет быў збаўлены праз Яго (пар. Ян 3, 16).

### *Эўхарыстыя і святарская духоўнасць*

80. Эўхарыстычная форма хрысціянскага існавання выяўляецца асаблівым чынам ў святарскім стане. Святарская духоўнасць з’яўляецца па-сутнасці эўхарыстычнай. Зерне такой духоўнасці знаходзіцца ўжо ў словах, якія біскуп прамаўляе падчас літургіі пасвячэння: «Прымі дары святога люду, прынесеныя для ахвяравання Богу. Усведамляй, што будзеш чыніць, наследуй тое, што будзеш здзяйсняць, і жыццё сваё прыпадабняй да таямніцы крыжа Пана»222. Каб надаць свайму існаванню больш поўную эўхарыстычную форму, святар ужо ў перыяд фармацыі і пасля ў наступныя гады павінен стварыць шырокія магчымасці для духоўнага жыцця223. Ён пакліканы быць сапраўдным шукальнікам Бога, застаючыся адначасова побач з людскімі клопатамі. Інтэнсіўнае духоўнае жыццё дазволіць яму больш глыбока ўвайсці ў камунію з Панам і прысвяціць сябе самога Божай любові, становячыся яе сведкам у любых абставінах, нават цяжкіх і змрочных. З гэтай мэтай разам з Айцамі Сіноду заклікаю святароў да «штодзённай цэлебрацыі св. Імшы, нават, калі ў ёй не ўдзельнічаюць вернікі»224. Такі заклік – гэта перш за усё адказ на аб’ектыўна бясконцую каштоўнасць кожнай эўхарыстычнай цэлебрацыі; ён абгрунтаваны яе асаблівай духоўнай

эфектыўнасцю, бо св. Імша, якая цэлебруецца з верай, фарміруе чалавека ў найглыбейшым сэнсе гэтага слова, паколькі спрыяе прыпадабненню да Хрыста і ўмацоўвае святара ў яго пакліканні.

### *Эўхарыстыя і кансэкраванае жыццё*

81. У кантэксце сувязі паміж Эўхарыстыяй і рознымі касцёльнымі пакліканнямі асабліва вылучаецца «прароцкае сведчанне кансэкраваных асобаў, якія знаходзяць ва эўхарыстычнай цэлебрацыі і адарацыі моц для радыкальнага наследавання Хрыста паслухмянага, убогага і чыстага»225. Кансэкраваныя асобы, здзяйсняючы шматлікія выхаваўчыя заданні і апякуючыся патрабуючымі, навучаючы ці служачы хворых, ведаюць, што першаснай мэтай іх жыцця ёсць «сузіранне Божай праўды і пастаяннае з’яднанне з Богам»226. Істотны ўклад, які Касцёл чакае ад кансэкраванага жыцця, значна больш датычыць парадку быцця, чым дзеяння. У гэтым кантэксце хацеў бы звярнуць увагу на важнасць дзявоцтва як сведчання менавіта ў адносінах да таямніцы Эўхарыстыі. Па сутнасці, акрамя сувязі са святарскім цэлібатам, эўхарыстычная таямніца паказвае ўнутраную сувязь з кансэкраваным дзявоцтвам, паколькі гэта з’яўляецца выразам выключнай адданасці Касцёла Хрысту, якога ён прымае як свайго Абранніка з радыкальнай і пладавітай  вернасцю227. У Эўхарыстыі кансэкраванае дзявоцтва знаходзіць натхненне і пажыву для поўнага аддання Хрысту. Больш за тое, з Эўхарыстыі яно чэрпае падтрымку і заахвоту быць таксама ў наш час знакам бескарыслівай і пладавітай любові, якую Бог мае да чалавецтва. Урэшце, праз сваё асаблівае сведчанне кансэкраванае жыццё аб’ектыўна становіцца заклікам і прадказаннем «вяселля Ягняці» (Ап 19, 7. 9), якое ёсць мэтай усёй гісторыі збаўлення. У гэтым сэнсе яно дзейсна скіроўвае да той эсхаталагічнай будучыні, якой патрабуе кожны чалавек, каб мог кіраваць сваімі выбарамі і жыццёвымі рашэннямі.

### *Эўхарыстыя і маральная перамена*

82. Адкрываючы прыгажосць эўхарыстычнай формы хрысціянскага існавання даходзім таксама да разважання над маральнай энергіяй, якая дзейнічае ў ім для падтрымкі сапраўднай свабоды, уласцівай Божым дзецям. Хачу тут узгадаць тэматыку, закранутую падчас Сіноду, адносна сувязі паміж *эўхарыстычнай формай існавання* і *маральнай пераменай*. Папа Ян Павел II сцвердзіў, што маральнае жыццё «мае вартасць “духоўнага культу” (Рым 12, 1; пар. Флп 3, 3), які вынікае і бярэ моц з гэтай невычэрпнай крыніцы святасці і праслаўлення Бога, чым з’яўляюцца сакрамэнты, асабліва Эўхарыстыя. Прымаючы ўдзел у ахвяры крыжа, хрысціянін удзельнічае ў ахвярнай любові Хрыста і атрымлівае здольнасць, а таксама абавязак жыць гэтай любоўю ва ўсіх сваіх жыццёвых

паставах і чынах»228. «У самым “кульце”, у эўхарыстычнай камуніі, змяшчаецца тое, каб быць каханым, а таксама каб кахаць іншых. Эўхарыстыя, якая не пераходзіць у канкрэтныя ўчынкі любові, сама па сабе частковая»229.

Гэты зварот да маральнай каштоўнасці духоўнага культу не павінен інтэрпрэтавацца як маралізатарства. Гэта перш за ўсё радаснае адкрыццё дынамізму любові ў сэрцы таго, хто прымае дар Пана, аддаецца Яму і знаходзіць сапраўдную свабоду. Маральная перамена, заключаная ў новым кульце, устаноўленым Хрыстом, з’яўляецца напружаннем і прагненнем сэрца адказаць на любоў Пана ўсім сваім існаваннем, усведамляючы ўласную крохкасць. Тое, аб чым гаворым, добра адлюстравана ў евангельскім апавяданні пра Закхея (пар. Лк 19, 1-10). Пасля прыняцця Езуса ў сваім доме, мытнік заўважае, што ён цалкам пераменены: вырашае аддаць палову сваёй маёмасці бедным і вярнуць у чатыры разы болей тым, каго абакраў. Маральнае напружанне, якое нараджаецца з прыняцця Езуса ў нашым жыцці, вынікае з удзячнасці за атрыманы незаслужана досвед блізкасці Пана.

### *Эўхарыстычная лучнасць*

83. Важна звярнуць увагу на тое, што Айцы Сіноду назвалі *эўхарыстычнай лучнасцю*, да якой аб’ектыўна паклікана нашае існаванне. Культ, прыемны Богу, па сутнасці ніколі не з’яўляецца дзеяннем выключна прыватным, якое не ўплывае на нашыя грамадскія сувязі: патрабуе грамадскага сведчання нашай веры. Зразумела, гэта датычыць усіх ахрышчаных, але асабліва тых, хто з прычыны грамадскіх і палітычных пазіцый, якія займае, павінен прымаць рашэнні адносна фундаментальных каштоўнасцяў, такіх як пашана і абарона чалавечага жыцця ад зачацця да натуральнай смерці; як сям’я, заснаваная на сужэнстве паміж мужчынам і жанчынай; як свабода ў выхаванні дзяцей і пашырэнне агульнага дабра ва ўсіх яго формах230. Гэтыя каштоўнасці нельга аспрэчыць. Таму каталіцкія палітыкі і заканадаўцы, усведамляючы сваю вялікую грамадскую адказнасць, павінны асабліва слухаць сваё правільна сфарміраванае сумленне, каб прадстаўляць і падтрымліваць законы, натхнёныя каштоўнасцямі, што заснаваны на чалавечай прыродзе231. Гэта ўсё мае аб’ектыўную сувязь з Эўхарыстыяй (пар. 1 Кар 11, 27-29). Біскупы абавязаны няспынна ўзгадваць гэтыя каштоўнасці; гэта ўваходзіць у іх адказнасць за давераную ім паству232.

## Эўхарыстыя, таямніца абвяшчэння

### *Эўхарыстыя і місія*

84. У гамiлii падчас эўхарыстычнай цэлебрацыiі, у якой я даў урачысты пачатак майму служэнню на Катэдры Пятра, я сказаў: «Няма нічога больш прыгожага, чым быць закранутым, уражаным Евангеллем, Хрыстом. Няма нічога больш прыгожага, чым ведаць Яго і дзяліцца з іншымі сяброўства з Ім»233. Гэтае сведчанне набывае большую інтэнсіўнасць, калі думаем аб эўхарыстычнай таямніцы. Не можам затрымаць для сябе любоў, якую цэлебруем у гэтым сакрамэнце. З прычыны сваёй сутнасці яна патрабуе, каб яе перадавалі ўсім. Тое, чаго патрабуе свет – гэта любоў Бога, сустрэча з Хрыстом і вера ў Яго. Таму Эўхарыстыя – гэта не толькі крыніца і вяршыня жыцця Касцёла, але таксама яго місія: «Праўдзіва эўхарыстычны Касцёл – гэта Касцёл місійны»234. Мы таксама павінны быць здольнымі сказаць нашым братам з упэўненасцю: «Тое, што мы бачылі і чулі, абвяшчаем і вам, каб і вы мелі еднасць з намі» (1 Ян 1, 3). Сапраўды, няма нічога прыгажэйшага, чым сустрэча і перадаванне Езуса іншым. Зрэшты, само ўстанаўленне Эўхарыстыі папярэднічае таму, што з'яўляецца сэрцам місіі Езуса: Ён пасланы Айцом для збаўлення свету (пар. Ян 3, 16-17; Рым 8, 32). Падчас Апошняй Вячэры Езус даручае сваім вучням сакрамэнт, які актуалізуе ахвяру, здзейсненую Ім з сябе самога ў паслухмянасці Айцу для збаўлення ўсіх нас. Не можам наблізіцца да эўхарыстычнага стала ў адрыве ад місійнага руху, які бярэ пачатак з самога Сэрца Бога і скіраваны да таго, каб ахапіць усіх людзей. Таму асноўнай часткай эўхарыстычнай формы хрысціянскага існавання з'яўляецца місійны дух.

*Эўхарыстыя і сведчанне*

85. Першая і асноўная місія, якая вынікае са святых таямніц, якія цэлебруем, гэта даванне сведчання нашым жыццём. Захапленне дарам, які Бог учыніў нам у Хрысце, абуджае ў нашым жыцці новы дынамізм і абавязвае нас быць сведкамі Яго любові. Мы становімся сведкамі, калі праз свае дзеянні, словы і спосаб быцця хтосьці Іншы аб'яўляецца і перадаецца. Можна сказаць, што сведчанне – гэта сродак, праз які праўда пра любоў Бога дасягае чалавека ў гісторыі і запрашае яго дабравольна прыняць гэтую радыкальную навіну. У сведчанні, так бы мовіць, Бог рызыкуе сабой, падпарадкоўваючыся свабодзе чалавека. Сам Езус ёсць верным і праўдзівым сведкам (пар. Ап 1,5; 3, 14); прыйшоў, каб даць сведчанне праўдзе (пар. Ян 18, 37). У гэтых разважаннях важна для мяне разгледзець паняцце, якое было дарагім для першых хрысціянаў, а таксама датычыць нас, сучасных вызнаўцаў Хрыста: сведчанне аж да аддання саміх сябе, аж да мучаніцтва, заўсёды лічылася ў гісторыі Касцёла вяршыняй новага духоўнага культу: «Аддайце вашыя целы на ахвяру» (Рым 12, 1). Згадаем, напрыклад, апавяданне пра мучаніцтва св. Палікарпа са Смірны, вучня св. Яна: усё гэтае драматычнае дзеянне апісана як літургія, больш за тое, сам мучанік становіцца Эўхарыстыяй235. Паразважаем таксама аб эўхарыстычнай свядомасці, пра якую, прадбачачы сваё мучаніцтва, гаворыць св. Ігнацый з Антыёхіі. Ён лічыць сябе «Божай пшаніцай» і прагне праз мучаніцтва стаць «чыстым хлебам Хрыста»236. Хрысціянін, які ахвяруе сваё жыццё ў мучаніцтве, уваходзіць у поўную камунію з Пасхай Езуса Хрыста і такім чынам сам становіцца разам з Ім Эўхарыстыяй. Таксама і сёння ў Касцёле дастаткова ёсць мучанікаў, у якіх найвышэйшым чынам выяўляецца любоў Бога.

Нават тады, калі ад нас не патрабуецца мучаніцтва, тым не менш ведаем, што прыемны Богу культ патрабуе гэтай унутранай гатоўнасці237. Ён ажыццяўляецца ў радасным і пераканаўчым сведчанні перад светам праз паслядоўнае хрысціянскае жыццё ў тых асяроддзях, да якіх Пан пасылае нас абвяшчаць Яго.

### *Езус Хрыстус – адзіны Збаўца*

86. Падкрэсліванне ўнутранай сувязі паміж Эўхарыстыяй і місіяй дазваляе нам адкрыць таксама апошні змест нашага абвяшчэння. Чым больш жывой у сэрцах хрысціянаў будзе любоў да Эўхарыстыі, тым больш ясным будзе місійны абавязак: *несці Хрыста*. Маецца на ўвазе не толькі ідэя ці этыка, натхнёная Ім, але дар Яго ўласнай Асобы. Хто не перадае брату праўды пра любоў, той усё яшчэ аддаў сябе недастаткова. Эўхарыстыя як сакрамэнт нашага збаўлення такім чынам непазбежна нагадвае нам аб унікальнасці Хрыста і аб збаўленні, якое Ён здзейсніў коштам сваёй крыві. Таму эўхарыстычная таямніца, у якую вераць і цэлебруюць, патрабуе няспыннага выхавання ўсіх да місійнай працы, цэнтрам якой ёсць абвяшчэнне Езуса, адзінага Збаўцы238. Гэта не дазволіць звесці да выключна сацыялагічнага ключа вырашальную справу чалавечага руху наперад, які заўсёды ўласцівы кожнаму сапраўднаму працэсу евангелізацыі.

### *Свабода культу*

87. У гэтым кантэксце хачу ўзгадаць тое, што было сцверджана Айцамі Сіноду адносна вялікіх цяжкасцяў, з якімі сустракаюцца тыя хрысціянскія супольнасці, якія жывуць ва ўмовах меншасці ці нават пазбаўлены рэлігійнай свабоды239. Мы сапраўды павінны дзякаваць Богу за ўсіх біскупаў і святароў, кансэкраваных асобаў і свецкіх, якія цалкам аддаюцца абвяшчэнню Евангелля і жывуць верай, рызыкуючы сваім жыццём. Нямала ёсць рэгіёнаў у свеце, у якіх само наведванне Касцёла становіцца гераічным сведчаннем, якое звязана ў жыцці верніка з небяспекай маргіналізацыі і насілля. Таксама ў гэтым кантэксце хачу пацвердзіць салідарнасць усяго Касцёла з тымі, хто пакутуе з-за недахопу свабоды культу. Ведаем, што там, дзе не хапае рэлігійнай свабоды, там па сутнасці не хапае больш значнай свабоды, таму што ў веры чалавек выражае ўнутраныя пастановы адносна канчатковага сэнсу ўласнага існавання. Таму молімся, каб пашыралася рэлігійная свабода ва ўсіх дзяржавах, каб хрысціяне, як і члены іншых рэлігій, маглі свабодна жыць згодна сваім перакананням, як асабіста, так і ў супольнасці.

## Эўхарыстыя, таямніца, ахвяраваная свету

### *Эўхарыстыя – ламаны хлеб дзеля жыцця свету*

88. «Хлеб, які Я дам, гэта цела Маё дзеля жыцця свету» (Ян 6, 51). Гэтымі словамі Пан раскрывае праўдзівае значэнне дару з уласнага жыцця для ўсіх людзей. Яны паказваюць таксама ўнутранае спачуванне, якое Хрыстус мае да кожнай асобы. Шмат разоў Евангеллі перадаюць нам пачуцці Езуса адносна людзей, асабліва да церпячых і грэшнікаў (пар. Мц 20, 34; Мк 6,34; Лк 19, 41). Праз глыбокае чалавечае пачуцце Ён выражае збаўчы намер Бога адносна кожнага чалавека, каб той дасягнуў сапраўднага жыцця. Кожная эўхарыстычная цэлебрацыя сакрамэнтальным чынам актуалізуе дар, які Езус учыніў з уласнага жыцця праз смерць на Крыжы для нас і ўсяго свету. У той жа час у Эўхарыстыі Езус робіць нас сведкамі спачування Бога адносна кожнага брата і сястры. Такім чынам вакол эўхарыстычнай таямніцы нараджаецца служэнне любові адносна бліжняга, якое «заключаецца ў тым, што я люблю ў Богу і з Богам іншага чалавека, якога ў дадзены момант, магчыма нават і не ведаю або да якога не адчуваю сімпатыі. Такая любоў можа ажыццявіцца толькі тады, калі яна зыходзіць з інтымнай сустрэчы з Богам, сустрэчы, якая стала еднасцю волі і якая абуджае пачуцці. Менавіта тады я вучуся глядзець на іншую асобу не толькі маімі вачыма і праз мае пачуцці, але таксама з перспектывы Езуса Хрыста»240. Такім чынам я распазнаю ў асобах, якіх сустракаю, братоў і сясцёр, для якіх Пан аддаў сваё жыццё, любячы іх «дарэшты» (Ян 13,1). Як вынік, нашы супольнасці, калі цэлебруюць Эўхарыстыю, павінны ўсё больш разумець, што ахвяра Хрыста, прынесена за ўсіх, і таму Эўхарыстыя пабуджае кожнага веруючага стаць “хлебам ламаным” для іншых і прысвяціць сябе больш справядліваму і братэрскаму свету. Разважаючы пра размнажэнне хлеба і рыбы, мы павінны зразумець, што Хрыстус таксама і сёння працягвае заахвочваць сваіх вучняў асабіста ўзяць на сябе абавязак: «Вы дайце ім есці» (Мц 14,16). Сапраўды, пакліканне кожнага з нас – быць разам з Езусам *хлебам, ламаным для жыцця свету*.

### *Грамадскія вынікі эўхарыстычнай таямніцы*

89. З’яднанне з Хрыстом здзяйсняецца ў сакрамэнце, які рыхтуе нас таксама да ўвядзення навізны ў грамадскія адносіны. «“Містыка” гэтага сакрамэнту мае грамадскі характар», бо «яднанне з Хрыстом з’яўляецца адначасова яднаннем з усімі, каму Ён дае сябе. Я не магу мець Хрыста толькі для сябе самога; я магу прыналежыць да Яго толькі ў еднасці з усімі, хто ўжо стаў або стане Ягоным»241. У сувязі з гэтым неабходна высветліць адносіны паміж эўхарыстычнай таямніцай і грамадскім абавязкам. Эўхарыстыя – гэта сакрамэнт камуніі паміж братамі і сёстрамі, якія згаджаюцца на паяднанне з Хрыстом. Ён з габрэяў і язычнікаў учыніў адзіны народ, разбураючы мур варожасці, што раздзяляў іх (пар. Эф 2, 14). Толькі няспыннае імкненне да паяднання дазваляе годна злучыцца з Целам і Крывёю Хрыста (пар.

Мц 5, 23-24)242. Праз успамін сваёй ахвяры Ён узмацняе камунію паміж братамі і асабліва заахвочвае тых, хто канфліктуе, прыспешыць паяднанне, адкрываючыся на дыялог і на здзяйсненне справядлівасці. Несумненна, умовамі стварэння сапраўднага спакою ёсць аднаўленне справядлівасці, паяднання і прабачэння243. З гэтага нараджаецца імкненне перамяніць таксама несправядлівыя структуры, каб аднавіць пашану да чалавечай годнасці, створанай на вобраз і падабенства Бога. Праз канкрэтнае ажыццяўленне гэтай адказнасці Эўхарыстыя становіцца ў жыцці тым, што азначае ў цэлебрацыі. Як ужо меў магчымасць сцвярджаць, уласцівым абавязкам Касцёла не з’яўляецца ўдзел у палітычным змаганні дзеля стварэння больш справядлівага грамадства; аднак ён не можа і нават не павінен заставацца па-за барацьбой за справядлівасць. Касцёл «павінен удзельнічаць у ёй, маючы разумную аргументацыю, і абуджаць духоўныя сілы, без якіх справядлівасць, якая заўсёды патрабуе вырачэнняў, не можа ўсталявацца і развівацца»244.

У перспектыве грамадскай адказнасці ўсіх хрысціянаў Айцы Сіноду нагадалі, што ахвяра Хрыста ёсць таямніцай вызвалення, якая абуджае нас і няспынна правакуе. Таму звяртаюся з заклікам да ўсіх вернікаў, каб яны сапраўды спрыялі спакою і справядлівасці: «Хто ўдзельнічае ў Эўхарыстыі, абавязаны будаваць спакой у нашым свеце, пазначаным насіллем і шматлікімі войнамі, а сёння асабліва тэрарызмам, эканамічнай карупцыяй і сексуальнай эксплуатацыяй»245. Усе гэтыя праблемы ў сваю чаргу нараджаюць іншыя сумныя з’явы, якія вельмі непакояць. Мы ведаем, што гэтыя сітуацыі не могуць разглядацца павярхоўна. Менавіта ў моцы таямніцы, якую цэлебруем, неабходна выкрываць умовы, якія супярэчаць годнасці чалавека, за якога Хрыстус праліў сваю кроў, пацвярджаючы такім чынам вялікую каштоўнасць кожнага канкрэтнага чалавека.

***Спажытак праўды і беднасць чалавека***

90. Мы не можам заставацца пасіўнымі перад тымі працэсамі «глабалізацыі», якія нярэдка вядуць да празмернага павелічэння на сусветным узроўні розніцы паміж багатымі і беднымі. Мы павінны выкрываць тых, хто растрачвае багацці зямлі, нараджаючы няроўнасць, якая ўсклікае да неба (пар. Як 5, 4). Немагчыма маўчаць перад «ашаламляльнымі вобразамі вялікіх лагераў бежанцаў ці эмігрантаў у розных частках свету, групамі людзей, якія жывуць у часовых умовах, каб пазбегнуць яшчэ горшага лёсу, і якія маюць патрэбу ва ўсім. Ці ж гэтыя людзі не нашы браты і сёстры? Ці ж іх дзеці прыйшлі ў свет не з тым жа самым справядлівым жаданнем шчасця, як і іншыя?»246. Пан Езус, Хлеб вечнага жыцця, заахвочвае і робіць нас уважлівымі да сітуацый нястачы, у якіх знаходзіцца яшчэ вялікая частка чалавецтва. Гэтыя сітуацыі выкліканы страшнай безадказнасцю людзей. «На падставе даступных статыстычных дадзеных можна сцвердзіць, што меншая палова велізарных сум, прызначаных ва ўсім свеце на ўзбраенне, была б больш, чым дастатковай, каб пастаянна пазбаўляць нястачы вялікую колькасць бедных. Гэта выклік чалавечаму сумленню. Грамадствам, якія жывуць за мяжой беднасці – больш з-за сітуацый, залежных ад міжнародных, палітычных, гандлёвых і культурных адносінаў, чым з-за некантраляваных

абставінаў, – нашыя агульныя намаганні на карысць праўды могуць і павінны даць новую надзею»247.

Спажытак праўды заахвочвае нас выкрываць сітуацыі, нявартыя чалавека, у якіх людзі паміраюць з-за недахопу ежы, з прычыны несправядлівасці і эксплуатацыі, і дае нам новую моц і мужнасць вытрывала працаваць над стварэннем цывілізацыі любові. Ад пачатку хрысціяне імкнуліся дзяліцца сваімі дабротамі (пар. Дз 4, 32) і дапамагаць бедным (пар. Рым 15, 26). Міласціна, якая збіраецца падчас літургічных сходаў, з’яўляецца жывым напамінам аб гэтым, актуальнай неабходнасцю. Касцёльныя дабрачынныя ўстановы, асабліва *Caritas,* на розных узроўнях здзяйсняюць каштоўную паслугу дапамогі патрабуючым асобам, у першую чаргу найбольш бедным. Атрымліваючы натхненне з Эўхарыстыі, якая ёсць сакрамэнтам любові, яны становяцца яе канкрэтным выражэннем; таму заслугоўваюць ўсялякага адабрэння і падбадзёрвання за іх салідарную місію у свеце.

***Сацыяльнае вучэнне Касцёла***

91. Таямніца Эўхарыстыі заахвочвае і робіць нас здольнымі адважна ўдзельнічаць у структурах гэтага свету, каб несці туды гэтую навізну адносінаў, якая мае ў дары Бога сваю невычэрпную крыніцу. Малітва, якую паўтараем на кожнай св. Імшы: «Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння», абавязвае нас рабіць усё магчымае, у супрацоўніцтве з міжнароднымі ўстановамі, дзяржаўнымі і прыватнымі, каб спыніць ці прынамсі зменшыць ў свеце ганебны факт голаду і недастатковага харчавання, ад якога пакутуюць шмат мільёнаў асобаў, асабліва ў краінах, якія знаходзяцца на шляху развіцця. Асабліва свецкія хрысціяне, выхаваныя ў школе Эўхарыстыі, маюць непасрэдную палітычную і грамадскую адказнасць. Каб яны маглі адпаведна выконваць свае заданні, неабходна падрыхтаваць іх праз канкрэтнае выхаванне да любові і справядлівасці. Таму, як было прапанавана Сінодам, неабходна, каб у дыяцэзіях і хрысціянскіх супольнасцях знаёмілі з сацыяльным вучэннем Касцёла і пашыралі яго248. У гэтай каштоўнай спадчыне, якая паходзіць з самай старажытнай касцёльнай традыцыі, мы знойдзем элементы, якія з глыбокай мудрасцю кіруюць паводзінамі хрысціянаў у вырашэнні актуальных грамадскіх пытанняў. Гэтае вучэнне, што фарміравалася на працягу ўсёй гісторыі Касцёла, адзначаецца рэалізмам і раўнавагай, дапамагаючы такім чынам пазбягаць зманлівых кампрамісаў ці пустых утопій.

***Асвячэнне свету і абарона стварэння***

92. Каб развіць глыбокую эўхарыстычную духоўнасць, здольную значна паўплываць таксама на грамадства, неабходна, каб хрысціянскі народ, які складае падзяку праз Эўхарыстыю, усведамляў, што робіць гэта ў імя усяго стварэння, імкнучыся такім чынам да асвячэння свету і інтэнсіўна працуючы дзеля гэтага249. Сама Эўхарыстыя праллівае магутнае святло на

чалавечую гісторыю і на ўвесь сусвет. У гэтай сакрамэнтальнай перспектыве дзень за днём мы даведваемся, што кожная касцёльная падзея мае характар знаку, праз які Бог сам нам ўдзяляецца і кліча нас. Такім чынам эўхарыстычная форма існавання можа сапраўды паспрыяць сапраўднай перамене менталітэту ў разуменні гісторыі і свету. Сама літургія вучыць нас гэтаму падчас ахвяравання дароў, калі святар узносіць да Бога малітву благаслаўлення і просьбы адносна  хлеба і віна, «плоду зямлі», «вінаградная лазы» і «працы рук людскіх». Гэтымі словамі, акрамя далучэння да ахвяравання Богу ўсёй дзейнасці і працы чалавека, абрад заахвочвае нас лічыць зямлю стварэннем Бога, якая нараджае для нас тое, што неабходна для нашага існавання. Яна не з’яўляецца нейтральнай рэчаіснасцю, чыста матэрыяльнай, каб выкарыстоўваць яе без разбору паводле чалавечага інстынкту. Яна мае месца ў добрым намеры Бога, паводле якога ўсе мы пакліканы быць сынамі і дачкамі ў адзіным Сыне Бога, Езусе Хрысце (пар. Эф 1, 4-12). Слушная занепакоенасць экалагічнымі ўмовамі, у якіх знаходзіцца створаны свет у многіх частках свету, знаходзіць суцяшэнне ў перспектыве хрысціянскай надзеі, якая абавязвае нас дзейнічаць адказна для абароны стварэння250. У сувязі паміж Эўхарыстыяй і сусветам мы сапраўды адкрываем еднасць Божага намеру і можам убачыць глыбокую сувязь паміж стварэннем і «новым стварэннем», пачатак якому дало ўваскрасенне Хрыста, новага Адама. Паводле моцы хросту мы ўдзельнічаем у ім ужо сёння (пар. Клс 2,12 і наст.). Такім чынам у нашым хрысціянскім жыцці, якое корміцца Эўхарыстыяй, адкрываецца перспектыва новага свету, новага неба і новай зямлі, дзе новы Ерузалем сыходзіць з неба ад Бога, «падрыхтаваны, быццам нявеста, прыбраная для свайго жаніха» (Ап 21, 2).

***Карыснасць «Кампендыя» на тэму Эўхарыстыі***

93. На заканчэнне гэтых разважанняў хачу затрымацца над тым, што ўзнікла ў выніку працы Сіноду, згаджаючыся з просьбай Айцоў Сіноду дапамагчы хрысціянскаму народу верыць, цэлебраваць і ўсё лепш асэнсоўваць эўхарыстычную таямніцу. Пры садзейнічанні кампетэнтных ведамстваў будзе падрыхтаваны «Кампендый», які будзе змяшчаць тэксты з «Катэхізіса Каталіцкага Касцёла», малітвы, тлумачэнні эўхарыстычных малітваў Імшала і ўсё, што можа быць карысным для правільнага разумення, цэлебрацыі і адарацыі сакрамэнту алтара251. Спадзяюся, што гэты дакумент паспрыяе таму, каб успамін Пасхі Пана з кожным днём усё больш станавіўся крыніцай і вяршыняй жыцця і місіі Касцёла і стымуляваў кожнага верніка зрабіць з уласнага жыцця сапраўдны духоўны культ.

## ЗАКАНЧЭННЕ

94. Дарагія браты і сёстры, Эўхарыстыя з’яўляецца вытокам кожнай формы святасці, і кожны

з нас пакліканы да паўнаты жыцця ў Духу Святым. Колькі святых учынілі сапраўдным уласнае жыццё дзякуючы сваёй эўхарыстычнай пабожнасці! Ад св. Ігнацыя з Антыёхіі да св. Аўгустына, ад св. Антонія, абата, да св. Бэнэдыкта, ад св. Францішка Асізскага да св. Тамаша Аквінскага, ад св. Клары з Асізі да св. Кацярыны Сіенскай, ад св. Пасхаля Байлона да св. Пятра Юліана Эймарда, ад св. Альфонса Марыі Лігуоры да благаслаўлёнага Караля дэ Фуко, ад св. Яна Марыі Віянэя да св. Тэрэзы з Лізьё, ад св. Піо з П’етрэльчыны да благаслаўлёнай Тэрэзы з Калькуты, ад благаслаўлёнага Пэрджорджыя Фрасаці да благаслаўлёнага Івана Мерца. Згаданы толькі некаторыя з вялікага мноства, чыя святасць заўсёды знаходзіла свой цэнтр у сакрамэнце Эўхарыстыі.

Таму неабходна, каб у Касцёле ў гэтую найсвяцейшую таямніцу верылі, аддана яе цэлебравалі і інтэнсіўна ўдзельнічалі ў ёй. Дар, які Езус робіць з сябе ў сакрамэнце – успаміне Яго мукі, сведчыць, што вынік нашага жыцця залежыць ад удзелу ў трынітарным жыцці, якое ў Ім даецца нам канчатковым і дзейсным чынам. Цэлебрацыя і адарацыя Эўхарыстыі дазваляе нам наблізіцца да любові Бога і далучыцца да яе асабіста аж да з’яднання з умілаваным Панам. Ахвяраванне жыцця, еднасць з усёй супольнасцю вернікаў і салідарнасць з кожным чалавекам – гэта неад’емныя аспекты «logiké latreía», духоўнага культу, святога і прыемнага Богу (пар. Рым 12, 1), у якім уся наша канкрэтная чалавечая рэчаіснасць пераменена на хвалу Бога. Таму запрашаю пастыраў звярнуць значную ўвагу на пашырэнне аўтэнтычна эўхарыстычнай хрысціянскай духоўнасці. Прэзбітэры, дыяканы і ўсе, хто здзяйсняе эўхарыстычную паслугу, няхай заўсёды здабываюць з гэтых паслуг, выкананых старанна і з пастаяннай падрыхтоўкай, моц і стымул для ўласнага, асабістага і супольнага шляху да асвячэння. Заахвочваю ўсіх свецкіх, асабліва сем’і, няспынна знаходзіць у сакрамэнце любові Хрыста патрэбную энергію для перамены ўласнага жыцця ў сапраўдны знак прысутнасці ўваскрослага Пана. Прашу ўсіх кансэкраваных асобаў, мужчын і жанчын, паказваць уласным эўхарыстычным жыццём ззянне і прыгажосць выключнай прыналежнасці Пану.

95. На пачатку чацвёртага стагоддзя хрысціянскі культ быў яшчэ забаронены імператарскімі ўладамі. Некаторыя хрысціяне з Паўночнай Афрыкі, якія адчувалі сябе абавязанымі цэлебраваць дзень Пана, ішлі супраць гэтай забароны. Былі замучаны ў той час, калі тлумачылі, што яны не могуць жыць без Эўхарыстыі, спажытку Пана: *sine dominico non possumus*252. Гэтыя мучанікі з Абісініі, з’яднаныя са шматлікімі святымі і благаслаўлёнымі, якія ўчынілі Эўхарыстыю цэнтрам свайго жыцця, заступаюцца за нас і вучаць вернасці спатканню з уваскрослым Хрыстом. Мы таксама не можам жыць без удзелу ў сакрамэнце нашага збаўлення, таму жадаем жыць паводле нядзелі – *iuxta dominicam viventes*, хочам пераносіць у жыццё тое, што цэлебруем у дзень Пана. Гэты дзень, з’яўляецца сапраўды днём нашага канчатковага вызвалення. Ці трэба здзіўляцца таму, што мы прагнем кожны дзень жыць паводле навізны, якую Хрыстус ўвёў праз таямніцу Эўхарыстыі?

96. Няхай Найсвяцейшая Марыя, Беззаганная Дзева, каўчэг новага і вечнага запавету,

суправаджае нас на шляху да Пана, які прыходзіць. У Ёй мы знаходзім поўнае здзяйсненне сутнасці Касцёла. Касцёл бачыць у Марыі, «Жанчыне Эўхарыстыі», як назваў Яе Слуга Божы Ян Павел II253, найбольш выразны свой вобраз і сузірае Яе як незаменны ўзор эўхарыстычнага жыцця. Таму ў прысутнасці «*verum Corpus natum de Maria Virgine*» на алтары святар у імя літургічнага сходу сцвярджае словамі канону: «З пашанаю ўспамінаем благаслаўлёную заўсёды Панну Марыю, Маці Бога і Пана нашага Езуса Хрыста»254. Яе святое імя заклікаюць і ўшаноўваюць таксама ў канонах усходніх хрысціянскіх традыцый. Вернікі са свайго боку «даручаюць Марыі, Маці Касцёла, сваё жыццё і сваю працу. Стараючыся мець тыя ж самыя пачуцці, што і Марыя, дапамагаюць усёй супольнасці жыць, як жывая ахвяра, прыемная Айцу»255. Яна – *Tota pulchra*, таму што ў Ёй ззяе бляск хвалы Бога. Прыгажосць нябеснай літургіі, якая павінна адлюстроўвацца таксама ў нашых сходах, мае ў Ёй дакладны адбітак. Ад Яе мы павінны вучыцца, як стаць асобамі Эўхарыстыі і Касцёла, каб мы таксама маглі паводле слоў св. Паўла быць «беззаганнымі» ў прысутнасці Пана, чаго Ён жадаў ад нас ад пачатку (пар. Клс 1,21; Эф 1, 4). (256)

97. Праз заступніцтва благаслаўлёнай Дзевы Марыі Дух Святы распальвае ў нас жар, які палаў у вучнях з Эмаус (пар. Лк 24, 13-35), і аднаўляе ў нашым жыцці эўхарыстычнае захапленне, бляск і прыгажосць якога ззяюць у літургічным абрадзе – дзейсным знаку самой бясконцай прыгажосці святой таямніцы Бога. Вучні падняліся і паспешна вярнуліся ў Ерузалем, каб падзяліцца радасцю з братамі і сёстрамі ў веры. Сапраўдная радасць – гэта распазнанне, што Пан застаецца сярод нас як верны сябра нашага шляху. Эўхарыстыя дазваляе нам адкрыць, што Хрыстус, памерлы і ўваскрослы, аб'яўляецца таксама нам як сучаснік у таямніцы Касцёла, Яго цела. Мы сталі сведкамі гэтай таямніцы любові. Пажадаем адно аднаму ісці з поўнай радасцю і ў захапленні на сустрэчу са святой Эўхарыстыяй, каб дасведчыць і абвяшчаць іншым праўду слоў, якімі Езус развітаўся са сваімі вучнямі: «Я з вамі ва ўсе дні аж да сканчэння веку» (Мц 28, 20).

*Дадзена ў Рыме, у Святога Пятра, 22 лютага 2007г., у свята Катэдры св. апостала Пятра, у другі год Нашага Пантыфікату.*

**BENEDICTUS PP. XVI**

---

**Спасылкі**

1 Пар. S. Thomas Aquinas, *Summa Theologiae*, III, 73, a. 3.

2S. Augustinus, *In Iohannis Evangelium tractatus*, 26,5: *PL*, 35, 1609.

3Benedictus XVI, Allocutio ad plenariam Sessionem Congregationis pro Doctrina fidei (10 Februarii 2006): *AAS* 98 (2006), 255.

4Benedictus XVI, Allocutio ad Participes Consilii Ordinarii Secretariae Generalis Synodi Episcoporum (1 Iunii 2006): *L'Osservatore Romano*, 2 Iunii 2006, p. 5.

5 Пар. *Propositio* 2.

6 Звяртаю увагу на неабходнасць герменэўтыкі працягласці, таксама адносна адпаведнага тлумачэння літургічнай адновы пасля Другога Ватыканскага Сабору: пар. Benedictus XVI, *Sermo ad Romanam Curiam* (22 Decembris 2005): *AAS* 98 (2006), 44-45.

7 Пар. *AAS* 97 (2005), 337-352.

8 Пар.*Anno dell'Eucaristia: suggerimenti e proposte* (15 Octobris 2004): *L'Osservatore Romano,*15 Octobris 2004, supplemento.

9Пар.*AAS*95 (2003), 433-475. Трэба таксама памятацьпра Інструкцыю Кангрэгацыі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамантаў, *Redemptionis Sacramentum* (25 Martii 2004): *AAS*96 (2004), 549-601, якой асабліва жадаў Ян Павел II.

10 Дастаткова толькі нагадаць найважнейшыя сведчанні: Conc. Oecum. Tridentinum, *Doctrina et canones de ss. Missae sacrificio*, *DS*, 1738-1759; LeoXIII, Litt. enc *Mirae caritatis* (28 Maii 1902): *AAS* (1903), 115-136; PiusXII, Litt. enc. *Mediator Dei* (20 Novembris 1947): *AAS* 39 (1947), 521-595; Paulus VI, Litt. enc. *Mysterium fidei* (3 Septembris 1965): *AAS* 57 (1965), 753-774; Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Ecclesia de Eucaristia* (17 Aprilis 2003): *AAS* 95 (2003), 433-475; Congregatio de Cultu Divino et Disciplina Sacramentorum, Instr. *Eucharisticum mysterium* (25 Maii 1967): *AAS* 59 (1967), 539-573; Instr. *Liturgiam authenticam* (28 Martii 2001): *AAS* 93 (2001), 685-726.

11 Пар. *Propositio* 1.

12N. 14: *AAS* 98 (2006), 229.

13*Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1327.

14*Propositio* 16.

15Benedictus XVI, Homilia in Cathedra Romana inauguranda (7 Maii 2005): *AAS* 97 (2005), 752.

16 Пар. *Propositio* 4.

17*De Trinitate,* VIII, 8, 12: *CCL* 50, 287.

18Litt. enc. *Deus caritas est* (25 Decembris 2005), 12: *AAS* 98 (2006), 228.

19 Пар. *Propositio* 3.

20Liturgia Horarum, Hymnus in sollemnitate Ss.mi Corporis et Sanguinis Christi.

21Benedictus XVI, Litt. enc. *Deus caritas est*, (25 Decembris 2005), 13: *AAS* 98 (2006), 228.

22Benedictus XVI,Homilia in planitie loci vulgo Marienfeld (21 Augusti 2005): *AAS* 97 (2005), 891-892.

23 Пар *Propositio* 3.

24 Пар. Missale Romanum, *Prex Eucharistica IV.*

25*Catechesis* XXIII, 7: *PG* 33, 1114-1115.

26 Пар. *Sul Sacerdozio*, VI, 4: *PG* 48, 681.

27*Тамсама*, III, 4: *PG* 48, 642.

28*Propositio* 22.

29 Пар. *Propositio* 42: «Гэтая эўхарыстычная сустрэча здзяйсняецца ў Духу Святым, які нас перамяняе і асвячае. Ён абуджае ў вучню рашучую волю адважна абвяшчаць іншым тое, што пачуў і ўбачыў, каб іх таксама давесці да таго ж самага спаткання з Хрыстом. Такім чынам вучань, пасланы Касцёлам, адкрываецца на бязмежную місію».

30 Пар. Conc. Oecum. Vat. II Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 3;як прыклад, гл. S. Ioannes Chrysostomus, *Catechesis* 3,13-19; *SC* 50, 174-177.

31Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Ecclesia de Eucharistia* (17 Aprilis 2003), 1: *AAS* 95 (2003), 433.

32*Тамсама*, 21: *AAS* 95 (2003), 447.

33 Пар. Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Redemptor hominis* (4 Martii 1979), 20: *AAS* 71 (1979), 309-316; Ep. ap. *Dominicae Cenae* (24 Februarii 1980), 4: *AAS* 72 (1980), 119-121.

34 Пар *Propositio* 5.

35S. Thomae Aquinatis *Summa theologiae*, III, q. 80, art 4.

36N. 38: *AAS* 95 (2003), 458.

37Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 23.

38Congregatio pro Doctrina Fidei, Litterae ad Catholicae Ecclesiae episcopos de aliquibus aspectibus Ecclesiae prout est communio *Communionis notio* (28 Maii 1992), 11: *AAS* 85 (1993), 845.

39*Propositio* 5: «Тэрмін "каталіцкі" выражае паўсюднасць, што вынікае з еднасці, якой спрыяе Эўхарыстыя, цэлебраваная ў кожным Касцёле, і якую яна будуе. Мясцовыя Касцёлы ў паўсюдным Касцёле маюць заданне праз цэлебрацыю Эўхарыстыі рабіць бачнай іх еднасць і разнастайнасць. Гэтая сувязь братэрскай любові дазваляе ззяць трынітарнай камуніі. Саборы і сіноды выражаюць у гісторыі гэты братэрскі аспект Касцёла».

40 Пар. *тамсама*.

41Decr. de Presbyterorum ministerio et vita *Presbyterorum Ordinis*, 5.

42 Пар. *Propositio* 14.

43Const. dogm. de Ecclesia *Lumen Gentium*, 1.

44*De Orat. Dom.,*23: *PL* 4, 553.

45Conc. Oecum. Vat. II Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 48; пар.таксама *тамсама* 9.

46 Пар. *Propositio* 13.

47 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 7.

48 Пар. тамсама, 11; Conc. Oecum. Vat. II Const. dogm. de Ecclesia *Lumen Gentium*, 11; Conc. Oecum. Vat. II, Decr. de activitate missionali Ecclesiae, *Ad gentes*, 9.13.

49 Пар. Ioannes Paulus II, Ep. ap. *Dominicae Cenae* (24 Februarii 1980), 7: *AAS* 72 (1980), 124-127; Conc. Oecum. Vat. II, Decr. de Presbyterorum ministerio et vita *Presbyterorum ordinis*, 5).

50 Пар. *Codex Canonum Ecclesiarum Orientalium,* can 710.

51 Пар. *Ordo initiationis christianae adultorum*, introd. gen. nn 34-36.

52Пар. *Ritus Baptismi puerorum*, intr. nn. 18-19.

53Пар. *Propositio* 15.

54Пар. *Propositio* 7; Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Ecclesia de Eucharistia* (17 Aprilis 2003), 36: *AAS* 95 (2003), 457-458.

55Пар. Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Reconciliatio et Paenitentia* (2 Decembris 1984), 18: *AAS* 77 (1985), 224-228.

56 Пар. *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1385.

57 Тут маецца на ўвазе *Confiteor* або словы святара і сабраных перад набліжэннем да алтара: «*Пане, я не варты, каб Ты ўвайшоў да мяне, але скажы толькі слова, і будзе аздароўлена душа мая*». Мае значэнне таксама тое, што літургія прадугледжвае для святара некаторыя вельмі прыгожыя малітвы, перададзеныя нам традыцыяй, якія нагадваюць аб патрэбе прабачэння, як, напрыклад, малітва, якая ціха чытаецца перад тым, як запрасіць вернікаў да сакрамэнтальнай камуніі: *«Праз гэтае Найсвяцейшае Цела Тваё і Кроў вызвалі мяне ад усіх маіх правінаў і ад усяго злога. Учыні, каб я заўсёды трымаўся запаведзяў Тваіх і не дапусці, каб я адышоў ад Цябе*».

58 Пар. S. Ioannes Damascenus, *De recta fide*, IV, 9: *PG* 94, 1124C; S. Gregorius Nazianzenus, *Sermo* 19, 17: *PG* 36, 356A; Conc. Oecum. Tridentinum, *Doctrina de sacramento paenitentiae*, cap. 2. *DS* 1672.

59 Пар. Conc. Oecum. Vat. II Const. dogm. de Ecclesia *Lumen Gentium*, 11; Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Reconciliatio et Paenitentia* (2 Decembris 1984), 30: *AAS* 77 (1985), 256-257.

60Пар. *Propositio* 7.

61Пар. Ioannes Paulus II, Motu proprio *Misericordia Dei* (7 Aprilis 2002): *AAS* 94 (2002), 452-459.

62 Разам з Айцамі Сіноду нагадваю, што несакрамэнтальныя пакутныя цэлебрацыі, згаданыя ў рытуале сакраманту паяднання, могуць быць карыснымі для абуджэння духу навяртання і камуніі ў хрысціянскіх супольнасцях, рыхтуючы такім чынам сэрцы да цэлебрацыі сакраманту: пар. *Propositio* 7.

63Пар. *Codex Iuris Canonici*, can. 508.

64 Paulus VI, Const. ap. *Indulgentiarum doctrina* (1 Ianuarii 1967), *Normae,* n. 1: *AAS* 59 (1967),

21.

65 *Тамсама,* 9: *AAS* 59 (1967), 18-19.

66Пар. *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1499-1531.

67 *Тамсама*, 1524.

68 Пар. *Propositio* 44.

69Пар. Synodus Episcoporum, II Coetus Generalis, Documentum de sacerdotio ministeriali *Ultimis temporibus* (30 Novembris 1971): *AAS* 63 (1971), 898- 942.

70Пар. Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Pastores dabo vobis* (25 Martii 1992), 42-69: *AAS* 84 (1992), 729-778.

71Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 10; Congregatio pro Doctrina Fidei, Epistula ad Ecclesiae Catholicae episcopos de quibusdam quaestionibus ad Eucharistiae ministrum spectantibus *Sacerdotium ministeriale* (6 Augusti 1983): *AAS* 75 (1983), 1001-1009.

72 *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1548.

73 *Тамсама*, 1552.

74 Пар. *In Iohannis Evangelium Tractatus* 123,5: *PL* 35, 1967.

75 Пар. *Propositio* 11.

76 Пар. Decretum de presbyterorum ministerio et vita *Presbyterorum Ordinis*, 16.

77Пар. Ioannes XXIII, Litt. enc. *Sacerdotii nostri primordia* (1 Augusti 1959): *AAS* 51 (1959), 545-579; Paulus VI, Litt. enc. *Sacerdotalis caelibatus* (24 Iunii 1967): *AAS* 59 (1967), 657-697; Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Pastores dabo vobis* (25 Martii 1992), 29: *AAS* 84 (1992), 703-705; Benedictus XVI, *Allocutio ad Romanam Curiam* (22 Decembris 2006): *L'Osservatore Romano*, 25 Decembris 2006, p. 6.

78 Пар. *Propositio* 11.

79 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Decr. de institutione sacerdotali *Optatam totius*, 6; *Codex Iuris Canonici*, can. 241, § 1 et can. 1029; *Codex Canonum Ecclesiarum Orientalium*, can. 342, § 1 et can. 758; Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Pastores dabo vobis* (25 Martii 1992),

11.34.50: *AAS* 84 (1992), 673-675; 712- 714; 746-748; Congregatio pro Clericis, Direttorio per il ministero e la vita dei presbiteri *Dives Ecclesiae* (31 Martii 1994), 58: LEV, 1994, pp. 56-58; Congregatio de Institutione Catholica, Instructio circa criteria ad vocationes discernendas eorum qui inclinantur ad homosexualitatem, intuitu eorundem admissionis ad Seminarium et ad Ordines Sacros (4 Novembris 2005): *AAS* 97 (2005), 1007- 1013.

80Пар. *Propositio* 12; Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Pastores dabo vobis* (25 Martii 1992), 41: *AAS* 84 (1992), 726-729.

81Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 29.

82 Пар. *Propositio* 38.

83Пар. Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Familiaris consortio* (22 Novembris 1981), 57: *AAS* 74 (1982), 149-150.

84 Ep. ap. *Mulieris dignitatem* (15 Augusti 1988), 26: *AAS* 80 (1988), 1715- 1716.

85*Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1617.

86 Пар. *Propositio* 8.

87 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 11.

88 Пар. *Propositio* 8.

89Пар. Ioannes Paulus II, Ep. ap. *Mulieris dignitatem* (15 Augusti 1988): *AAS* 80 (1988), 1653-1729; Congregatio pro Doctrina Fidei, *Epistula de mutuis relationibus inter viros et mulieres* (31 Maii 2004): *AAS* 96 (2004), 671-687.

90 Пар. *Propositio* 9.

91Пар. *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1640.

92Пар. Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Familiaris consortio* (22 Novembris 1981), 84: *AAS* 74 (1982), 184-186; Congregatio pro Doctrina Fidei, Epistula ad catholicae Ecclesiae episcopos de receptione communionis eucharisticae a fidelibus qui post divortium novas inierunt nuptias *Annus Internationalis Familiae* (14 Septembris 1994): *AAS* 86 (1994), 974-979.

93 Пар. Pontificium Consilium de Legum Textibus, Istruzione sulle norme da osservarsi nei tribunali ecclesiastici nelle cause matrimoniali *Dignitas connubii* (25 Ianuarii 2005), Città del

Vaticano 2005.

94 Пар. *Propositio* 40.

95 Benedictus XVI, Allocutio ad Tribunal Rotae Romanae inaugurationis occasione anni iudicialis habita (28 Ianuarii 2006): *AAS* 98 (2006), 138.

96 Пар. *Propositio* 40.

97 Пар. *тамсама*.

98 Пар. *тамсама.*

99 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 48.

100 Пар. *Propositio*3.

101Хацеў бы згадацьсловы, поўныя надзеіі суцяшэння, якія знаходзім у II эўхарыстычнай малітве: *«Памятай таксама пра братоў і сясцёрнашых, якія паснуліў надзеі на ўваскрашэнне,і пра ўсіх, хто ў Тваёй ласцы адышоў з гэтага свету, і дазволь ім убачыцьсвятло аблічча Твайго*».

102Пар. Benedictus XVI, *Homilia* (8 Decembris 2005): *AAS* 98 (2006), 15-16.

103Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 58.

104*Propositio* 4.

105 *Relatio post disceptationem*, 4: *L'Osservatore Romano*, 14 Octobris 2005, p. 5.

106 Пар. *Sermo* 1,7; 11,10; 22,7; 29,76: *Sermones dominicales ad fidem codicum nunc denuo editi*, Grottaferrata, 1977, pp. 135, 209 s., 292 s., 337; пар. Benedictus XVI, Ad Ecclesiales Motus Novasque Communitates Nuntius (22 Maii 2006): *AAS* 98 (2006), 463.

107Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. past. de Ecclesia in mundo huius temporis *Gaudium et spes*, 22.

108 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 2.4.

109 *Propositio* 33.

110*Sermo* 227, 1: *PL* 38, 1099.

111S. Augustinus, *In Iohannis Evangelium tractatus* 21,8: PL 35, 1568.

112 *Тамсама*, 28,1: *PL*35, 1622.

113 Пар. *Propositio*30. Таксама і св. Імша, якую Касцёл цэлебруе на працягу тыдня і да ўдзелу ў якой запрашаюцца вернікі, знаходзіць сваю адпаведную форму ў дзень Пана, дзень уваскрасення Хрыста; *Propositio* 43.

114 Пар. *Propositio* 2.

115 Пар. *Propositio* 25

116 Пар. *Propositio* 19. *Propositio* 25 удакладняе: «Аўтэнтычнае літургічнае дзеянне выражае сакральнасць эўхарыстычнай таямніцы. Яна павінна выяўляцца ў словах і чынах святара-цэлебранта, калі ён заступаецца перад Богам Айцом як разам з вернікамі, так і за іх».

117*Institutio Generalis Missalis Romani*, 22; пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 41; Congregatio de Cultu Divino et Disciplina Sacramentorum, Instr. *Redemptionis Sacramentum* (25 Martii 2004), 19-25: *AAS* 96 (2004), 555-557.

118 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Decr. de pastorali Episcoporum munere in Ecclesia *Christus Dominus*, 14; Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 41.

119 *Institutio Generalis Missalis Romani*, 22.

120Пар. *тамсама*.

121Пар. *Propositio* 25.

122Пар. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 112-130.

123 Пар. *Propositio* 27.

124 Пар. *тамсама*.

125Што датычыць гэтых аспектаў, неабходнадакладна прытрымліваццапрадпісанняў, змешчаных у Агульных уводзінах да Рымскага Імшала.

126Пар. *Institutio Generalis Missalis Romani*, 39-41; Conc. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 112-118.

127 *Sermo*34,1: *PL* 38, 210.

128Пар. *Propositio* 25: «Як усе мастацкія сродкі, спеў таксама павінен быць унутрана згарманізаваны з літургіяй, павінен плённа адпавядаць яе мэце, інакш кажучы, павінен выражаць веру, малітву, захапленне і любоў да Езуса, прысутнага ў Эўхарыстыі».

129 Пар. *Propositio* 29.

130 Пар. *Propositio* 36.

131 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 116; *Institutio Generalis Missalis Romani*, 41.

132*Institutio Generalis Missalis Romani*, 28; пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 56; Sacra Congregatio Rituum, Instr. *Eucharisticum Mysterium* (25 Maii 1967), 3: *AAS* 57 (1967), 540-543.

133 Пар. *Propositio* 18.

134*Тамсама*.

135*Institutio Generalis Missalis Romani*, 29.

136Пар. Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Fides et Ratio* (14 Septembris 1998), 13: *AAS* 91 (1999), 15-16.

137S. Hieronymus, *Comm. in Isaiam,* Prol.: *PL* 24,17; пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 25.

138Пар. *Propositio* 31.

139 *Institutio Generalis Missalis Romani*, 29; пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 7. 33. 52.

140*Propositio* 19.

141Пар. Oecum. Vat Conc. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 52.

142 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de divina Revelatione *Dei Verbum*, 21.

143З гэтай мэтай Сінод заахвоціў распрацаваць пастырскую дапамогу, заснаваную на трохгадовым цыкле лекцыянарыя, які дапамог бы спалучыць прапаведванне, звязанае з прадугледжанымі чытаннямі, з абвяшчэннем праўд веры: Пар. *Propositio* 19.

144Пар. *Propositio* 20.

145 *Institutio Generalis Missalis Romani*, 78.

146Пар. *тамсама,* 78-79.

147 Пар. *Propositio* 22.

148 *Institutio Generalis Missalis Romani*, 79d.

149*Тамсама*, 79c.

150Беручы пад увагу старажытныя і шанаваныя звычаі і пажаданні, выказаныя Айцамі Сіноду, я папрасіў адпаведныя Ведамствы даследаваць магчымасць змяшчэння знаку супакою ў іншым моманце, напрыклад, перад прыгатаваннем дароў на алтары. Гэты выбар, зрэшты, быў бы значным напамінам перасцярогі Пана аб неабходнасці прымірэння напярэдадні кожнай ахвяры, якая прыносіцца Богу (Пар. Мц5, 23 і наст.): Пар. *Propositio* 23.

151 Пар. Congregatio de Cultu Divino et Disciplina Sacramentorum, Instr. *Redemptionis Sacramentum* (25 Martii 2004), 80-96: *AAS* 96 (2004), 574-577.

152 Пар. *Propositio* 34.

153 Пар. *Propositio* 35.

154 Пар. *Propositio* 24.

155 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 14-20; 30s; 48s; Congregatio de Cultu Divino et Disciplina Sacramentorum, Instr. *Redemptionis Sacramentum* (25 Martii 2004), 36-42: *AAS* 96 (2004), 561-564.

156 N. 48.

157 *Тамсама.*

158 Пар. Congregatio pro Clericis et alia Dicasteria Curiae Romanae, Instr. de cooperatione laicorum in presbyterorum ministerio *Ecclesiae de mysterio* (15 Augusti 1997): *AAS* 89 (1997), 852-877.

159 Пар. *Propositio* 33.

160 *Institutio Generalis Missalis Romani*, 92.

161Пар. *тамсама*, 94.

162 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Decr. de apostolatu laicorum *Apostolicam actuositatem*, 24; *Institutio Generalis Missalis Romani*, 95-111; Congregatio de Cultu Divino et Disciplina Sacramentorum, Instr. *Redemptionis Sacramentum* (25 Martii 2004), 43-47: *AAS* 96 (2004), 564-566; *Propositio* 33: «Гэтыя паслугі павінны быць уведзены паводле спецыфічнага мандату і згодна з рэальнымі патрабаваннямі цэлебруючай супольнасці. Асобы, упаўнаважаныя да гэтых свецкіх літургічных паслуг, павінны выбірацца з развагаю, павінны быць добра падрыхтаванымі і ім павінна спадарожнічаць няспынная фармацыя. Іх прызначэнне павінна быць часовым. Гэтыя асобы павінны быць вядомыя супольнасці, якая павінна выказваць ім сваё ўдзячнае прызнанне».

163 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 37-42.

164Пар. *Institutio Generalis Missalis Romani*, 386-399.

165*AAS*87 (1995), 288-314.

166Adhort. ap. postsynodalis *Ecclesia in Africa* (14 Septembris 1995), 55-71: *AAS* 88 (1996), 34-37; Adhort. ap. postsynodalis *Ecclesia in America* (22 Ianuarii 1999), 16.40.64.70-72: *AAS* 91 (1999), 752-753; 775-776; 799; 805-809; Adhort. ap. postsynodalis *Ecclesia in Asia* (6 Novembris 1999), 21s.: *AAS* 92 (2000), 482- 487; Adhort. ap. postsynodalis *Ecclesia in Oceania* (22 Novembris 2001), 16: *AAS* 94 (2002), 382-384; Adhort. ap. postsynodalis *Ecclesia in Europa* (28 Iunii 2003), 58-60: *AAS* 95 (2203), 685-686.

167 Пар. *Propositio* 26.

168 Пар. *Propositio* 35; Conc. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 11.

169Пар. *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1388; Conc. Oecum. Vat. II, Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 55.

170Пар. Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Ecclesia de Eucharistia* (17 Aprilis 2003), 34: *AAS* 95 (2003), 456.

171Як, напрыклад, S. Thomas Aquinas, *Sum. Theol.*, III, q. LXXX, a. 1,2; S. Teresia a Iesu, *Iter perfectionis*, cap. 35.Doctrina haec confirmata est auctoritate Concilii Tridentini, sess. XIII, c. VIII.

172 Пар. Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Ut unum sint* (25 Maii 1995), 8: *AAS* 87 (1995), 925-926.

173 Пар. *Propositio* 41; Conc. Oecum. Vat. II, Decr. de oecumenismo *Unitatis redintegratio*, 8, 15; Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Ut unum sint* (25 Maii 1995), 46: *AAS* 87 (1995), 948; Litt. enc. *Ecclesia de Eucharistia* (17 Aprilis 2003), 45-46: *AAS* 95 (2003), 463-464; *Codex Iuris Canonici*, can. 844 §§ 3-4; *Codex Canonum Ecclesiarum Orientalium*, can. 671 §§ 3-4; Pontificium Consilium ad Unitatem Christianorum fovendam, *Directoire pour l'application des principes et des Normes sur l'œcuménisme* (25 Martii 1993), 125, 129-131: *AAS* 85 (1993), 1087, 1088-1089.

174 Пар. NN. 1398-1401.

175 Пар. N. 293.

176Пар. Pontificium Consilium de Communicationibus Socialibus, Instr. past. de Communicationibus Socialibus vicesimo exeunte anno a promulgata Instructione Pastorali «Communio et progressio» *Aetatis novae* (22 Februarii 1992): *AAS* 84 (1992), 447-468.

177 Пар. *Propositio* 29.

178 Пар. *Propositio* 44.

179 Пар. *Propositio* 48.

180Гэтае веданне можа быць набыта ў гады фармацыі кандыдатаў у святарства ў семінарыі праз адпаведныя ініцыятывы: Пар. *Propositio* 45.

181 Пар. *Propositio* 37.

182Пар. Const. de sacra liturgia *Sacrosanctum Concilium*, 36 et 54.

183*Propositio*36.

184 Пар. *тамсама*.

185 Пар. *Propositio* 32.

186 Пар. *Propositio* 14.

187*Propositio* 19.

188 Пар. *Propositio* 14.

189 Пар. Benedictus XVI, *Homilia* ad I Vesperas sollemnitatis Pentecostes (3 Iunii 2006): *AAS* 98 (2006), 509.

190Пар. *Propositio* 34.

191*Enarrationes in Psalmos* 98,9 *CCL* XXXIX 1385; пар. Benedictus XVI, *Allocutio ad Romanam Curiam* (22 Decembris 2005): *AAS* 98 (2006), 44-45.

192 Пар. *Propositio*6.

193 Benedictus XVI, *Allocutio ad Romanam Curiam* (22 Decembris 2005): *AAS* 98 (2006), 45.

194Пар. *Propositio* 6; Congregatio de Cultu Divino et Disciplina Sacramentorum, *Direttorio su pietà popolare e liturgia* (17 Decembris 2001), nn. 164-165, Città del Vaticano 2002, pp. 137-139; Sacra Congregatio Rituum, Instr. *Eucharisticum Mysterium* (25 Maii 1967): *AAS* 57 (1967), 539-573.

195 Пар. *Relatio post disceptationem*, 11: *L'Osservatore Romano*, 14 Octobris 2005, p. 5.

196 Пар. *Propositio* 28.

197 Пар. n. 314.

198VII, 10, 16: *PL*32, 742.

199 Benedictus XVI, Homilia in planitie loci vulgo Marienfeld (21 Augusti 2005): *AAS* 97 (2005), 892; пар. *Homilia in Vigilia Pentecostes* (3 Iunii 2006): *AAS* 98 (2006), 505.

200 Пар. *Relatio post disceptationem*, 6, 47; *L'Osservatore Romano*, 14 Octobris 2005, pp. 5-6; *Propositio* 43.

201 *De civitate Dei,* X, 6: *PL* 41, 284.

202Пар. *Catechismus Catholicae Ecclesiae*, 1368.

203Пар. S. Irenaeus, *Adversus haereses* IV,20,7: *PG* 7,1037.

204*Ep. ad Magnesios*, 9,1: *PG* 5,670.

205 Пар. *I Apologia* 67, 1-6; 66: *PG* 6, 430 s. 427. 430.

206Пар. *Propositio* 30.

207Пар. *AAS* 90 (1998), 713-766.

208 *Propositio* 30.

209 *Homilia* (19 Martii 2006): *AAS* 98 (2006), 324.

210Слушна ў сувязі з гэтым заўважае «Кампендый сацыяльнага вучэння Касцёла», 258: «Чалавеку, якізвязанынеабходнасцюпрацаваць, адпачынакадкрываеперспектывубольшпоўнайсвабоды – гэтасвабодавечнагаШабату (пар. Гбр 4, 9-10). АдпачынакдазваляелюдзямузгадвацьінановаперажыюацьсправыБожыя, адСтварэннядаАдкуплення, атаксамапрызнавацьсябеЯгостварэннем (пар. Эф 2, 10) івыказвацьудзячнасцьзаасабістаежыццёізатое, штонеабходнадляягопадтрымання, таму, хтоз'яўляеццаягоаўтарам».

211 Пар. *Propositio* 10.

212 Пар. *тамсама.*

213 Пар. BenedictusXVI, *Allocutio ad Episcopos Conferentiae Episcopalis Canadiensis – Quebecensis venientes ad limina Apostolorum* (11 Maii 2006): *L'OsservatoreRomano*, 12 Maii 2006, p. 5.

214N. 10: *AAS* 71 (1979), 414-415.

215 Benedictus XVI, Audientia Generalis 29 Martii 2006: *L'Osservatore Romano*, 30 Martii 2006, p. 4.

216 *Propositio* 39.

217 Пар. *Relatio post disceptationem*, 30: *L'Osservatore Romano*, 14 Octobris 2005, p. 6.

218 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 39-42.

219Пар. Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Christifideles laici* (30 Decembris 1988), 14. 16: *AAS* 81 (1989), 409-413; 416-418.

220Пар. *Propositio* 39.

221 Пар. *тамсама*.

222*PontificaleRomanum. De ordinatione Episcopi, Presbyterorum et Diaconorum*, Ritus ordinationis presbyteri, n. 150.

223 Пар. Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Pastores dabo vobis* (25 Martii 1992), 19-

33; 70-81: *AAS* 84 (1992), 686-712; 778-800.

224*Propositio* 38

225*Propositio*39; пар. Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Vita consecrata* (25 Martii 1996), 95: *AAS*88 (1996), 470-471.

226*Codex Iuris Canonici*, can. 663, § 1.

227 Пар. Ioannes Paulus II, Adhort. ap. postsynodalis *Vita consecrata* (25 Martii 1996), 34: *AAS* 88 (1996), 407-408.

228Litt. enc. *Veritatis splendor* (6 Augusti 1993), 107: *AAS* 85 (1993), 1216- 1217.

229Benedictus XVI, Litt. enc. *Deus caritas est* (25 Decembris 2005), 14: *AAS* 98 (2006), 229.

230Пар. Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Evangelium vitae* (25 Martii 1995), 107: *AAS* 87 (1995), 401-522; Benedictus XVI, *Allocutio ad Pontificiam Academiam pro vita* (27 Februarii 2006): *AAS* 98 (2006), 264-265.

231Пар. Congregatio pro Doctrina Fidei, Nota doctrinalis de christifidelium rationibus in publicis negotiis gerendis (24 Novembris 2002): *AAS* 96 (2004), 359- 370.

232 Пар. *Propositio* 46.

233 *AAS* 97 (2005), 711.

234 *Propositio* 42.

235 Пар. *De martyrio sancti Polycarpi*, XV,1: *PG* 5, 1039. 1042.

236 S. Ignatius antiochenus, *Epistula ad Romanos*, IV,1: *PG* 5, 690.

237 Пар. Conc. Oecum. Vat. II, Const. dogm. de Ecclesia *Lumen gentium*, 42.

238 Пар. *Propositio* 42; Congregatio pro Doctrina Fidei, Decl. de Iesu Christi atque Ecclesiae unicitate et universalitate salvifica *Dominus Iesus* (6 Augusti 2000), 13-15: *AAS* 92 (2000), 754-755.

239 Пар. *Propositio* 42

240 Benedictus XVI, Litt. enc. *Deus caritas est* (25 Decembris 2005), 18: *AAS* 98 (2006), 232.

241*Тамсама*, n. 14.

242Не без хвалявання падчас сінадальнага сходу выслухалі даволі значнае сведчанне аб эфектыўнасці сакрамэнту ў справе будавання спакою. У сувязі з гэтым *Propositio* 49 сцвярджае: «Дзякуючы эўхарыстычным цэлебрацыям канфліктуючыя народы змаглі сабрацца вакол Божага слова, пачуць прароцкае абвяшчэнне паяднання праз дармовае прабачэнне, прыняць ласку навяртання, якое дазваляе камунію таго ж самага хлеба і таго ж самага келіха».

243 Пар. *Propositio* 48.

244 Benedictus XVI, Litt. enc. *Deus caritas est* (25 Decembris 2005), 28: *AAS* 98 (2006), 239.

245 *Propositio* 48.

246 Benedictus XVI, *Allocutio ad Coetum Legatorum apud Apostolicam Sedem* (9 Ianuarii 2006): *AAS* 98 (2006), 127.

247 *Тамсама*.

248 Пар. *Propositio* 48. Найбольш карысным у гэтымз'яўляецца*Кампендый Сацыяльнага Вучэння Касцёла.*

249 Пар. *Propositio* 43.

250 Пар. *Propositio* 47.

251 Пар. *Propositio* 17.

252 *Martyrium Saturnini, Dativi et aliorum plurimorum,* 7,9,10: *PL* 8, 707.709-710.

253 Пар. Ioannes Paulus II, Litt. enc. *Ecclesia de Eucharistia* (17 Aprilis 2003), 53: *AAS* 95 (2003), 469.

254*I эўхарыстычная малітва*(*Рымскі канон*).

255 *Propositio* 50.

256Пар. Benedictus XVI, Homilia (8 Decembris 2005): *AAS* 98 (2006), 15.

Copyright © Dicastero per la Comunicazione - Libreria Editrice Vaticana